WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

1 СНЕЖНЯ 2011 г.
ЧАЦВЕР
№ 229
(27093)

Кошт 800 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

## У БЕЛАРУСІ НЕАБХОДНА ВЫБУДАВАЦЬ СІСТЭМУ ПРАВЕРКІ ВЫКАНАННЯ ДАРУЧЭННЯЎ ПА ЗВАРОТАХ ГРАМАДЗЯН

**У Беларусі павінна быць выбудавана дакладная сістэма праверкі выканання даручэнняў па зваротах грамадзян. Аб гэтым заявіў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Уладзімір Макей, які ўзначальвае міжведамасную рабочую групу па маніторынгу работы дзяржорганаў са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб па г. Мінску. Учора ён правёў прыём грамадзян у ААТ «Мінскі гадзіннікавы завод», перадае БЕЛТА.**

«Неабходна кожнае пытанне трымаць на кантролі, правяраць, наколькі якасна выканана рашэнне па зваротах грамадзян. Пэўныя прабелы ў гэтым ёсць», — падкрэсліў Уладзімір Макей.

На прыём па асабістых пытаннях запісаліся 7 чалавек. Прычым некаторыя заяўнікі прадстаўлялі інтарэсы цэлай групы людзей. Напрыклад, ад імя 88 членаў ЖБВК «Гадзіншчык» (усяго ў кааператыў уключана 128 сем'яў) да кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта звярнулася работніца ААТ «Мінскі гадзіннікавы завод» наконт заключэння дагавора на будаўніцтва дома, льготнага крэдытавання членаў ЖБВК, вынасу цепласетак з тэрыторыі будаўнічай пляцоўкі будучага дома.

Заяўніца атрымала адказ, што пытанне паскарэння будаўніцтва ўжо вырашана — яно пачнецца ў першым квартале 2012 года. Што датычыцца льготнага жыллёвага крэдытавання, то, паводле слоў Уладзіміра Макея, пазіцыя Адміністрацыі Прэзідэнта (тут на ўзгадненні знаходзіцца праект адпаведнага ўказа) заключаецца ў тым, каб «па сфарміраваных ЖБВК умовы засталіся ранейшымі, у адпаведнасці з заключанымі дагаворамі». Што датычыцца магчымасці бюджэтных затрат на інфраструктуру, то ёсць нормы заканадаўства і іх трэба прытрымлівацца. «Дзяржава не можа ўзяць на сябе ўсе затраты па вынасе інфраструктуры, тут трэба знаходзіць узаемапрымальныя рашэнні», — сказаў Уладзімір Макей.

Было разгледжана і праблемнае пытанне жыхароў вёскі Аколіца аб перспектывах водазабеспячэння жылых дамоў: з-за ўводу новых аб'ектаў рэспубліканскага цэнтра алімпійскай падрыхтоўкі «Раўбічы» яны апасаюцца, што будзе адключана падача вады. Уладзімір Макей распарадзіўся запытаць усю інфармацыю з Мінскага райвыканкама па гэтым пытанні: «Няхай дакладна паведамяць аб тым, што плануецца рабіць і якім чынам». Па-другое, мясцовым чыноўнікам неабходна неадкладна правесці сустрэчу з людзьмі і растлумачыць ім перспектывы. Па-трэцяе, калі сапраўды будуць адключаць водазабеспячэнне, то неабходна ўнесці канкрэтнае рашэнне абазначанай жыхарамі праблемы. «А ацэнку адпаведных дзеянняў або бяздзейнасці мы дадзім у адміністрацыі», — падкрэсліў Уладзімір Макей.

Астатнія пытанні, з якімі звярнуліся грамадзяне на прыём, датычыліся павелічэння заработнай платы, транспартных зносін, будаўніцтва жылых дамоў для ваеннаслужачых і г.д.

СТАР. 2

## АПЛАТА ЗА САЦЫЯЛЬНАЕ АБСЛУГОЎВАННЕ НА ДАМУ НЕ ЗМЕНІЦЦА

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**ПРАДСТАЎНІКІ МІНПРАЦЫ І САЦЫЯЛЬНАЙ АБАРОНЫ АДКАЗАЛІ НА ЗЛАБАДЗЁННЫЯ ПЫТАННІ АБ САЦЫЯЛЬНЫМ АБСЛУГОЎВАННІ ПАЖЫЛЫХ ЛЮДЗЕЙ**

**Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь і БелТА правялі online-канферэнцыю на тэму: «Укараненне новых тэхналогій у сацыяльнае абслугоўванне» ў рамках сумеснага інтэрактыўнага праекта «Online-марафон: Праца і сацыяльная абарона».**

На пытанні наведвальнікаў сайта адказалі **Аляксандр РУМАК,** намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь; **Марыя ГАРБАЦЭВІЧ,** начальнік упраўлення сацыянарных устаноў сацыяльнага абслугоўвання і капітальнага будаўніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь, **Анатоль РАЖАНЕЦ,** начальнік упраўлення дзяржаўнай сацыяльнай падтрымкі насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь.

***Жаркова В.Ч., г. Гродна:*** ***У Мінску, як я чула, даволі паспяхова і не адзін год працуе служба сацыяльнага таксі. А калі гэтая служба пачне разгортвацца ў іншых рэгіёнах краіны?***

**Анатоль РАЖАНЕЦ:** Сапраўды, у сталіцы арганізавана прадастаўленне транспартных паслуг інвалідам 1 групы і інвалідам-калясачнікам аўтамабілямі «Сацыяльная служба». На сесіі Мінгарсавета дэпутатамі прынята рашэнне аказання гэтай паслугі бясплатна. Прычым такое рашэнне адносіцца да кампетэнцыі мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў. Адначасова адзначаем, што адмысловымі легкавымі аўтамабілямі тэрытарыяльных цэнтраў сацыяльнага абслугоўвання таксама прадастаўляюцца транспартныя паслугі непрацаздольным грамадзянам па сацыяльна даступных цэнах.

***Паўлавіч З.Т., Віцебская вобласць:*** ***Колькі чалавек абслугоўваецца аддзяленнямі сацыяльнай дапамогі на даму на платнай аснове? Ці будзе змяняцца парадак аплаты за гэты від паслуг? Які прагноз па сацтарыфах на наступны год?***

**Анатоль РАЖАНЕЦ:** Па выніках дзевяці месяцаў г.г. аддзяленнямі сацыяльнай дапамогі на даму цэнтраў абслугоўвалася больш за 87,5 тыс. непрацаздольных грамадзян (у Віцебскай вобласці — больш за 13 тыс. чал.). З іх на ўмовах поўнай аплаты абслугоўвалася 8,8% ад агульнай колькасці грамадзян, а на ўмовах частковай (50%) аплаты абслугоўвалася 85,6% ад агульнай колькасці грамадзян. Змяненне парадку аплаты за сацыяльнае абслугоўванне на даму не плануецца. Што тычыцца кошту сацыяльных паслуг, якая ўсталёўваецца аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам, то ён, у асноўным, не змяняўся з 2010 года і складае ў сярэднім па краіне 25 тыс. руб.

СТАР. 2

### «Прамая лінія»

**ІНДЫВІДУАЛЬНАЕ БУДАЎНІЦТВА БУДЗЕ ВЕСЦІСЯ ПА НОВЫХ УМОВАХ**

**Па якім дакладным алгарытме пасля новага года трэба будзе ажыццяўляць кансервацыю незавершанага індывідуальнага будаўніцтва? За які час прыватныя забудоўшчыкі павінны пабудаваць сваё жыллё і ці магчыма павялічыць тэрмін будаўніцтва індывідуальных дамоў? Што новага прадугледжвае заканадаўства пры выдзяленні і адбіранні зямельных участкаў з першых дзён 2012 года?**

**6 снежня,** у аўторак, **з 11.00 да 12.00** у рэдакцыі нашай газеты адбудзецца «прамая лінія» з удзелам **намесніка старшыні Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Беларусі Андрэя Анатольевіча ГАЕВА.**

**Нумары «прамой лініі»: 8(0172) 292 38 92; 8(017) 292 38 21.** Папярэднія пытанні можна задаваць па нумары: 8(017) 287 17 51 з 10.00 да 15.00, або дасылаць на электронны адрас zvyazda@tyt.by.

## РАССЛЕДАВАННЕМ КРУШЭННЯ МІ-24 ПАД ПРУЖАНАМІ ЗАЙМАЕЦЦА КАМІСІЯ МІНАБАРОНЫ

**Расследаваннем крушэння верталёта Мі-24 пад Пружанамі займаецца спецыяльна створаная камісія Мінабароны. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе Міністэрства абароны Беларусі.**

У выніку крушэння верталёта загінулі тры члены экіпажа: камандзір — маёр Кахно Алег Уладзіміравіч, штурман — капітан Глушчанка Дзяніс Алегавіч, бартавы тэхнік — капітан Бабко Валерый Мікалаевіч. Крушэнне верталёта Мі-24 ВПС і войскаў ППА Беларусі здарылася 29 лістапада ў 19.45, пры заходзе на пасадку ў раёне аэрадрома Пружаны. Увесь экіпаж у складзе трох чалавек загінуў.

## «...ТРЭБА ГЛЯДЗЕЦЬ, ШТО МЫ НЕ ТАК РОБІМ, ЧАМУ ПАДАЮЦЬ ВЕРТАЛЁТЫ...»

**Такую думку выказаў учора генерал-палкоўнік Леанід Мальцаў, дзяржаўны сакратар Савета Бяспекі Рэспублікі Беларусь, падчас міжведамаснай навукова-практычнай канферэнцыі органаў сістэмы забеспячэння бяспекі Рэспублікі Беларусь.**

Напярэдадні канферэнцыі, 29 лістапада ў 19.45, пад Пружанамі пры заходзе на пасадку адбылося крушэнне верталёта Мі-24 Ваенна-паветраных сіл і войскаў ППА Беларусі. Экіпаж у складзе трох чалавек загінуў. Генерал-маёр Ігар Рачкоўскі, старшыня Дзяржаўнага камітэта Рэспублікі Беларусь, пачаў пасяджэнне з «хвіліны маўчання», сказаўшы, што гэта падзея «з'яўляецца для нас вялікай трагедыяй».

Леанід Мальцаў, падчас свайго дакладу «Ідэалагічны аспект Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь», засяродзіў увагу на важнасці эфектыўнай ідэалагічнай працы ва ўсіх сферах. «Мы не можам быць у застылым стане. На жаль, мы павінны канстатаваць, што, кажучы аб ідэалагічнай працы, часта апускаемся да фармалізму, — заявіў генерал-палкоўнік. — А павінны быць інавацыйныя падыходы. Трэба ісці не толькі ў нагу з часам, але і хоць трошкі апярэджваць яго. Не проста працаваць, а глядзець і аналізаваць, што мы не так робім. Вось з чаго мы пачалі канферэнцыю? Чаму падаюць у нас верталёты? Можа, дысцыпліна ў нас не на адпаведным узроўні?» Дзяржаўны сакратар Савета Бяспекі лічыць, што трэба выпрацаваць сучасныя падыходы. Ён упэўнены, што ў кожнага ведамства напрацоўкі ёсць: «Трэба, каб адзін з адным падзяліліся».

**Уладзіслаў СОЎПЕЛЬ.**

### Парламенцкі дзённік

## УЗВЫШАНАЕ І ЗЯМНОЕ

### На занепакоенасць заканадаўцаў урад адказаў аптымізмам

**У ЧАРАШНІ дзень пытанняў і адказаў, які традыцыйна адводзіцца раз на месяц падчас сесіі, прайшоў пад знакам занепакоенасці парламентарыяў пасля сустрэч з выбаршчыкамі і аптымізму ўрада. Што ж, паспрабуем ім прасякнуцца.**

**Намеснік прэм'ер-міністра Сяргей РУМАС**, хоць і прызнаў, што год быў няпростым для нашай эканомікі, запэўніў — «ураду ўдалося пераламіць сітуацыю па шэрагу прынцыповых пытанняў і забяспечыць паступальны рух у кірунку зоны росту». Сёлета за 10 месяцаў ВУП прырос на 7 адсоткаў у параўнанні з аналагічным леташнім паказчыкам. Па словах С. Румаса, фінансавы стан прадпрыемстваў устойлівы: «Дынаміка характарызуецца ростамі прыбытку і рэнтабельнасці». Па выніках года чакаецца прыток прамых замежных інвестыцый у краіну да 4 млрд доларaў. З улікам 2,5 млрд ад продажу 50-працэнтнага пакета акцый «Белтрансгаза», удакладняе намеснік кіраўніка ўрада. Дзяржава, натуральна, зацікаўлена ва ўліваннях звонку, таму такія захады плануецца заахвочваць і надалей. Распрацавана нават спецыяльная стратэгія да 2015 года, ключавымі момантамі якой стануць рэформа сістэмы набыцця зямлі і нерухомасці, удасканаленне падатковай сістэмы і неадкладныя захады па развіцці фінансавага рынку. А пакуль налета запланавана прыцягненне прамых замежных інвестыцый на чыстай аснове ў аб'ёме, не меншым за 3,7 млрд доларaў.

С.Румас з жалем канстатаваў, што 2011-ы запомніцца нам ажыятажным попытам на некаторыя тавары, што выклікала неабходнасць ручнога кіравання з боку ўрада. Але сёння, супакойвае намеснік прэм'-ера, у рознічным гандлі прадстаўлены дастатковы асартымент, і што не менш важна, забяспечваецца ўсё гэта пераважна за кошт прадукцыі айчыннай вытворчасці.

— Да канца года захаваецца дасягнутая актыўнасць на спажывецкім рынку і насельніцтва будзе забяспечана ў дастатковым аб'ёме спажывецкімі таварамі па даступных коштах, — гарантуе віцэ-прэм'ер.

Да таго ж пералік сацыяльна значных тавараў (цэны на якія, нагадаем, рэгулююцца дзяржавай) будзе пашыраны на 11 таварных груп.

Падставы для аптымізму дае кіраўніцтву ўрада і аналіз звестак па інфляцыі, які, паводле слоў С.Румаса, сведчыць пра яе замаруджванне.

— Урад сумесна з Нацбанкам спыніў рост манетарнай інфляцыі, абумоўленай змяненнем курсу замежных валют да беларускага рубля, — канстатуе намеснік кіраўніка ўрада. — Беларускі рубель стабілізаваўся, а ў апошні тыдзень нават адбываецца яго ўмацаванне да асноўных замежных валют. Такім чынам, курсавы ўплыў на інфляцыю сёння практычна роўны нулю.

СТАР. 2

**СТАЛІЦА ПАШЫРАЕЦЦА**

**Мінгарсавет прыняў рашэнне аб пашырэнні межаў сталіцы на 4 тыс.га. Адпаведнае рашэнне адобрана ўчора на сесіі Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў, перадае БЕЛТА.**

У межы горада плануецца ўключыць зямельны масіў Зялёны бор у раёне вёскі Калодзішчы Мінскага раёна і былы ваенны палігон. Плошча зямельнага ўчастка, што далучаецца да сталіцы, складае 4 тыс. га. На ім размешчана 50 землекарыстальнікаў і арандатараў. У будучым на гэтай тэрыторыі плануецца актыўнае будаўніцтва шматпавярховых і сядзібных жылых дамоў.

Гучная справа

## Вярхоўны Суд прыгаварыў Канавалава і Кавалёва да расстрэлу

**Учора суд прыгаварыў абодвух абвінавачаных у тэракце ў мінскім метро і шэрагу іншых выбухаў у Віцебску і Мінску да смяротнага пакарання. Паводле слоў суддзі Аляксандра Федарцова, які і зачытаў прысуд (поўны тэкст дакумента складае 114 (!) старонак), «Дзмітрый Канавалаў і Уладзіслаў Кавалёў уяўляюць выключную небяспеку для грамадства, таму ў адносінах да іх неабходна прымяніць выключную меру пакарання».**

Так, Дзмітрый Канавалаў прызнаны вінаватым у больш чым 30 эпізодах, сярод якіх найбольш гучныя — два выбухі ў цэнтры Віцебска 2005 года, тэракт 2008 года на Дзень Незалежнасці ў Мінску і сёлетні выбух на станцыі метро «Кастрычніцкая», які забраў жыцці 15 чалавек.

Пры прызначэнні пакарання Канавалаву суд улічыў, што злачынныя дзеянні маладога чалавека насілі неаднаразовы, сістэматычны і цынічны характар. А выбуховыя прыстасаванні, якія выкарыстоўваліся, станавіліся з гадамі ўсё больш небяспечнымі. Пры гэтым Аляксандр Федарцоў падкрэсліў, што Канавалаў імкнуўся да як мага большай колькасці пацярпелых і загінулых.

Яго сябар Уладзіслаў Кавалёў прызнаны вінаватым ва ўдзеле ў некаторых ранніх віцебскіх хуліганскіх эпізодах і незаконных дзеяннях з выбухоўкай, а таксама ў неданясенні аб цяжкіх злачынствах Канавалава і саўдзеле ў форме пасобніцтва ў здзяйсненні тэрарызму. Пры вынясенні прысуду Уладзіславу Кавалёву таксама ўлічваўся доўгі перыяд часу, на працягу якога здзяйсняліся злачынствы. Уладзіслаў добра ведаў аб захапленні Канавалава выбухамі і аб іх здзяйсненні і перадаваў яму тратыл — тым самым садзейнічаў вырабу Канавалавым больш магутных устройстваў. Акрамя таго, Кавалёў спрабаваў аказаць садзейнічанне Канавалаву ва ўхіленні ад дактыласкапіі, чым стварaў перадумовы для працягу яго злачыннай дзейнасці. Аляксандр Федарцоў дадаў, што пры здзяйсненні злачынстваў у 2011 годзе пасобніцтва Кавалёва ў ажыццяўленні тэракту насіла мэтанакіраваны характар.

Алкагольнае ап'яненне Канавалава і Кавалёва 11 красавіка суд прызнаў абцяжарваючымі абставінамі. Разам з тым, пастанавіў спагнаць з Канавалава і Кавалёва немалыя сумы грошай на карысць пацярпелых, медыцынскіх устаноў, метрапалітэна.

Гэты прысуд канчатковы і не можа быць абскарджаны ў касацыйным парадку. Асуджаныя да смяротнага пакарання маюць права звярнуцца да Прэзідэнта Беларусі з просьбай аб памілаванні.

**Надзея ПАЎЛАВА.**

## ГЛАБАЛЬНАЕ ПАЦЯПЛЕННЕ ПРАЦЯГВАЕЦЦА?

### 2011 год можа стаць адным з самых цёплых за ўсю гісторыю метэаназіранняў

**ТАКУЮ папярэднюю інфармацыю па тэмпературных выніках года распаўсюдзілі дакладчыкі Сусветнай метэаралагічнай арганізацыі (СМА).**

Спецыялісты падлічылі, што па стане за 10 месяцаў сярэдняя тэмпература сёлета была на 0,41 градуса вышэй, чым сярэднекліматычная норма ў перыяд з 1961 да 1990 года. Разам з тым, апошняе дзесяцігоддзе было самым спякотным увогуле за ўсю гісторыю метэаназіранняў з тэмпературай на 0,46 градуса вышэй за кліматычную норму.

Разглядаючы сітуацыю выключна з тэмпературай паветра ў ніжніх слаях атмасферы, Сусветная метэаралагічная арганізацыя інфармуе, што найбольшая розніца адносна сярэднегадавых паказчыкаў зафіксавана на поўначы Расіі, дзе тэмпературны фон быў ажно на 4 градусы вышэй за норму.

***Якія тэмпературныя тэндэнцыі назіраліся сёлета на тэрыторыі нашай краіны?*** **Спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА** адзначыла, што сёння яшчэ зарана дакладна ацэньваць сярэднегадавую тэмпературу ў Беларусі, аднак... У аддзеле клімату нам паведамілі, што сярэднясутачная тэмпература ў лістападзе склала плюс 2,3 градуса пры норме плюс 0,7 градуса. Айчынныя аналітыкі падлічылі, што, калі сярэдняя тэмпература паветра ў снежні будзе не ніжэй чым мінус 3,3 градуса (менавіта такі тэмпературны фон назіраўся ў апошні месяц года ў мінулыя гады), тады 2011 год трапіць па цеплыні ў дзясятку самых спякотных гадоў за ўвесь час метэаназіранняў. Беларускія эксперты вызначылі, што ў гэтым выпадку сярэднегадавая тэмпература на тэрыторыі нашай краіны стане плюс 7,1 градуса, пры кліматычнай норме плюс 5,8 градуса.

Акрамя тэмпературных тэндэнцый, у дакладзе СМА гаворыцца, што сёлета плошча арктычнага марскога лёду склала 4,33 млн. кв. кіламетраў, што ажно на 35 працэнтаў ніжэй за сярэднія паказчыкі з 1979 па 2000 гады.

Генеральны сакратар Сусветнай метэаралагічнай арганізацыі Мішэль Жаро ўпэўнены, што гэтая інфармацыя гаворыць аб тым, што наша планета працягвае награвацца і павялічэнне тэмпературы паветра звязана з дзейнасцю чалавека. Навукоўцы фіксуюць новыя рэкорды канцэнтрацыі парніковых газаў у атмасферы. Гэтая канцэнтрацыя $CO_2$ даволі хутка набліжаецца да ўзроўню, які адпавядае павелічэнню сярэднесусветных тэмператур на 2—2,4 градуса. А вось такое моцнае пацяпленне на нашай планеце можа справакаваць неабарачальныя змяненні ў біясферы і акіянах нашай Зямлі.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Фота Анатоля КЛЕЩЧУКА.

**Мінскія каштаны «дазваляюць» сабе заквітнець не ў пару. Напрыклад, у цёплую восень, калі дрэвы пачынаюць развітвацца з лістотай.**

**ХОЗЯЙСТВЕННЫЙ СУД ГОРОДА МИНСКА ОБЪЯВЛЯЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ПУБЛИЧНЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА, ПРИНАДЛЕЖАЩЕГО ООО «МИОН-ЭЛЕКТРО»**

**Лот № 1.** Оборудование КВКН-4 (КПО-114) комплект, предназначенный для яйценоски курей, расположенный по адресу: Минский район, д. Околица, стоимостью 184 791 200 белорусских рублей.

Стоимость имущества указана с учетом НДС.

Минимальная величина первого шага составляет 5% от стоимости реализуемого с торгов имущества.

**Подробная информация об имуществе размещена на сайте: http://minsk.court.by/,**
а также в помещении хозяйственного суда г. Минска:
г. Минск, ул. Академическая, 15/1.

**Торги состоятся 21.12.2011 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Академическая, 15/1, каб. 201. За дополнительной информацией обращаться: судебный исполнитель Минец И.Н., тел.-факс: 294 93 66 ст. судебный исполнитель Вярьвильский Д.А., тел. 294 93 67.**

Задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (лота) должен быть перечислен на депозитный счет № 3642900000072 в ОАО «АСБ «Беларусбанк» Минск, код 795, УНП 101541763 хозяйственного суда города Минска не позднее чем за 24 часа до начала проведения торгов.

В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 г. № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги.

## ЗАГІНУЎ У БЫТОЎЦЫ

Уначы, а палове першай гадзіны у цэнтр аператыўнага ўпраўлення пры Мінскім гарадскім упраўленні МНС паступіла паведамленне пра пажар у будаўнічай бытоўцы па вуліцы Казіміраўскай. Яна — памерамі 2,5х6 метраў — ужо гарэла адкрытым полымем, калі выратавальнікі прыбылі на месца. У выніку былі пашкоджаны канструкцыі сцен, маёмасць унутры. Калі пачалі разбор першых, знайшлі цела мужчыны. Хто ён, якая прычына здарэння, — зараз высвятляецца.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## НАВАГОДНЯЕ ДРЭВА — З ТРОХ ТЫСЯЧ ЁЛАК

**Галоўную навагоднюю ёлку краіны пачалі ўсталёўваць на Кастрычніцкай плошчы ў Мінску. Вышыня гэтага атрыбута зімовага свята — 35 метраў, таму пры мантажы выкарыстоўваецца спецтэхніка выратавальнікаў. Закуплена каля трох тысяч ёлак для фарміравання галінак навагодняга дрэва, а новыя вялікія (да 1 метра) рознакаляровыя цацкі — банты, металічныя шары і пацеркі — дададуць сталічнай прыгажуні святочнасці і парадуюць мінчан і гасцей.**

**Марына БЕГУНКОВА.**
**Фота аўтара.**

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 01.12.2011 г. (для б/н разлікаў)

| | | | |
|---|---|---|---|
| ▼1 долар ЗША | 8 590,00 | 1 чэшская крона | 445,08 |
| ▼1 еўра | 11 410,00 | 1 польскі злоты | 2 510,89 |
| 1 латвійскі лат | 16 332,35 | ▼1 расійскі рубель | 274,00 |
| 1 літоўскі літ | 3 304,74 | 1 украінская грыўня | 1 071,14 |

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ

| | |
|---|---|
| USD | 31,4001 |
| 10 UAH | 39,1498 |
| 10000 BYR | 36,5117 |
| EUR | 41,7559 |

Агенцтва тэлеграфнай інфармацыі

# УЗВЫШАНАЕ І ЗЯМНОЕ

Алег ПРАЛЯСКОЎСКІ:

## «Рэгіянальныя СМІ — важны сегмент інфармацыйнага поля Беларусі»

**ПРА ГЭТА заявіў міністр інфармацыі Беларусі Алег Пралясковскі на калегіі ведамства, прысвечанай развіццю сістэмы дзяржаўных СМІ Брэсцкай вобласці, паведамляеБЕЛТА.**

На пасяджэнні было адзначана, што ў Брэсцкай вобласці наладжана ўзаемадзеянне органаў дзяржаўнай улады са сродкамі масавай інфармацыі ў пытаннях інфармавання насельніцтва, забяспечана стабільнасць тыражоў дзяржаўнай рэгіянальнай прэсы; дастаткова высокім застаецца працэнт акупнасці дзейнасці рэдакцый мясцовых газет, устойліва развіваецца абласная тэлерадыёкампанія, у значнай ступені захавана інфраструктура праваднога радыёвяшчання. Акрамя таго, праводзіцца праца па падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы журналісцкіх кадраў, абмене прафесійным вопытам паміж рэдакцыямі СМІ.

Ацаніўшы развіццё сістэмы дзяржаўных СМІ Брэстчыны, калегія рэкамендавала рэгіянальным газетам Брэсцкай вобласці да 1 студзеня 2012 года прыняць меры па павышэнні тыражу абласных, гарадскіх і раённых газет, ажыццявіць мерапрыемствы па павышэнні эфектыўнасці эканамічнай дзейнасці рэдакцый з улікам рэальных магчымасцяў аказання ім дзяржаўнай падтрымкі; надаць першачарговую ўвагу павышэнню змястоўнага ўзроўню выдання, у прыватнасці — узмацненню аналітычнага складніку, публікацыі матэрыялаў аб ходзе выканання найважнейшых рашэнняў кіраўніка дзяржавы, урада з праекцыяй на развіццё рэгіёнаў.

Таксама міністэрства прапанавала разгледзець магчымасць стварэння на рэгіянальным узроўні буйных інфармацыйных структур, пераходу шэрагу раённых газет у штотыднёвы фармат, даручыла прыняць меры па ўдасканальванні сайтаў дзяржаўных раённых СМІ і ажыццявіць інфармацыйную кампанію па папулярызацыі сярод насельніцтва эфірнага лічбавага тэлебачання.

Галоўным рэдактарам рэгіянальных СМІ рэкамендавана прыняць меры па нарошчванні тыражоў, аптымізацыі фінансава-гаспадарчай дзейнасці з мэтай эфектыўнай адаптацыі да эканамічных умоў, што склаліся, недапушчэнні зніжэння якасных параметраў выданняў (у першую чаргу аб'ёму інфармацыйнай насычанасці), эфектыўным прасоўванні інфармацыі ў інтэрнэт.

Цяпер у Брэсцкай вобласці выходзіць 20 дзяржаўных рэгіянальных газет, заснавальнікамі якіх выступаюць абласныя і раённыя выканаўчыя камітэты. З іх 2 абласныя газеты, 2 гарадскія, 16 раённых. Сфера электронных СМІ вобласці прадстаўлена 11 праграмамі тэлерадыёвяшчання, з іх 4 дзяржаўнай формы ўласнасці, 19 радыёвяшчання (з іх адна прыватная). Акрамя таго, на тэрыторыі Брэсцкай вобласці ў сетцы вяшчання тэлеканала «Беларусь 2» ажыццяўляе трансляцыю сваіх праграм РУП РТЦ «Тэлерадыёкампанія «Брэст».

## У БЕЛАРУСІ НЕАБХОДНА ВЫБУДАВАЦЬ СІСТЭМУ ПРАВЕРКІ ВЫКАНАННЯ ДАРУЧЭННЯЎ ПА ЗВАРОТАХ ГРАМАДЗЯН

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Уладзімір Макей наведаў вытворча-зборачны цэх ААТ «Мінскі гадзіннікавы завод», аддзел пячатных плат і іншыя структурныя падраздзяленні прадпрыемства.

Працоўны калектыў адкрытага акцыянернага таварыства «Мінскі гадзіннікавы завод» налічвае сёння 767 чалавек. Сярэднямесячная заработная плата за студзень—верасень гэтага года складае Br1073,4 тыс., у тым ліку ў верасні — Br1310,9 тыс. ААТ «МГЗ» вырабляе гадзіннікі (наручныя мужчынскія, жаночыя, дзіцячыя; настольныя і насценныя; аўтамабільныя кварцавыя; будзільнікі), а таксама манометры, пячатныя платы, блокі з пячатнымі платамі, тэрмінал інфармацыйны сувязны ТІНС і інш. Пры вытворчасці прадукцыі прадпрыемства выконвае поўны цыкл тэхналагічных аперацый: штамповачна-нарыхтоўчыя работы, механічную апрацоўку, тэрмічную апрацоўку, паліравальныя работы, гальванічныя пакрыцці, зборачныя работы. Па выніках работы за студзень—верасень гэтага года выраблена прамысловай прадукцыі ў дзейных цэнах на суму Br17,6 млрд. Тэмп росту вытворчасці прамысловай прадукцыі ў супастаўных цэнах склаў 126,2 працэнта да аналагічнага перыяду мінулага года, у дзейных цэнах — 149,9 працэнта. Рэнтабельнасць рэалізаванай прадукцыі — 16,42 працэнта.

## ГРОШЫ НА «ЧАСОЎНІК»

**Музей гісторыі Магілёва звяртаецца па дапамогу да грамадскасці. Патрэбныя грошы, каб выкупіць у прыватнага калекцыянера каштоўную рэч, якая датуецца XVIII стагоддзем і можа ўпрыгожыць экспазіцыю музея ў гарадской Ратушы.**

Гэта «Часоўнік» (альбо хатні малітоўнік), выдадзены ў 1773 годзе ў Магілёве, у друкарні Спірыдона Собаля, і аздоблены гравюрамі мясцовай школы. «Часоўнік» зроблены паводле замовы абшчыны стараверaў Магілёўскай губерні.

Як расказаў дырэктар музея Аляксей БАЦЮКОЎ, магілёўскі калекцыянер просіць за старадрук 500 долараў. Грошы часткова сабраны, але не хапае яшчэ 1 мільёна 800 тысяч рублёў. У музеі гісторыі Магілёва спадзяюцца на дапамогу людзей і мараць пра каштоўны экспанат.

**Ілона ІВАНОВА.**

## КОШТ ГАЛАСАВАННЯ НА ДЗІЦЯЧЫМ ЕЎРАБАЧАННІ — 3 ТЫСЯЧЫ РУБЛЁЎ

З снежня беларусы змогуць узяць удзел у тэлефонным галасаванні ў рамках дзіцячага конкурсу песні «Еўрабачанне—2011», які пройдзе ў Ерэване. Тэлефонныя нумары для галасавання будуць паведамляцца дыктарам у дзень правядзення мерапрыемства. Працягласць тэлегаласавання складзе 15 хвілін. Тарыф на паслугу «Званок на Еўрабачанне» для абанентаў фіксаванай сеткі складзе 3 тысячы беларускіх рублёў для фізічных асоб. Пры прадастаўленні паслугі юрыдычным асобам і індывідуальным прадпрымальнікам дадаткова спаганяецца НДС у памеры 20 працэнтаў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

Таму ад снежня ўрад чакае істотнага скарачэння інфляцыі. Як пры гэтым выглядае пакупніцкая здольнасць заробкаў? Паводле звестак віцэ-прэм'ера, за студзень—верасень 2011 года ўзровень рэальных даходаў насельніцтва склаў 104,8 % да ўзроўню за адпаведны перыяд летась. У рэальных лічбах сярэдні заробак па краіне за 10 месяцаў — 1,8 млн рублёў (у кастрычніку, у прыватнасці, — 2,3 млн рублёў). У цэлым рост рэальных грашовых даходаў насельніцтва за 2011 год, паводле ацэнак урада, павінен скласці не ніжэй за 100 адсоткаў да леташняга ўзроўню.

Сёлетні бюджэт, як чакаецца, будзе выкананы з прафіцытам у 0,7 адсотка да ВУП. Сяргей Румас не абмежаваўся выключна падвядзеннем вынікаў, падзяліўся і прагнозамі на будучыню. Бюджэт будучага года (які ў звычайных абставінах да гэтага часу быў бы ўжо прыняты) нарэшце звярстаны. Адпаведны законапраект скіраваны на разгляд у парламент. Налета ВУП вырасце на 5—5,5 адсотка, прагназуе ўрад. Не менш за 65 адсоткаў прадукцыі прамысловасці павінна быць пастаўлена на экспарт, а дадатнае сальда знешняга гандлю — складаць не менш за 1,3—1,5 млрд долараў.

Пытанні народных выбраннікаў былі, як ім і належыць, зямнымі і жыццёвымі: пра цэны, жыллёвыя крэдыты і заробкі.

Утварэннем цэн на цукар цікавіўся дэпутат Уладзімір Здановіч. Віцэ-прэм'ер патлумачыў, што пастаўкі на ўнутраны рынак былі для айчынных вытворцаў стратнымі, і яны былі гатовы ўвесь цукар паставіць на экспарт. І толькі дзякуючы ручному рэгуляванню гэтага не адбылося. Аналагічная сітуацыя, паводле яго слоў, з малаком. Калі адмовіцца ад ручнога кіравання, кошт на гэтую прадукцыю стане экспартным, запэўнівае Сяргей Румас, — на 50—60 адсоткаў. Ён не адмаўляе цанавых праблем у краіне і сцвярджае, што антыманапольнае заканадаўства будзе ўзмоцнена.

Дэпутат Ганна Лаўрукевіч прыйшла ў шок ад цэн на сыр. «76 тысяч за кіло!» — уражана яна. Спадарыня Лаўрукевіч заклікала міністра гандлю Валянціна Чаканава «праверыць увесь шлях сыру ад прадпрыемства да прылаўка», каб высветліць, «на якім этапе ён становіцца даражэй за мяса». Валянцін Сяргеевіч, у сваю чаргу, рапартаваў, што з падведамаснага яму міністэрства няма чаго ўзяць. Гандлёвая надбаўка не перавышае 22 адсоткаў, факты парушэнняў па гэтай таварнай пазіцыі не былі ўстаноўлены, і пазіцыя міністэрства заключаецца ў тым, каб наяўныя памеры надбавак захаваць.

Усе мы ў курсе чутак пра павышэнне цэн на бензін з 1 снежня. Дэпутат Уладзімір Маёраў вырашыў удакладніць інфармацыю ў намесніка прэм'ер-міністра. Сяргей Румас згадаў пра масавы вываз паліва з краіны, адзіным сродкам барацьбы з якім можа быць «паступовае давядзенне цэн да таго ўзроўню, які зробіць вываз паліва немэтазгодным». Канкрэтна з 1 снежня цэны на паліва не павялічацца, запэўнівае С.Румас, хоць «Белнафтахім» і ўнёс адпаведную прапанову ва ўрад. Там яна цяпер разглядаецца, але рашэнне пакуль не прынята.

Пра рост рэальных грашовых даходаў налета запытаўся дэпутат Васіль Байкоў. Намеснік кіраўніка ўрада паведаміў, што ў сярэднім па краіне рост чакаецца на 3 — 3,5 адсотка. А **міністр працы і сацыяльнай абароны Марыяна ШЧОТКІНА** паведаміла, што адзіная тарыфная сетка мае патрэбу ў пераўтварэннях. Міністр канстатуе, што розніца ў тарыфах для нізка- і высокакваліфікаваных супрацоўнікаў стала не настолькі адчувальнай. Таму тарыфную сетку трэба «расстаўляць і даваць магчымасць павышаць заробак высокакваліфікаваным супрацоўнікам».

Ільготнае крэдытаванне жылля, па ўсім відаць, чакаюць суровыя часіны. «Фінансавых рэсурсаў для хуткага завяршэння ўсіх распачатых будоўляў недастаткова», — прызнаецца намеснік прэм'ер-міністра. Таму ўрад канцэнтруецца найперш на завяршэнні дамоў з высокай ступенню гатоўнасці. Надалей аб'ёмы фінансавання будуць зменшаны. «Урад унёс прапанову наконт рэзкага скарачэння катэгорыі грамадзян, якія могуць разлічваць на будаўніцтва жылля з дзяржаўнай падтрымкай». Аднак тым, хто, як кажуць, паспеў скасочыць у апошні вагон цягніка, які адыходзіў, хвалявацца няма чаго. «Для тых грамадзян, якія заключылі крэдытныя дамовы з банкамі, фінансаванне захаваецца», — робіць акцэнт віцэ-прэм'ер. Паводле яго звестак, зараз запланаваныя сродкі вылучаюцца Міністэрствам фінансаў бесперабойна і ў вызначаных аб'ёмах. Налета ж на льготнае крэдытаванне жыллёвага будаўніцтва будзе вылучана 7,5 трлн рублёў, паведаміў **міністр архітэктуры і будаўніцтва Анатоль НІЧКАСАЎ**. Суадносіны льготнага крэдытавання і фінансавання з іншых крыніц складуць, паводле папярэдніх ацэнак, 50 на 50. Аблвыканкамы, паводле яго інфармацыі, зацвердзілі графікі будаўніцтва жылля. «Туды ўнесеныя пайменна ўсе дамы з указаннем кошту будаўніцтва». Дакументы перададзены ў Міністэрства фінансаў і банкі, каб там «строга кіраваліся імі пры вылучэнні сродкаў».

У парламентарыяў была магчымасць пераканацца, што гэта ўсё зямное, а ёсць яшчэ ўзвышанае. Яны сталі сведкамі незвычайнай выставы ў парламенце. Наведнікі маглі сузіраць маляўнічыя беларускія краявіды — надзвычай жывыя і светлыя палотны. Гледзячы на іх, ніколі не паверыш, што гэтую прыгажосць стварыў чалавек, які не можа трымаць пэндзаль рукой. Самадзейны мастак з Іванцевічаў Анатоль Галушка па трагічнай выпадковасці пазбаўлены магчымасці рухацца, але прагі да жыцця і пачуцця прыгожага не страціў. Свае палотны ён стварае, трымаючы пэндзаль зубамі. У наведнікаў незвычайнай выставы была магчымасць паглядзець на свет яго вачыма, некаторыя з іх змогуць сузіраць яго работы даўжэй. Савет Міністраў, напрыклад, набыў некалькі прыгожых пейзажаў і нацюрморт з яблыкамі. Шэраг работ творцы набыла і Палата прадстаўнікоў.

— Анатоль Галушка не скарыўся лёсу, захаваў інтарэс да жыцця і імкненне тварыць дабро. Гэтымі пачуццямі дыхаюць яго палотны, — сказаў **Старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА**.

**Першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Аляксандр РАДЗЬКОЎ** ад імя кіраўніка дзяржавы вітаў родных мастака і перадаў памятны падарунак. Ён адзначыў шчырае захапленне беларускага лідара мужнасцю Анатоля Галушкі. «Ніхто з нас не застрахаваны ад непрыемных сітуацый, але важна, каб кожны чалавек захоўваў волю да жыцця і працаваў так, каб яго жыццё было ўзорам».

**Ала МАЧАЛАВА.**

# АПЛАТА ЗА САЦЫЯЛЬНАЕ АБСЛУГОЎВАННЕ...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

***Сінкевіч Васіль, Брэсцкая вобласць:** Колькі чалавек пражывае ў сацустановах рознага профілю на платнай аснове і які памер гэтай платы? Калі сваякі аказваюцца не ў сілах плаціць, як паступаюць у такім выпадку?*

**Марыя ГАРБАЦЭВІЧ:** У дамы-інтэрнаты для састарэлых і інвалідаў у першую чаргу пасяляюцца адзінокія грамадзяне. На платных умовах пасяляюцца грамадзяне, якія маюць працаздольных членаў сям'і або іншых фізічных асоб, абавязаных па законе іх утрымліваць, толькі ў дамы-інтэрнаты агульнага тыпу і спецыяльныя дамы-інтэрнаты пры наяўнасці свабодных месцаў. Колькасць асоб, якія знаходзяцца ў дамах-інтэрнатах агульнага тыпу на платных умовах, складае 4-5%. Калі сваякі не маюць дастатковых сродкаў для аплаты за ўтрыманне, то заканадаўствам мясцовым выканаўчым і распарадчым органам прадастаўлена права прымаць рашэнне на падставе хадайніцтваў органаў па працы, занятасці і сацабароне раённых (гарадскіх) выканкамаў, мясцовых адміністрацый аб памяншэнні платы кошту пражывання ў дамах-інтэрнатах для састарэлых і інвалідаў або вызваленні ад яе.

***Леганькова М.А., г. Мінск:** Я пражываю ў г. Мінску. У Гродзенскай вобласці жыве мая цётка, якой 87 гадоў, яна адзінокая. Паколькі я не маю магчымасці за ёй даглядаць, то паўстала неабходнасць змясціць яе ў дом-інтэрнат. Хацелася б пасяліць яе ў дом-інтэрнат, прычым менавіта ў г. Мінску, каб часцей наведваць. Падкажыце, калі ласка, ці магчыма гэта зрабіць? Якія неабходна аформіць дакументы?*

**Марыя ГАРБАЦЭВІЧ:** Пасяленне грамадзян ў дамы-інтэрнаты ажыццяўляецца па тэрытарыяльным прынцыпе, г.зн. грамадзянін пасяляецца ў стацыянарныя ўстановы сацыяльнага абслугоўвання той вобласці, на тэрыторыі якой ён пражываў да моманту пасялення. Пасяленне грамадзяніна ў дом-інтэрнат, размешчаны ў іншай вобласці або ў г. Мінску, можа быць ажыццёўлена толькі на ўмовах ўзаемаабмену. Для атрымання больш падрабязнай інфармацыі па гэтым пытанні вам неабходна звярнуцца ва ўпраўленне па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Гродзенскага райвыканкама (г. Гродна, вул. Лермантава, в 2).

***Мігаль В.В.:** Растлумачце парадак забеспячэння ветэранаў працы санаторна-курортным лячэннем і аздараўленнем.*

**Анатоль РАЖАНЕЦ:** Згодна з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 28 жніўня 2006 г. № 542 «Аб санаторна-курортным лячэнні і аздараўленні насельніцтва», права на лячэнне і аздараўленне (пры наяўнасці медыцынскіх паказанняў і адсутнасці медыцынскіх супрацьпаказанняў) не больш аднаго разу ў два гады маюць непрацуючыя ветэраны працы.

Ветэраны працы аплачваюць кошт пуцёўкі ў залежнасці ад іх даходу (памеру атрыманай пенсіі). Забеспячэнне ветэранаў працы санаторна-курортнымі пуцёўкамі ажыццяўляецца па месцы іх рэгістрацыі праз абласныя (і Мінскае гарадское) падраздзяленні Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні насельніцтва.

***Стасевіч П.П., г. Пінск:** Ці будзе прадугледжаны льготны праезд пенсіянерам на прыгарадным пасажырскім транспарце на перыяд сельскагаспадарчых работ у 2012 годзе?*

**Анатоль РАЖАНЕЦ:** Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 29 красавіка 2011 года № 176 «Аб дзяржаўнай падтрымцы пенсіянераў» прадугледжана штогадовае права грамадзянам, якія дасягнулі пенсійнага ўзросту (мужчыны — 60 гадоў, жанчыны — 55 гадоў), на 50-працэнтную зніжку з кошту праезду на чыгуначным, водным і аўтамабільным пасажырскім транспарце агульнага карыстання рэгулярных прыгарадных зносін (акрамя таксі) на перыяд сезонных сельскагаспадарчых работ з 1 мая па 30 верасня.

***Іваніцкая У.І., г. Гомель:** Мой бацька з'яўляецца інвалідам першай групы і не можа без старонняй дапамогі перамяшчацца і абслугоўваць сябе. Я пражываю ў іншым раёне Гомеля і ажыццяўляю догляд за маленькімі дзецьмі. На якую сацыяльную дапамогу з боку дзяржаўных устаноў можа разлічваць мой бацька?*

**Анатоль РАЖАНЕЦ:** Для прадастаўлення сацыяльных паслуг непрацаздольным грамадзянам ва ўсіх адміністрацыйных раёнах рэспублікі створаны тэрытарыяльныя цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, у якіх інвалідам прадастаўляюцца наступныя паслугі:

— пастаяннае або часовае сацыяльна-бытавое абслугоўванне аддзяленнямі сацыяльнай дапамогі на даму (дастаўка прадуктаў харчавання, медыкаментаў, тавараў першай неабходнасці, садзейнічанне ў прыбыранні кватэры, аплата жылля і камунальных паслуг, аказанне дапамогі ў захаванні асабістай гігіены і прыгатаванні ежы, дастаўка вады, паліва і іншыя );

— разавыя сацыяльна-бытавыя паслугі на даму;

— разавыя або часовыя паслугі пагадзіннага дзённага догляду грамадзян, якія цалкам страцілі здольнасць да самаабслугоўвання і перамяшчэння (дапамога ў прыёме ежы і ў захаванні асабістай гігіены, мыццё посуду пасля прыёму ежы і некаторыя іншыя паслугі);

— пастаянныя паслугі сядзелкі для грамадзян, якія цалкам страцілі здольнасць да самаабслугоўвання і перамяшчэння (назіранне за станам здароўя, кантроль прыёму медыкаментаў, прызначаных урачом, дапамога ў захаванні асабістай гігіены і прыёме ежы, аказанне маральна-псіхалагічнай падтрымкі і іншыя);

— знаходжанне ў аддзяленнях дзённага знаходжання для інвалідаў з арганізацыяй заняткаў па інтарэсах і вольнага часу.

Падрабязную інфармацыю аб парадку і ўмовах прадастаўлення паслуг можна атрымаць ва ўпраўленнях па працы, занятасці і сацыяльнай абароне і тэрытарыяльных цэнтрах сацыяльнага абслугоўвання па месцы жыхарства.

***Алена, г. Мінск:** Хацелася б пачуць, колькі каштуюць паслугі сядзелкі.*

**Анатоль РАЖАНЕЦ:** Кошт сацыяльных паслуг вызначаецца аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам. У г. Мінску кошт адной гадзіны паслуг сядзелкі ў дзённы час складае каля 5 тысяч рублёў, у начны час і святочныя дні — каля 6-7 тысяч рублёў. Па рашэнні Мінгарвыканкама для асобных катэгорый мінчан прадугледжана кампенсацыя выдаткаў на паслугі сядзелкі. У сувязі з гэтым рэкамендуем вам, каб атрымаць падрабязныя тлумачэнні, звярнуцца ў камітэт па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама.

*(У нумары за 3 снежня мы размесцім адказы на пытанні аб сацыяльным абслугоўванні інвалідаў.)*

**Падрыхтавала Святлана БУСЬКО.**

## МІНІМАЛЬНАЯ ЗАРПЛАТА Ў БЕЛАРУСІ БУДЗЕ ПАВЫШАНА ДА BR1 МЛН

**Аб гэтым паведаміў БЕЛТА віцэ-прэм'ер Сяргей Румас.**

«Урад вызначыўся, каб у наступным годзе не было ў краіне заработнай платы меншай за Br1 млн», — падкрэсліў віцэ-прэм'ер. Што датычыцца магчымага павышэння тарыфнай стаўкі першага разраду, то, паводле слоў Сяргея Румаса, рашэнне можа быць прынята на наступным тыдні. «Павышэнне будзе, але, з якога чысла і ў якім памеры, на наступным тыдні будзе аб'яўлена», — сказаў ён.

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ВЯЛІКАБРЫТАНІЯ ВЫГНАЛА ПАСОЛЬСТВА ІРАНА



**Вялікабрытанія загадала іранскім дыпламатам неадкладна пакінуць пасольства ў Лондане. Пра гэта паведамляе Agence France-Presse.**

Гэта рашэнне брытанскія ўлады прынялі на наступны дзень пасля таго, як групы радыкальна настроенай моладзі разгромілі пасольства Вялікабрытаніі ў Тэгеране ў аўторак, 29 лістапада. Пагромам падверглася як асноўная тэрыторыя пасольства ў цэнтры іранскай сталіцы, так і будынкі на ўскраіне горада.

Падчас беспарадкаў пагромшчыкі таксама ўзялі шасцярых брытанцаў у заложнікі. Неўзабаве яны былі вызвалены паліцыяй.

Пасля пагромаў прадстаўніцтва Вялікабрытаніі ў Тэгеране было закрыта. Брытанскія дыпламаты пакінулі Іран раніцай 30 лістапада. Услед за Злучаным Каралеўствам сваё прадстаўніцтва ў Іране закрыла Нарвегія. Паведамляецца таксама, што пасол Германіі ў Іране адкліканы на радзіму «для кансультацый».

Масавыя акцыі пратэсту ў Тэгеране былі звязаны з уводзінамі новага пакета санкцый у стаўленні да Ірана з боку ЗША, Канады і Вялікабрытаніі. Заходнія краіны тлумачаць сваё рашэнне тым, што Іран працягвае ядзерныя даследаванні, накіраваныя на стварэнне зброі.

### ВЫНІКІ ВЫБАРАЎ ПРЭЗІДЭНТА ПАЎДНЁВАЙ АСЕЦІІ АДМЕНЕНЫ

**На трэція суткі пасля таго, як у Паўднёвай Асеціі прайшоў другі тур прэзідэнцкіх выбараў, вынікі якіх напярэдадні былі адменены Вярхоўным судом рэспублікі, сітуацыя прыкметна абвастрылася. Масква выступіла з афіцыйнай заявай пра апошнія падзеі ў Цхінвалі. Рэакцыі Расіі чакалі даўно: СМІ пісалі пра разгубленасць Крамля ў сувязі з пройгрышам падтрыманага расійскімі ўладамі кандыдата Анатоля Бібілава.**

Падзеі ў паўднёваасецінскай сталіцы ўчора сталі развівацца імкліва. Днём у Цхінвалі прагучалі першыя стрэлы: супрацоўнікі праваахоўных органаў адкрылі агонь у паветра, калі натоўп прыхільнікаў Алы Джыоевай, якая змагаецца за прэзідэнцкае крэсла і перамагла ў другім туры, прыйшоў штурмаваць цэнтрвыбаркам рэспублікі.

Затым ахова прапусціла Джыоеву і былога міністра абароны генерала Анатоля Баранкевіча, які яе суправаджаў, у будынак. Як стала вядома, там Ала Джыоева сустрэлася са старшынёй ЦВК Бэлай Пліевай, і тая перадала ёй выніковы пратакол другога тура выбараў, паводле якога яна перамагла на прэзідэнцкіх выбарах з адрывам у 16%. У той жа час старшыня ЦВК Пліева заявіла, што публікаваць выніковы пратакол «не мае сэнсу», таму што «гэтая папера не мае сілы пасля рашэння Вярхоўнага суда».

### БЕСПРАЦОЎЕ Ў ЕЎРАЗОНЕ Ў КАСТРЫЧНІКУ ДАСЯГНУЛА НОВАГА ГІСТАРЫЧНАГА МАКСІМУМУ

**Беспрацоўе ў зоне еўра ў кастрычніку дасягнула новага гістарычнага максімуму — 10,3%, паведамляюць інфармагенцтвы са спасылкай на інфармацыю Еўрастата. Папярэдні рэкорд на ўзроўні 10,2% быў зарэгістраваны ў верасні гэтага года.**

Апублікаваныя звесткі па еўразоне аказаліся горшымі за прагноз аналітыкаў, якія чакалі значэнні паказчыку на ўзроўні ў 10,2%.

Максімальны ўзровень беспрацоўя па-ранейшаму фіксуецца ў Іспаніі, дзе ён склаў 22,8%, вельмі высокія паказчыкі таксама ў Грэцыі і Латвіі. Самы нізкі ўзровень быў адзначаны ў Аўстрыі (4,1%). Затым ідуць Люксембург (4,7%) і Нідэрланды (4,8)%.

У 17 дзяржавах еўразоны ў кастрычніку налічвалася каля 16,294 млн беспрацоўных, што на 126 тыс. вышэй за ўзровень верасня.

### БОЛЬШ ЗА 2 МЛН ДЗЯРЖСЛУЖАЧЫХ СТРАЙКУЮЦЬ У ВЯЛІКАБРЫТАНІІ

**У Вялікабрытаніі праходзіць масавая і самая буйная з 1979 года забастоўка дзяржслужачых. Больш за 2 млн чалавек не выйшлі ўчора на працу, паведамляюць інфармагенцтвы.**

Працаўнікі дзяржаўнага сектара пратэстуюць супраць намеру ўлад правесці шэраг балючых для бюджэтнага сектара рэформаў, у тым ліку змяніць умовы выплаты пенсій.

У выніку страйку на 12 гадзін спынена праца найбуйнейшага ў краіне аэрапорта Хітроў, які з'яўляецца важным перасадачным пунктам для транзітных вандроўнікаў. Акрамя таго, закрыта каля 90% дзяржаўных школ. Не працуюць многія бальніцы, транспартныя вузлы і дзяржаўныя ўстановы.

**Антикризисный управляющий ОАО «Гомельчанка»**

**ОБЪЯВЛЯЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА**

**Торги проводятся в форме открытого аукциона с условием по второму лоту и состоятся 15 декабря 2011 года в 11.00 по адресу: г. Гомель, ул. Ильича, 286.**

**На торги выставляется:**

| № п/п | Наименование имущества | Рыночная стоимость без учета НДС, долларов США |
|---|---|---|
| 1 | Здание швейного цеха — двухэтажное здание площадью 1.021,5 м² (Гомельская область, Буда-Кошелевский район, г.п. Уваровичи, ул. Советская, 20) | 44.428,6 |
| 2 | Часть здания АБК с встроенным оборудованием, транспортной проходной, благоустройством площадью 5.706,3 м² (г. Гомель, ул. Ильича, 286) | 927.360 |

Условие по первому лоту — использование новым собственником имущества по существующему функциональному назначению (швейное производство) с сохранением коллектива работников.

Шаг аукциона 5% от начальной цены лота.

Задаток в размере 10% от начальной цены лота перечисляется на расчетный счет ОАО «Гомельчанка» — 3012201010012 в ГФ по Гомельской области ОАО «Белинвестбанк», МФО 151501768, г. Гомель, ул. Советская, 7, УНН 400021644.

Заключение договора купли-продажи в течение 20 (двадцати) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона, срок и условия оплаты определяются по согласованию Победителя с Продавцом при заключении договора купли-продажи.

Для участия в аукционе необходимо предоставить: заявление на участие, копию платежного поручения о внесении размера задатка, паспорт; для резидентов Республики Беларусь: юридическим лицам — доверенность представителя юридического лица (в случае необходимости таковой), копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации; представителям физических лиц — копию свидетельства о государственной регистрации (без нотариального засвидетельствования); для нерезидентов Республики Беларусь: юридическим и физическим лицам — легализованные в установленном порядке копии учредительных документов, выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение 6 месяцев до подачи заявления на участие в торгах) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией (без нотариального засвидетельствования); представителям юридических и физических лиц — легализованную в установленном порядке доверенность.

Выигравшим торги на аукционе признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Задаток, внесенный Победителем, будет зачтен в счет окончательной стоимости приобретенного имущества, остальным участникам будет возмещен в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. В случае, если заявка на участие в торгах подана только одним участником, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов. Продавец вправе снять объект с торгов до объявления его проданным.

Возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляет Победитель (Претендент на покупку) не позднее 3 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах торгов на основании счета-фактуры, выдаваемой Продавцом.

Оплата стоимости приобретенного предмета торгов осуществляется в установленном законодательством порядке:

- победителем торгов, являющимся резидентом Республики Беларусь, — в рублях;

- победителем торгов, являющимся нерезидентом Республики Беларусь, — в рублях либо в иностранной валюте по курсу Национального банка Республики Беларусь на дату платежа.

Заявки на участие в аукционе принимаются **до 15.00 14 декабря 2011 г.**

**Дополнительную информацию можно получить по тел. 39 06 24 (ф).**

# Як канкурыруем з замежным таварам?

Рэха публікацыі

## Айчынныя зубачысткі аказаліся ўдвая даражэй за імпартныя

**Карэспандэнт «Звязды» правёў «маніторынг» у гродзенскіх крамах, якія гандлююць так званымі гаспадарчымі «дробязямі», і пераканаўся, што па многіх пазіцыях айчынныя вытворцы па-ранейшаму, так бы мовіць, здаюцца без бою сваім замежным канкурэнтам. Гэтаму і быў прысвечаны артыкул «Скрабок — з Аўстрыі, анкерны болт — з Кітая» (нумар за 3 лістапада 2011 г.)**

— Не адмаўляючы актуальнасць узнятых аўтарам артыкула праблем, мяркуем, што арганізацыі Мінпрама ў цэлым паспяхова спраўляюцца з пастаўленымі задачамі асваення імпартазамяшчальнай прадукцыі па замацаванай за міністэрствам наменклатуры тавараў, — зазначае ў рэагаванні на публікацыю **намеснік міністра прамысловасці Беларусі Віталь ПРЫМА**.

Напрыклад, у наменклатуры тавараў садова-гаспадарчага прызначэння наладжана вытворчасць ключоў гаечных, адвёртак слесарна-мантажных, сякер, рыдлёвак, піл ручных, культыватараў, плоскарэзаў, рыхліцеляў провалачных, кормаздрабляльнікаў, цялежак ручных, элетрапомпаў бытавых, ліцейных пячных вырабаў, станкоў дрэваапрацоўчых малагабарытных, грабель веерных, кораневыдаляльнікаў і іншых.

Шырокую наменклатуру крапежных вырабаў выпускае Рэчыцкі метызны завод (з каталогам прадукцыі можна азнаёміцца на сайце прадпрыемства http://www.rmz.by/products/nails/).

Міністэрствам гандлю сфарміраваны пералік тавараў, якія не вырабляюцца альбо выпускаюцца ў недастатковых аб'ёмах беларускай прамысловасцю.

Арганізацыі Мінпрама прынялі да асваення 46 пазіцый. У тым ліку: нарошчванне аб'ёмаў выпуску энергазберагальных люмінесцэнтных лямпаў у ААТ «Брэсцкі электралямпавы завод» і ААТ «Віцязь» і пашырэнне наменклатуры да 79 тыпапамераў, вытворчасць Магілёўскім заводам «Электрарухавік» электрасокавыціскалак павышанай прадукцыйнасці, заводам «Магілёўліфтмаш» — электрагазонакасілак.

Пры конкурсным адборы праектаў галоўнымі крытэрыямі былі акупляльнасць і экспартная арыентаванасць тавараў, паведамляецца ў адказе Мінпрама. Праўда, ці заўсёды айчынная прадукцыя канкурэнтаздольная ў параўнанні з замежнай?

Напрыклад, у артыкуле «Скрабок — з Аўстрыі, анкерны болт — з Кітая» ў якасці станоўчага для нашых вытворцаў факта былі прыведзены драўляныя зубачысткі, якія сталі вырабляць на адным з прадпрыемстваў. Нарэшце не толькі кітайцы, але і мы, не абдзеленыя прыродай запасамі драўніны, узяліся за падобную «драбязу»!

Але вось што паведамляе ў адказе на публікацыю **намеснік міністра эканомікі Беларусі Анатоль ФІЛОНАЎ** са спасылкай на нядаўняе пасяджэнне ўрада па пытаннях нарошчвання аб'ёмаў вытворчасці, пашырэння наменклатуры і асартыменту імпартазамяшчальнай прадукцыі

**ДАВЕДАЧНА.** ***Зубачысткі,*** *асвоеныя ЗАТ «Холдынгавая кампанія «Пінскдрэў», значна перавышаюць па цане тыя, што завозяцца па імпарце (у два разы).*

*ААТ «Электраапаратура» і ААТ «Мінскі прыборабудаўнічы завод» выпускаюць толькі прасцейшыя мадэлі айчынных* ***электрапрасаў*** *з мінімальнай колькасцю опцый, не забяспечаныя запатрабаванымі функцыямі (параўвільгатненне, сістэма супраць накіпу і інш.).*

***Электрапараваркі,*** *асвоеныя Мінскім прыборабудаўнічым заводам, карыстаюцца абмежаваным попытам з-за малога аб'ёму і вышыні паравой ёмістасці, патрабуецца дапрацоўка дызайну.*

***LCD-тэлевізары*** *ААТ «Віцязь» саступаюць імпартным аналагам па якасці адлюстравання і дызайне.*

*А вышэйзгаданыя ў адказе Мінпрама* ***энергазберагальныя лямпы*** *«саступаюць імпартным па дызайне, а таксама па працягласці гарантыйных тэрмінаў эксплуатацыі: ААТ «Брэсцкі электралямпавы завод» — 7

# МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

1 снежня 2011 г. № 32 (270)


АД ПЕРШАЙ АСОБЫ

## РЭЦЭПТ ПОСПЕХУ

### Праца з дэпутатамі ўсіх узроўняў у пэўнай ступені павінна быць агрэсіўнай

**Інга МІНДАЛЁВА**

**Летась на Гомельшчыне стартаваў унікальны тэлепраект (аналагаў пакуль няма ў іншых рэгіёнах), прысвечаны дзейнасці мясцовых распарадчых і прадстаўнічых органаў, — «Мясцовая ўлада». З яго прэзентацыі і пачала сваё выступленне перад старшынямі сельскіх Саветаў, якія з'ехаліся ў Мінск для павышэння кваліфікацыі, старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў, член Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Марыя БОНДАР.**

Каментуючы відэаролік, яна патлумачыла, што 30-хвілінная праграма выходзіць двойчы на месяц. Героямі кожнай становяцца два раёны вобласці, кіраўнікі якіх — як базавага, так і пярвічнага ўзроўню — з дапамогай тэлебачання дзеляцца з калегамі сваімі найбольш цікавымі напрацоўкамі і дасягненнямі.

— Па вялікім рахунку, гэта тыя ж курсы павышэння кваліфікацыі, дзе кожны раён і сельсавет маюць магчымасць і сябе паказаць, і на іншых паглядзець. У праграме мы імкнёмся як мага больш паказваць канкрэтных людзей і тую працу, якую яны робяць. Гэта тычыцца як выканаўчай улады і дэпутацкага корпуса, так і звычайных грамадзян, хто ўжо знаходзіцца на пенсіі.

### Роля і статус

Для таго, каб эфектыўна вырашаць праблемы вяскоўцаў, мясцовая ўлада ў асобе старшыні сельскага Савета павінна мець адпаведны аўтарытэт і рэальныя паўнамоцтвы. Менавіта з гэтага пачала сваю дзейнасць на пасадзе старшыні абласнога Савета дэпутатаў Марыя Бондар.

— Раней старшыня сельвыканкама заставаўся сам-насам з сур'ёзнымі праблемамі сельсавета: штат у яго невялікі, сродкаў мала, уплыў аслаблены. Таму ў Гомельскай вобласці мы пайшлі па шляху павышэння ролі і статуса старшыні сельскага Савета. Ён павінен стаць гаспадаром той тэрыторыі, за якую адказвае. І ў нас гэта атрымалася. Цяпер на першы план выйшла другая тэма — асоба самога старшыні. Ён павінен адпавядаць тым патрабаванням, якія да яго прад'яўляюцца. Прыемна адзначыць, што ў нас ужо ёсць шмат вопытных таленавітых старшынь сельвыканкамаў, якія «раскрыліся» на гэтай пасадзе, у поўнай меры змаглі праявіць свае арганізатарскія і кіраўніцкія здольнасці.

Марыя Андрэеўна расказала, што на Гомельшчыне ўсе старшыні сельвыканкамаў у абавязковым парадку прысутнічаюць па панядзелках на планёрнай нарадзе ў старшыні райвыканкама, дзе могуць агучыць тыя пытанні, якія назапасіліся за мінулы тыдзень у сельсавеце і якія самі яны вырашыць не ў стане. Паколькі ў планёрцы бяруць удзел і кіраўнікі ўсіх профільных ведамстваў, то прызначыць адказных за выпраўленне сітуацыі можна адразу, што значна павышае аператыўнасць. Вярнуўшыся ў свой сельсавет, кожны старшыня пярвічнага ўзроўню праводзіць сваю планёрку, дзе прысутнічаюць кіраўнікі ўсіх мясцовых арганізацый, незалежна ад формы ўласнасці. Там агучваюцца задачы, пастаўленыя ў раёне.

— Сёння можна смела сцвярджаць, што ў нас створана дзейсная ўпраўленчая структура, — падсумавала Марыя Бондар. — На месцах склалася аўтарытэтная сістэма кіравання. Калі раней, яшчэ 1,5 года таму, пры сустрэчы з нашымі старшынямі сельскіх Саветаў я бачыла іх разгубленасць, бездапаможнасць, то сёння гэта ўпэўненыя ў сабе людзі, якія маюць аўтарытэт. Цяпер старшыні сельскага Савета працаваць прасцей, бо ён — гаспадар на сваёй тэрыторыі.

**(Заканчэнне на 2-й стар. «МС»)**

**У невялікіх вёсках, дзе стацыянарных крам няма, на дапамогу мясцовым жыхарам прыходзіць выязны гандаль. Хлеб, крупы, малочныя прадукты — крамы на колах дастаўляюць самае неабходнае. Так, аўталаўкі Мінскага раённага спажывецкага таварыства кожны тыдзень аб'язджаюць сорак вёсак прысталічча.**

## ТОЛЬКІ Б ПРЫХОДЗІЛІ ЛЮДЗІ!

### Жыццё і гандаль на колах

**Марына БЕГУНКОВА**

Працоўны дзень у прадаўца Ірыны Рыжковай і кіроўцы Міхаіла Сарокі пачынаецца а палове восьмай раніцы: у краме № 17 Астрашыцкага Гарадка праглядаюцца ўсе заяўкі, выпісваюцца, загружаюцца тавары — і наперад да 8 гадзін вечара!

Першы пункт прыпынку — вёска Галіца. Машына толькі на пад'ездзе, а людзі ўжо хвілін дзесяць стаяць, чакаюць. Сюды, у адпаведнасці з раскладам аўталаўка наведваецца два разы на тыдзень, але для кіроўцы своеасаблівы абавязак — пасігналіць. Раптам нехта забыўся?

— Паглядзіце на прылаўкі — усё ёсць! — у адзін голас кажуць мясцовыя пакупнікі. Але бяруць самае неабходнае — хлеб, цукар, малако і кефір, цыгарэты.

— Прывезлі рыбку добрую! І ліверка смачная ёсць! — рэкламуе тым часам свой тавар прадавец Ірына. Калі-нікалі і зробяць людзі «незапланаваныя» пакупкі.

Навасёлкі і Скураты, Жукаў Луг і Касачы, Лысавічы, Бахметаўка. У дзень аўталаўка праязджае каля 170 кіламетраў. А колькі ў месяц! Працоўны тыдзень — шэсць дзён, выхадны толькі ў нядзелю.

— Зараз яшчэ зацішша, можна сказаць, — дзеліцца думкамі Міхаіл Сарока. — Хутка дарогі замяце, дык будзе складана. А летам працавалі да 10 гадзін вечара — пакуль людзі ішлі. Час ад часу і я станаўлюся побач, за прылавак: паспрабуй жанчыне падняць мех мукі ці цукру!

Дружны калектыў у складзе Ірыны Рыжковай і Міхаіла Сарокі аб'язджае вёскі Мінскага раёна на працягу шасці гадоў і лічыцца адным з лепшых у вобласці. Цяпер у месяц яны зарабляюць каля 100 мільёнаў рублёў, летам — на 20-30 мільёнаў больш. За гэтай лічбай — добрасумленнасць і любоў да сваёй працы.

— Самае складанае, як і ўвогуле ў гандлі, не «сарвацца» на людзей, — падумаўшы, кажа Ірына. — І індывідуальны падыход. Слова «дзякуй» кожнаму чуць прыемна.

...Аўталаўка збіраецца ўжо зачыняцца, каб паехаць далей. Але на дарозе з'яўляюцца людзі, якія шпарка набліжаюцца да нас.

— Якаўлевіч, а чаму ж не пасігналіў? Я ж ледзь не спазнілася!

— Сігналіў-сігналіў, можа, не пачула?

— У наступны раз сігналь гучней, добра?..

**(Заканчэнне на 2-й стар. «МС»)**

Прадавец Ірына РЫЖКОВА.

Міхаіл САРОКА заўсёды дапаможа і пакласці пакупкі, і занесці цяжкія сумкі.

ФОРС-МАЖОР

## ЗАКРЫЦЬ НЕЛЬГА ПАКІНУЦЬ

**У рэдакцыю звярнуўся загадчык мясцовага філіяла літаратурнага музея Янкі Купалы, жыхар Янушкавіцкага сельсавета Лагойскага раёна Валянцін Журко. Ён расказаў, што ў Янушкавічах збіраюцца ліквідаваць ашчадную касу — аддзяленне «Беларусбанка».**

— Адпраўляюць нас усіх у вёску Гайна, што за 10 кіламетраў, — абураецца Валянцін Аляксандравіч. — Як жа можна закрываць наша аддзяленне банка, калі народ атрымлівае тут заробкі, пенсіі, арганізацыі здаюць выручку (у нас жа тут і бальніца, і лясгас, і школа, і аптэка)?

Нам гавораць, што няма кадраў, няма каму працаваць у аддзяленні, банку даводзіцца прысылаць свайго спецыяліста ажно з Лагойска. Вядома, на 0,25 стаўкі хто ж пойдзе? Прапануйце чалавеку хаця б 0,5 стаўкі, тады знойдуцца ахвотнікі.

Як і дзе мы будзем атрымліваць пенсіі і заробкі? Ездзіць у раён? Нам кажуць, што ў раён быццам бы ездзіць не трэба, бо гэтыя паслугі пачне аказваць пошта. Але супрацоўніка нашай пошты і без таго загрузілі так, што яна ўжо ледзь спраўляецца. Калі ж яшчэ і гэта на яе «павесяць», яна ўвогуле звольніцца.

Ашчадную касу ў Янушкавічах закрываюць з-за нерэнтабельнасці. Дык якую ж рэнтабельнасць вы тут хочаце атрымаць? Гэта ж вёска! Але магазіны працуюць, пошта працуе, бо яны патрэбны людзям. А рэнтабельнасць шукайце ў іншым месцы...

Больш падрабязна сітуацыю нам акрэсліў **старшыня Янушкавіцкага сельскага Савета дэпутатаў Аляксандр ПАЛЯНСКІ:**

— Аддзяленне банка ў вёсцы Янушкавічы працавала 3 дні на тыдзень. Спецыяліст ездзіла сюды з Лагойска (а гэта за 20 кіламетраў). Знайсці некага, хто жыве бліжэй, не атрымалася: неаднаразовыя аб'явы ў газету пра пошук работніка нічога не далі — ніхто туды з-за аддаленасці ад райцэнтра і памеру аплаты не пайшоў.

Людзі былі супраць закрыцця аддзялення, пісалі зварот на імя старшыні райвыканкама. Ён даручыў дэталёва разабрацца і вырашыць пытанне на карысць грамадзян — захаваць «кропку» ў Янушкавічах. Але будынак, дзе размяшчаецца згаданая «кропка», знаходзіцца ў аварыйным стане і не ацяпляецца. Зімой тэмпература там — каля 9 градусаў па Цэльсію. Плюс арэндная плата, амартызацыя...

Па словах старшыні сельвыканкама, «дагрузіць» гэтае аддзяленне «Беларусбанка» кліентамі за кошт работнікаў двух мясцовых сельскагаспадарчых прадпрыемстваў, якія абслугоўваюцца «Белагрtoрамбанкам» і «ВТБ-банкам», таксама не атрымаецца. Яны атрымліваюць заробак наяўнымі грашыма. І гаспадаркі не збіраюцца пераходзіць на «Беларусбанк», бо самі аддаленыя ад райцэнтра, і ў кожнай — вялікі працэнт «цягучкі». Адпаведна, арганізаваць перавод на абслугоўванне іншым банкам ды яшчэ па картках — праблематычна.

— Цяпер згаданае аддзяленне працуе адзін раз на тыдзень, па аўторках, з 8.00 да 15.00, — дадаў Аляксандр Палянскі. — Я на сваёй пасадзе каля 4 месяцаў, і не скажу, што там збіраецца значны натоўп людзей. Работа банка тут стратная, таму праўленне і прыняло рашэнне аб закрыцці «кропкі» 17 снежня.

Аднак банк паабяцаў, што на пошце ў Янушкавічах будзе устаноўлены інфакіёск для аплаты паслуг, а ўкладчыкі змогуць абслугоўвацца ў вёсцы Гайна, што за 10-12 км ад Янушкавічаў. У перспектыве, пры наяўнасці сродкаў, у Янушкавічах з'явіцца і банкамат «Беларусбанка».

Сваю пазіцыю па гэтым пытанні пацвердзіў і сам банк. Вось якую інфармацыю нашаму журналісту прадаставіла яго прэс-служба.

«У арандаваным памяшканні, дзе размешчана аддзяленне банка (10 кв.м.), адсутнічае сістэма ацяплення, матэрыяльна-тэхнічнае абсталяванне не адпавядае патрабаванням па тэхнічнай умацаванасці. Для далейшага функцыянавання неабходна правесці рамонтныя работы, што паўплывае на фінансавы вынік і прывядзе да стратнай дзейнасці аддзялення № 611/67.

У адпаведнасці з дамовай-даручэннем, заключаным паміж РУПС «Белпошта» і банкам, правы па ажыццяўленні некаторых дзеянняў (аперацыі па ўкладах) пры закрыцці аддзялення будуць дэлегаваныя аддзяленню паштовай сувязі ў в. Янушкавічы. У аддзяленні паштовай сувязі і ў краме ўстаноўлена тэрмінальнае абсталяванне, якое дазваляе ажыццяўляць разлікі з дапамогай банкаўскіх пластыкавых картак.

На закрыццё аддзялення № 611/67 ў в. Янушкавічы маецца ўзгадненне раённага выканаўчага камітэта».

— Закрыццё аддзялення ў Янушкавічах, магчыма, асабліва і не адаб'ецца на жыцці мясцовых жыхароў, — выказаў думку старшыня мясцовага сельвыканкама. — Пошта ў нас працуе ўсе дні (з ранку да вечара), апроч нядзелі і панядзелка. З улікам таго, што на работніка пошты ў Янушкавічах будзе ўскладзена дадатковая нагрузка, дырэктар раённай паштовай сувязі паабяцаў перагледзець памер яго заробку... Сам я адмоўна стаўлюся да такой палітыкі банка, але ў той жа час разумею, што ва ўмовах няпростай фінансавай сітуацыі кожны імкнецца эканоміць. Мяркую, самае правільнае — увесці пэўныя новаўвядзенні на пошце, каб нейкая асобная арганізацыя не несла яўных страт і пры гэтым людзі маглі атрымліваць неабходныя ім паслугі.

**Інга МІНДАЛЁВА.**

## ТАКОЙ ПРАГРАМЫ ЯШЧЭ НЕ БЫЛО

**На Віцебшчыне прымуць абласную комплексную праграму па навядзенні парадку на зямлі на тэрыторыі сельскіх населеных пунктаў.**

Як расказаў **Руслан ВІНАКУРАЎ, старшыня Віцебскага абласнога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя,** такой праграмы яшчэ не было ні ў адной вобласці рэспублікі. Яна будзе прадугледжваць навядзенне парадку ў вёсках па ўсіх пытаннях, пачынаючы ад асвятлення і асфальтавання і заканчваючы міні-палігонамі, прысядзібнымі ўчасткамі і нават меліярацыйнымі каналамі. Праграму распрацуюць да 1 студзеня з удзелам усіх службаў. А асноўная каардынацыя ўскладзена на абласны камітэт прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя. Па кожным кірунку вызначана, што і як рабіць, засталося толькі рэалізаваць задуманае на практыцы.

Праведзена таксама абследаванне ўсіх сельскагаспадарчых аб'ектаў, якія знаходзяцца ў водаахоўных зонах. Такіх аказалася 424. Вызначана 90 найбольш небяспечных з іх. Гэта перш за ўсё фермы, якія будаваліся ў 1960-я гады без ачышчальных збудаванняў, а таксама пустуючыя сельскагаспадарчыя аб'екты. У 2011—2012 гады прыкладна палова з іх будзе вынесена за межы водаахоўных зон.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## ДЗЕ? У ВОЛАГДЗЕ...

**Больш за пятнаццаць тысяч наведвальнікаў зацікавіў кірмаш, які быў арганізаваны ў Волагдзе гродзенскім аддзяленнем Беларускай гандлёва-прамысловай палаты. Увогуле было прададзена беларускіх тавараў больш чым на пяць мільярдаў рублёў.**

Падчас кірмашу падпісана пагадненне аб супрацоўніцтве паміж адміністрацыяй Волагды і Гродзенскім гарвыканкамам. Партнёры лічаць рэальным павялічыць цяперашні аб'ём гандлёвага абароту паміж рэгіёнамі, які сёлета за восем месяцаў склаў 3,6 мільёна долараў.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

ТЭМА ДНЯ

## ШТО Ў ПРАЕКЦЕ?

### ПРЫНЯЦЬ РАШЭННЕ НА СЕСІІ — ТОЛЬКІ ПАЛОВА СПРАВЫ

**Наталля КАРПЕНКА**

**Для старшыняў пасялковых і сельскіх Саветаў дэпутатаў, якія павышаюць сваю кваліфікацыю ў Інстытуце дзяржаўнай службы Акадэміі кіравання, выязныя практычныя заняткі становяцца традыцыйнай формай навучання. Тэорыя тэорыяй, але заўсёды цікава паглядзець, як рэалізуюць на практыцы свае ўласныя паўнамоцтвы твае калегі. На гэты раз «кропкай на карце», куды выправілася група кіраўнікоў пярвічнага ўладнага звяна (прадстаўнікоў усіх абласцей рэспублікі), стаў Слуцкі раён.**

Падрыхтоўка і правядзенне сесій сельскага Савета дэпутатаў — тэма для абмеркавання дастаткова спецыфічная. На першы погляд яна патрабуе ведання, так бы мовіць, «тэхнічнага» боку справы: як падрыхтавацца, як правесці, каго запрасіць і г.д. Насамрэч, на сесіях разглядаюцца найбольш важныя для мясцовага насельніцтва пытанні, вырашэнне якіх так ці інакш паўплывае на іх жыццё. План галоўных тэм для разгляду на сесіях распрацоўваецца на ўвесь наступны год. Гэта, так бы мовіць, асноўнае кіраванне да дзейнасці. Тэматыку сесій могуць «падказаць» дэпутаты, старасты, кіраўнікі арганізацый, ды і ўвогуле — жыццёвая сітуацыя.

Для падрыхтоўкі канкрэтнага пытання, якое будзе разглядацца падчас сесіі, ствараецца працоўная група з зацікаўленых і кампетэнтных службовых асоб. (Напрыклад, калі плануецца абмеркаваць рэалізацыю Дэкрэта № 18, у працоўную групу абавязкова ўключаюць работнікаў амбулаторыі, школы і г.д.). Асобна рыхтуецца праект рашэння сесіі, вызначаецца, якія абавязкі і на каго будуць ускладзены.

— Натуральна, праекты рашэнняў рыхтуюцца не толькі ў кабінеце і бяруцца не са столі, — тлумачыць **старшыня Вясейскага сельскага Савета дэпутатаў Алена ГАНЧАР**. — Каб дасканала разабрацца ў пытанні, неабходна «ўхапіць» яго сутнасць, і тут без выездаў на месцы, без гутарак з насельніцтвам, са старастамі, са спецыялістамі не абысціся. Асабліва калі гэта датычыцца добраўпарадкавання або жыццезабеспячэння — скажам, падрыхтоўкі да ацяпляльнага сезона. Тут столькі нюансаў узнікае!.. Седзячы на месцы, іх не прадугледзіш і, адпаведна, не зможаш прыняць правільнае рашэнне.

Падчас правядзення самой сесіі могуць таксама ўзнікнуць карэкціроўкі і дапаўненні. Канчатковае рашэнне накіроўваецца «на рукі» дэпутатам сельскага Савета і службовым асобам, якія будуць адказваць за яго выкананне.

— Правільна робіце, — заўважае **адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Аляксей СЦЕПАНЕНКА.** — Бо некаторыя вашы калегі гэтыя рашэнні кладуць у папку, дзе яны і застаюцца. Пытаюся неяк у старшыні сельскага Савета: «А адказным асобам вы іх дасылалі?». «Ды не, — гаворыць. — Яны ж і так ведаюць, што трэба рабіць...». Паставіць задачы — гэта толькі частка справы. Далей неабходна кантраляваць іх выкананне. А каб выканаўцы не забылі пра ўскладзеныя на іх абавязкі, у іх на руках павінна быць ваша рашэнне.

— Часам тэрмін выканання даводзіцца павялічваць, бо не ўсё і не заўсёды залежыць ад нашых магчымасцяў, — кажа Алена Ганчар. — У такім выпадку мы інфармуем раённыя ўлады. Балазе, зрабіць гэта цяпер стала прасцей — старшыні сельскіх Саветаў раз на тыдзень прысутнічаюць на планёрных пасяджэннях райвыканкама, куды запрашаюцца і прадстаўнікі раённых службаў. Шэраг пытанняў можна вырашыць там жа, на месцы, — напрыклад, з электрасеткамі або службамі ЖКГ.

Дарэчы, ЖКГ — той аб'ект, пытанні да якога ўзнікаюць з зайздросным пастаянствам. Сёння, напрыклад, заключаюцца дагаворы з насельніцтвам на вываз бытавых адходаў. Працэс гэты няпросты ў першую чаргу з арганізацыйнага пункту гледжання. А таксама з... псіхалагічнага. Вясковае насельніцтва спакон веку выкідвала смецце на звалкі, якія само ж і стварала, — там, дзе было зручна. Цяпер несанкцыянаваным звалкам аб'яўлена вайна, прычым, на ўсёй тэрыторыі Мінскай вобласці. У кожным раёне застанецца некалькі акультураных палігонаў. Што датычыцца канкрэтна Вясейскага сельсавета, тут, паводле слоў кіраўніка мясцовай улады, усе населеныя пункты «падключаны» ўжо да цэнтралізаванага вывазу бытавых адходаў. Гэта (без усякага перабольшвання) задавальненне каштуе для вяскоўца ўсяго 1470 рублёў у месяц. Так што нават дачнікі заключаюць дагаворы. Але папярэдне кіраўніку сельскага Савета разам з актывам давялося абысці ў тым жа аграгарадку Вясея практычна кожнае домаўладанне. Плаціць за цэнтралізаваны вываз пагаджаліся не ўсе і не адразу. Па-першае, з прынцыпу: маўляў, навошта плаціць за тое, што я магу зрабіць сам і бясплатна? Па-другое, не ўсе верылі, што «працэс» будзе сапраўды адладжаны як след. І толькі пасля асабістых гутарак з кожным гаспадаром падворка (на што старшыня сельскага Савета не шкадавала часу) справа скранулася з месца.

Цікавым досведам наконт таго, як без вялікіх укладанняў добраўпарадкаваць сваю тэрыторыю, падзяліўся **старшыня Слуцкага раённага Савета дэпутатаў Віктар РАЖАНЕЦ**. Па яго прапанове 15 раённых школ пагадзіліся прыняць удзел у месячніку па ачыстцы тэрыторыі сельскіх населеных пунктаў. Змагаючыся за паабяцаныя пераможцам (1-е, 2-е і 3-е месцы) камп'ютар, музычны цэнтр і паездку ў музей старадаўніх народных рамёстваў «Дудуткі», школьнікі сабралі больш за 2 тоны (!) пластыкавых бутэлек, 300 кг шкла і 350 кг цэлафану...

**(Заканчэнне на 2-й стар. «МС»)**

## Новыя тэхналогіі — у працэс кіравання

**Упершыню ў новым фармаце прайшло пасяджэнне Брэсцкага аблвыканкама. На гэты раз старшыні гарадскіх і раённых выканаўчых камітэтаў не прыязджалі ў Брэст, а знаходзіліся на сваіх рабочых месцах. Побач з імі былі кіраўнікі сельгаспрадпрыемстваў і іншых арганізацый. Размова вялася з дапамогай відэасувязі.**

Абмеркаванне надзённага пытання павышэння эфектыўнасці жывёлагадоўчай галіны атрымалася вельмі шырокім і грунтоўным. Адказ за агрэхі і правалы трымалі не толькі старшыні райвыканкамаў і іх намеснікі па сельскай гаспадарцы, але і кіраўнікі канкрэтных гаспадарак. Жорсткай крытыцы была падвергнута жывёлагадоўчая галіна шэрагу гаспадарак Камянецкага, Бярозаўскага, Кобрынскага раёнаў. Пасля тлумачэння, якое давалі службовыя асобы наконт прычын зніжэння паказчыкаў у племянной рабоце, узнаўленні статка і павелічэння яго колькасці, разам акрэслілі шляхі выпраўлення становішча і вызначылі кантрольныя тэрміны.

Вельмі відовішчным і пераканаўчым атрымаўся даклад па апошнім пытанні парадку дня: «Аб навядзенні парадку на зямлі, у тым ліку на механізаваных дварах і фермах». Кожны выпадак нядбайнасці ў справе добраўпарадкавання тэрыторыі фермы, мехдвара, іншага аб'екта ўбачыла з дапамогай слайдаў уся вобласць. Апраўданні наконт таго, што за апошнія гады на гэтым шляху зроблена вельмі многа, да ўвагі не бралія. Старшыня аблвыканкама Канстанцін Сумар адзначыў, што ў кампаніі навядзення парадку на зямлі сапраўды зроблена многа, і катэгарычна запатрабаваў давесці справу да канца, каб не было соромна за гурбу смецця ці плешку бур'яну нават у добрым калгасе.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# ШТО Ў ПРАЕКЦЕ?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Хто-хто, а эколагі дакладна павінны сказаць дзецям «дзякуй». Дарэчы ў іх яшчэ з'явіцца такая магчымасць — ініцыяванае раённымі ўладамі спаборніцтва паміж школамі будзе доўжыцца ўвесь наступны год.

Удзельнікам выязных практычных заняткаў было што абмеркаваць і ў іншым — Казловіцкім сельсавеце. Закранулі «балючую» тэму: арганізацыю збору лішкаў малака.

— На самым пачатку, калі мы толькі пачалі займацца гэтай справай, яна прыносіла прыбытак, прычым адчувальны, — узгадаў **старшыня Казловіцкага сельскага Савета дэпутатаў Анатоль ТАРАСАЎ**. — Пагалоўе насельніцкага статка было вялікае — больш за 800 кароў, прычым падаткаў за збор малака з нас не бралі. Праз 2—3 гады сітуацыя змянілася: статак зменшыўся, а мы пачалі плаціць падаткі. Не абышлося і без «дапамогі» некаторых кіраўнікоў сельгаспрадпрыемстваў, якім не падабалася, што людзі «адцягваюць увагу» на ўласную гаспадарку: аднаму не дадалі сена, другому не выдзелілі пашу... Паспрабуй пры такіх умовах трымаць жывёлу.

Сёння, сцвярджаюць практыкі, сельвыканкамам няма ніякага сэнсу займацца зборам лішкаў малака, калі колькасць кароў на падворках не дацягвае хаця б да сотні, — нерэнтабельна, стратна. Таму ў Слуцкім раёне гэтыя абавязкі паступова пераходзяць да сельгаспрадпрыемстваў. А сельсаветы, дзе засталіся адносна прыстойныя статкі, можна пералічыць па пальцах. Тым больш нетыповай на гэтым фоне выглядае сітуацыя ў Ленінскім сельсавеце, які апошнім часам «прырос» на дзве каровы.

— Нічога дзіўнага, — патлумачыў Віктар Ражанец. — На тэрыторыі сельсавета знаходзіцца гаспадарка «Падлессе», кіраўнік якой трымае на сваім уласным падворку некалькі кароў і не па чутках ведае пра ўсе клопаты і патрэбы, якія адсюль вынікаюць. А таму і вяскоўцам у гэтай справе імкнецца дапамагчы. Вось яны і набываюць жывёлу.

Факт, што называецца, гаворыць сам за сябе...

## Святлана ГЕРАСІМОВІЧ, старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў:

# «ВУЧЫЦЦА «АЗАМ» КІРАВАННЯ НІКОЛІ НЕ ПОЗНА»

— Сёння на тэрыторыі вобласці працуе 281 сельскі Савет дэпутатаў і, адпаведна, столькі ж кіраўнікоў пярвічных органаў улады. 90 з іх занялі свае пасады зусім нядаўна. Зразумела, не ўсё і не ва ўсіх атрымліваецца адразу, ды гэта і не кожнаму дадзена — быць не толькі дэ-юрэ, але і дэ-факта кіраўніком тэрыторыі. Таму вучыцца і вучыць «азам» кіравання неабходна заўсёды — і на абласным узроўні, і на раённым. З гэтай мэтай яшчэ ў мінулым скліканні мы пачалі праводзіць выязныя сесіі абласнога Савета — такая форма прыжылася і існуе да гэтага часу. Выязныя сесіі рыхтуюцца вельмі скрупулёзна: ствараецца працоўная група, якая наведвае вызначаны раён, вывучаюцца вынесеныя на сесію пытанні. Задзейнічаны і старшыні сельскіх Саветаў тэрыторыі, і старэйшыны, і дэпутаты розных узроўняў — кожны робіць справаздачу пра тое, што зроблена менавіта ім для вырашэння ўзнятай праблемы. З аднаго боку, гэта дысцыплінуе, працуе на лепшы вынік, з іншага — перадаецца вопыт.

Ужо не першы год у вобласці праводзяцца адзіныя Дні дэпутата, прысвечаныя пэўнай тэматыцы (напрыклад, падрыхтоўцы бацькоў і дзяцей да новага навучальнага года). Летась з дапамогай сельскіх Саветаў і іншых уладных структур жыхары вобласці — у першую чаргу малаабароненыя катэгорыі — атрымалі 23 тыс. кубаметраў бясплатнага паліва. Сельвыканкамы арганізоўвалі працу на месцах, ляснгас займаўся нарыхтоўкай, а дастаўку «падзялілі» паміж сабой сельгаспрадпрыемствы, дарожныя службы і ЖКГ. Сёлета, у адпаведнасці з даручэннем губернатара, мы зноў вярнуліся (у тым ліку і ў межах Дня дэпутата) да пытання забеспячэння насельніцтва дровамі. У першую чаргу гэта датычыцца інвалідаў, малазабяспечаных грамадзян, пенсіянераў, якія не працуюць. Працэс, як той казаў, пайшоў. Цяпер кожны панядзелак атрымліваем інфармацыю пра тое, як працуюць у гэтым кірунку раёны або асобныя сельсаветы. Скажу шчыра: летась было больш складана, узнікала шмат непаразуменняў, разыходжанняў… Сёлета многія спрэчныя моманты ўрэгуліраваліся. А інакш і быць не магло — справа ж робіцца вартая. Сэнс яе заключаецца не толькі ў колькасці кубаметраў выдзеленых дроў, — людзям важна адчуць увагу ўлады.

Сёння ў іншых абласцях пераймаюць і наш вопыт правядзення планёрных пасяджэнняў пры старшынях сельвыканкамаў. Адзін-два разы на месяц яны збіраюць у сябе кіраўнікоў усіх мясцовых установ, прадпрыемстваў, службаў, каб, так бы мовіць, «зверыць гадзіннікі». Гэта зусім не азначае, што нехта да некага ходзіць «на паклон». Паміж старшынёй сельскага Савета і кіраўніком таго ж сельгаспрадпрыемства павінна існаваць як мінімум узаемаразуменне — тады і надзённыя пытанні тэрыторыі можна вырашаць, нават не выходзячы на больш высокі ўладны ўзровень. Ёсць выдатныя прыклады такога ўзаемадзеяння на пярвічным узроўні, у чым я неаднойчы ўпэўнівалася.

Увогуле, формы нашай працы могуць быць рознымі, але аб'ядноўвае іх адно: у цэнтры ўвагі заўсёды застаецца чалавек з яго зямнымі праблемамі. Ад гэтага і адштурхоўваемся.

**Наталля КАРПЕНКА.**
*Слуцкі раён.*

# РЭЦЭПТ ПОСПЕХУ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

## Універсальная камісія

Адна з праблем, актуальная літаральна для кожнага сельсавета не толькі Гомельшчыны, але і ўсёй краіны, — гібель людзей на пажарах. Галоўная прычына ўзнікнення пажараў — парушэнне правілаў бяспекі пражывання (выкарыстанне няспраўнай печкі, электраправодкі, курэнне ў ложку і г.д.). Для выпраўлення сітуацыі на Гомельшчыне ў кожным раёне стварылі аглядныя камісіі з прадстаўнікоў усіх раённых структур, якія наведваюць хаты тых, хто знаходзіцца ў сацыяльна небяспечным становішчы (неўладкаваных сем'яў, пітушчых непрацуючых грамадзян, адзінокіх старых і г.д.). У камісію ўваходзяць прадстаўнікі МНС, сельвыканкама, сацыяльнай службы, медыцыны, адукацыі і г.д. Кожны правярае ўмовы пражывання па сваім профілі, выяўляе пэўныя праблемы і знаходзіць шляхі іх вырашэння. Гэта ўжо не толькі прафілактыка пажараў, а комплексны аналіз. Падчас наведвання можа, напрыклад, высветліцца, што гаспадар хаты апынуўся ў цяжкай фінансавай сітуацыі, не ў стане самастойна ўладкавацца на працу і г.д. Тады падключаецца сацыяльная служба, чалавеку аказваецца матэрыяльная дапамога, падтрымка ў працаўладкаванні.

Новаўвядзенне ўкаранялася вельмі складана, прызналася Марыя Бондар, аднак яно было таго вартае. Ужо абследавана больш за 42 тысячы домаўладанняў, складзена амаль столькі ж прадпісанняў, дзе прадугледжаны мерапрыемствы, якія трэба рэалізаваць для таго, каб зрабіць больш бяспечнымі ўмовы пражывання жыхароў сельсаветаў. Прыблізна 40 працэнтаў неабходных мерапрыемстваў было выканана ў самы кароткі тэрмін. Большасць парушэнняў, выяўленых аглядамі камісіямі, ужо выпраўлена.

Адна з распаўсюджаных праблем — няспраўныя печы. Зразумела, што большасць пажылых людзей не будзе ў такой сітуацыі перакладаць печ, спадзеючыся, што трагедыі ў іх хаце не здарыцца.

— У нас каля 1800 печак трэба было прывесці ў парадак, — расказала старшыня аблсавета, — з іх 1500 ужо ўпарадкаваны, 300 — у завяршальнай стадыі (на гэтыя мэты сёлета з абласнога бюджэту дадаткова было выдзелена звыш 500 мільёнаў рублёў). Аднак ёсць сярод гаспадароў няспраўных печак і тыя, хто павінен правесці рамонт за ўласныя сродкі. Дзяржава падстаўляе плячо толькі слаба абароненым катэгорыям (малазабяспечаным, інвалідам і г.д.).

Дзейнасць аглядных камісій не фармальная, а рэальная, падкрэсліла старшыня аблсавета. Часам некаторым з іх даводзіцца прымаць самыя нестандартныя рашэнні.

— У кожным сельскім Савеце вядзецца ўлік грамадзян працаздольнага ўзросту, якія не працуюць. І далёка не ўсе яны маюць жаданне некуды ўладкоўвацца. Сёлета мы ў кожным сельсавеце з ліку такіх дармаедаў стварылі брыгады па добраўпарадкаванні. Нас за гэта многія крытыкавалі, маўляў, не асабліва яны там напрацуюць, але мы як улада павінны разумець, што тут і выхаваўчы момант прысутнічае. Няхай прымусова, у суправаджэнні міліцыі, але чалавек усё ж заробіць сабе на кавалак хлеба.

## Кожны дзень — па адзінцы тэхнікі

Закрануўшы тэму добраўпарадкавання, Марыя Андрэеўна пагадзілася з прысутнымі, што за тыя сродкі, якія прадугледжаны ў бюджэце сельвыканкама, вырашыць усе праблемы тэрыторыі немагчыма. Вобласць падтрымлівае пярвічны ўзровень фінансава (сёлета на гэта дадаткова было выдаткавана каля 15 млрд рублёў). Аднак пачынаць навядзенне парадку трэба з будынка сельскага Савета, бо гэта — твар улады. Не меншай увагі заслугоўвае і асабісты падворак старшыні сельскага Савета. Паколькі ён — гаспадар на тэрыторыі сельсавета, то першым павінен паказваць прыклад, у тым ліку ў плане добраўпарадкавання. Яго падворак павінен быць узорным. Гэта ж тычыцца кіраўнікоў мясцовых СВК і ўсіх іншых бюджэтных арганізацый, якія месцяцца на тэрыторыі сельсавета.

На Гомельшчыне, як і ў іншых абласцях, вёскі старэюць, колькасць жыхароў змяншаецца, што абумоўлівае павелічэнне колькасці пустуючых хат і зямельных участкаў ля іх. На плячах кожнага старшыні сельскага Савета Гомельшчыны «вісіць» ад 50 да 100 га такіх кінутых земляў, якія неабходна рэкультываваць і перадаць гаспадаркам. Для гэтага на ўзроўні вобласці было прынята рашэнне: штодзень кожнае сельскагаспадарчае прадпрыемства павінна прадаставіць адзінку тэхнікі старшыні свайго сельскага Савета для правядзення работ па добраўпарадкаванні. Не ўсюды проста гэта ажыццяўлялася на практыцы, асабліва падчас уборачнай кампаніі, але працэс пайшоў. І сёння ў сельгасзварот ужо вернута 7 тыс. га (прыблізная плошча дзвюх сярэдніх па памерах гаспадарак).

...У канцы свайго выступлення Марыя Андрэеўна параіла прысутным часцей абапірацца ў працы на сваіх дэпутатаў.

— Актыўнасць дэпутацкага корпуса наўпрост залежыць ад ініцыятыўнасці самога старшыні Савета. Калі старшыня зацікаўлены ў гэтым, ён будзе пастаянна заахвочваць дэпутатаў да ўдзелу ў вырашэнні праблем тэрыторыі і заўсёды будзе бачыць станоўчыя вынікі сумесных намаганняў. Апроч таго, у вас павінна быць наладжана, так бы мовіць, агрэсіўная работа з дэпутатамі ўсіх узроўняў, паколькі дэпутаты і раённага, і абласнога ўзроўню маюць высокія патэнцыйныя магчымасці. Калі мы ўсе аб'яднаем намаганні, то любыя задачы вырашаць будзе значна прасцей.

# ТОЛЬКІ Б ПРЫХОДЗІЛІ ЛЮДЗІ!

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Прапусціць прыезд аўталаўкі не хочацца нікому з мясцовых жыхароў. Не паспеў — і застаўся без духмянага хлеба, свежага малака і смятаны. А бывае, і самі жыхары не могуць дайсці да аўталаўкі: гады не тыя, ногі не ходзяць. Добра, калі дапамагаюць суседзі. Васьмідзесяцігадовая Валянціна Мікалаеўна Кавалёнак ужо некалькі гадоў ходзіць сюды з дзвюма «торбамі»: у адной руцэ — для сябе, у другой — для суседа-інваліда.

Калі такіх добрых суседзяў няма, працаўнікі аўталаўкі самі наведваюць бабулек-дзядуляў — бяруць спіс прадуктаў, грошы, купляюць усё і прыносяць у хату. А калі пакупкі цяжкія (напрыклад, мех цукру ці мукі), без дапамогі Міхаіла Якаўлевіча не абысціся ніяк.

Сёння машына вязе шмат заказаў — мяхі з камбікормам, 50 банак канцэнтраванага малака, крупы, бананы і селядцы.

— Патрэбны гумовыя боты — калі ласка, вось вам боты. Закажуць халат — вось вам і халат. Лямпачкі, сшыткі, шкарпэткі... Нават бульбу ў вёскі прывозім! — пералічвае Ірына.

— І тарты, — дадае Міхаіл Якаўлевіч. — Апошні — трохкілаграмовы, прывозілі на юбілей. Піражкі, коржыкі заказваюць. А мы вязём усё, што душа пажадае!

— Малайцы! — не ўтрымліваюся.

— Стараемся, — сціпла ўсміхаецца Ірына. — Толькі б прыходзілі людзі!

**Фота аўтара.**
*Мінскі раён.*

## АД СЕЛЬСКАГА БІЗНЭСУ...

**Зараз у аграгарадках Віцебскай вобласці ажыццяўляюць дзейнасць каля 2,3 тысячы суб'ектаў прадпрымальніцкай дзейнасці. Па выніках іх работы за дзесяць месяцаў бягучага года сума выплачаных імі падаткаў склала больш за 34 мільярды рублёў, што на 14,5 мільярда рублёў больш, чым у аналагічным перыядзе мінулага года.**

Паводле інфармацыі Віцебскай абласной падатковай інспекцыі, рост падатковых плацяжоў суб'ектаў, якія працуюць у аграгарадках, адзначаецца ў сферы дзейнасці, звязанай з гандлем, тэхнічным абслугоўваннем і рамонтам аўта- і мотатэхнікі — больш чым у шэсць разоў, аперацыямі з нерухомай маёмасцю (тэмп росту — 175 працэнтаў), вылічальнай тэхнікай (156 працэнтаў), а таксама ў выдавецкай і паліграфічнай дзейнасці, вытворчай дзейнасці, арганізацыі адпачынку і забаў.

Пры гэтым у такіх сферах, як будаўніцтва і рознічны гандаль, аб'ём плацяжоў знізіўся і склаў адпаведна 89 і 70 працэнтаў да ўзроўню студзеня—кастрычніка мінулага года.

На развіццё бізнэсу ў глыбінцы, безумоўна, станоўча ўплывае тое, што тым, хто ажыццяўляе гаспадарчую і іншую бізнэс-дзейнасць у малых і сярэдніх гарадскіх паселішчах, заканадаўства дае шырокі пералік ільгот і прэферэнцый.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## СУСЕДЗІ — ЗА ЗДАРОВЫ ЛАД ЖЫЦЦЯ

**На тэрыторыі гродзенскай гімназіі № 2 прадугледжана будаўніцтва стадыёна, які будзе адпавядаць еўрапейскім стандартам.**

Гэта стане магчымым дзякуючы сумеснаму праекту «Прапаганда здаровага ладу жыцця ва ўстановах адукацыі Літвы і Беларусі» ў рамках праграмы трансгранічнага супрацоўніцтва. Дарэчы, партнёры па гэтым праекце, гімназіі з Гродна і літоўскага горада Алітуса, ужо добра знаёмыя па культурных імпрэзах і спартыўных спаборніцтвах.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

## ИНФОРМАЦИЯ
## о проведении повторного аукциона без условий по продаже имущества, обращенного в доход государства

| | |
|---|---|
| **Адрес объектов и их наименование** | **Здание конторы** общей площадью 308 кв. м, 102 627 000 руб.<br>**Здание проходной** — 3 321 000 руб.; расположенные по адресу: Минская обл., г. Вилейка, ул. Стахановская, 225.<br>Шаг аукциона 5% от предыдущей цены. |
| **Продавец** | Комиссия по работе с имуществом, обращенным в доход государства при Вилейском районном исполнительном комитете |
| **Организатор аукциона** | СИКУП «УКС-СЕРВИС»<br>г. Молодечно, ул. Мира, 15 |
| **Сумма задатка** | **10%** от начальной цены<br>на р/с 3012190930030 в отделении 932<br>ОАО «Белинвестбанк», г. Молодечно,<br>код 739, УНН 600182305, ОКПО 04064333,<br>получатель: СИКУП «УКС-СЕРВИС». |
| **Порядок оплаты** | Оплата в размере цены продажи объекта<br>(за вычетом задатка) в течение 2 месяцев<br>и 25 дней на р/с СИКУП «УКС-СЕРВИС» |
| **Документы, представляемые для участия в аукционе** | Заверенную банком копию платежного документа, подтверждающего внесение задатка; юридическим лицам — копию учредительных документов и свидетельства о регистрации, заверенные нотариально, доверенность, выданная представителю юридического лица; физическим лицам — паспорт или иной документ, удостоверяющий личность |
| **Конечный срок и адрес приема заявок** | **12.12.2011 г. до 16.00**<br>г. Молодечно, ул. Мира, 15, каб. 1,<br>СИКУП «УКС-Сервис»,<br>тел.: (8 0176) 73 00 13, 75 16 09,<br>(факс) 75 19 20, моб. 8 044 710 74 60 |
| **Дата, время и место аукциона** | **13.12.2011 г. в 15.00**,<br>г. Молодечно, ул. Мира, 15, каб. 1 |

## ИНФОРМАЦИЯ
## о проведении повторного аукциона без условий по продаже имущества, обращенного в доход государства

| | |
|---|---|
| **Адрес объектов и их наименование** | • здание административно-хозяйственное общей площадью 127,9 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., г. Вилейка, ул. Фрунзе, 46. **Начальная цена: 95 580 000 белорусских рублей.** Шаг аукциона 5% от предыдущей цены;<br>• здание административного корпуса общей площадью 60,4 кв. м, здание склада общей площадью 89 кв. м, здание котельной общей площадью 122,3 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., г. Вилейка, ул. Фрунзе, 46. **Начальная цена: 115 614 000 белорусских рублей.** Шаг аукциона 5% от предыдущей цены;<br>• здание столярного цеха, общей площадью 1189,7 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., г. Вилейка, ул. Фрунзе, 46. **Начальная цена: 498 420 000 белорусских рублей.** Шаг аукциона 5% от предыдущей цены. |
| **Продавец** | Комиссия по работе с имуществом, обращенным в доход государства при Вилейском районном исполнительном комитете |
| **Организатор аукциона** | СИКУП «УКС-СЕРВИС»<br>г. Молодечно, ул. Мира, 15 |
| **Сумма задатка** | **10%** от начальной цены<br>на р/с 3012190930030 в отделении 932<br>ОАО «Белинвестбанк», г. Молодечно,<br>код 739, УНН 600182305, ОКПО 04064333,<br>получатель: СИКУП «УКС-СЕРВИС». |
| **Порядок оплаты** | Оплата в размере цены продажи объекта<br>(за вычетом задатка) в течение 2 месяцев<br>и 25 дней на р/с СИКУП «УКС-СЕРВИС» |
| **Документы, представляемые для участия в аукционе** | Заверенную банком копию платежного документа, подтверждающего внесение задатка; юридическим лицам — копию учредительных документов и свидетельства о регистрации, заверенные в установленном порядке, доверенность, выданная представителю юридического лица; физическим лицам — паспорт или иной документ, удостоверяющий личность |
| **Конечный срок и адрес приема заявок** | **12.12.2011 г. до 16.00**<br>г. Молодечно, ул. Мира, 15, каб. 1, СИКУП «УКС-Сервис», тел. (8 0176) 73 00 13, 75 16 09, (факс) 75 19 20, моб. 8 044 710 74 60 |
| **Дата, время и место аукциона** | **13.12.2011 г. в 15.00,**<br>г. Молодечно, ул. Мира, 15, каб. 1 |

Утерянные бланки страховых полисов серии НС № 0223726, 0233548, 0233732, 0233758, 0235106, 0235548-0235550, 0238695, 0240437, 0240597-0240598, 0240606, 0240630, 0243201, 0243211, 0246217, 0247049, 0254548, 0255103, 0255385, 0258256, 0260334, 0261577; Серии ББ №№ 0157550; Квитанция 1-СУ серии КС №№ 3282304, принадлежащие ОАСО «Би энд Би иншуренс Ко», считать недействительными.

*УНП 101063229*

## УЗДЕНСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ 15 декабря 2011 года

**в 10.00 в зале заседаний исполкома (4-й этаж), расположенного по адресу: г. Узда, ул. Советская, 22, проводит повторный открытый аукцион на право заключения договоров аренды земельных участков,**

**в 11.00 – открытый аукцион по продаже в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов,**

**в 12.00 аукцион по продаже земельного участка общей площадью 0,2052 для ведения подсобного хозяйства в д. Зеньковичи Узденского района (начальная цена продажи земельного участка 182 760 рублей).**

**На аукционные торги на право заключения договоров аренды выставляются следующие участки с начальной ценой:**

| № лота | Продавец | Местонахождение участка | S (га) | Кадастровый номер | Начальная цена (бел. руб.) | Расходы по подготовке (кроме расходов на публикацию извещения) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Лот № 1 | Узденский райисполком | Земельный участок:<br>г. Узда – ул. Новицкого, участок № 3 | 0,1389 | 625650100005000430 | 38 491 826 | 1 386 462 |

Целевое назначение участка – для строительства и обслуживания здания магазина. Участок свободен от строений. Инженерные коммуникации: имеется возможность подведения к газоснабжению, водоснабжению, водоотведению. Срок аренды земельного участка – 25 лет.

**На аукционные торги по продаже в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов выставляются следующие участки с начальной ценой:**

| № лота | Продавец | Местонахождение участка | S (га) | Кадастровый номер | Начальная цена (бел. руб.) | Расходы по подготовке (кроме расходов на публикацию извещения) (бел. рублей) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Лот № 1 | агрогородок Озеро Озерский с/Совет | д. Сороковщина, ул. Радужная, уч. № 8 | 0,2500 | 625682510101000053 | 53 000 000 | 84 000 |
| Лот № 2 | Лошанский с/Совет | д. Кривели, ул. Школьная, уч. № 3 | 0,1525 | 625681308601000071 | 40 000 000 | 1 928 230 |
| Лот № 3 | Лошанский с/Совет | д.Кривели, ул. Школьная, уч. № 5 | 0,1537 | 625681308601000072 | 40 000 000 | 1 894 240 |
| Лот № 4 | Лошанский с/Совет | д. Кривели, ул. Школьная, уч. № 7 | 0,1525 | 625681308601000073 | 40 000 000 | 1 894 240 |
| Лот № 5 | Лошанский с/Совет | д. Кривели, ул. Школьная, уч. № 9 | 0,1398 | 625681308601000074 | 35 000 000 | 1 894 240 |
| Лот № 6 | Лошанский с/Совет | д. Кривели, ул. Школьная, уч. № 11 | 0,1418 | 625681308601000075 | 37 000 000 | 1 894 240 |
| Лот № 7 | Лошанский с/Совет | д. Кривели, ул. Школьная, уч. № 13 | 0,1422 | 625681308601000076 | 37 000 000 | 1 894 240 |

Целевое назначение участков – для строительства и обслуживания жилого дома.

К участку, расположенному по адресу: д. Сороковщина Озерского сельского Совета, имеется возможность подключения к газоснабжению и водоснабжению. Участки в д. Кривели находятся в живописном месте рядом с Лошанским водохранилищем, имеется возможность подключения к водоснабжению.

Задаток в размере 10 процентов от начальной цены земельного участка перечисляется путем безналичных расчетов платежным поручением (квитанцией) на счет 3602631002502 финансового отдела Узденского райисполкома в филиале 606 ОАО «Беларусбанк» г. Дзержинска, МФО 153001514, УНП 600203994, код платежа на право заключения договоров аренды 04002, код платежа по продаже земельных участков в частную собственность 04901. Граждане, индивидуальные предприниматели и юридические лица, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задаток в размере, установленном для предмета аукциона с наибольшей начальной ценой.

Заявления на участие в аукционе с необходимыми документами принимаются по адресу: г. Узда, ул. Советская, 22, второй этаж, кабинет 210 с 8.00 до 17.00 по рабочим дням с 5 декабря по 9 декабря 2011 года включительно.

Заключительная регистрация – с 8.30 до 9.55 в день проведения аукциона.

Участники аукциона должны представить следующие документы:

• заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков;

• заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц представляют документ, удостоверяющий личность.

Аукцион состоится по каждому лоту при наличии не менее двух участников.

Оплата победителем за предмет аукциона производится разовым платежом путем безналичных расчетов.

Победителю за предмет аукциона необходимо произвести возмещение фактических расходов по организации и проведению аукциона и подготовке документации для его проведения.

Участники аукциона предварительно могут ознакомиться с земельными участками, которые предлагаются для продажи на аукционе путем выезда к месту нахождения этих участков.

Более подробная информация об аукционах, условиях участия размещена на официальном сайте Узденского районного исполнительного комитета: www.uzda.minsk-region.by, либо по телефонам: (801718) 55404, 54705, 55342.

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Установа «Рэдакцыя газеты «Звязда»
**Галоўны рэдактар**
**КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.**
**Адказная за выпуск КАРПЕНКА Наталля.**
Грамадскі савет: **НАВІЦКІ Г.В.**, старшыня Пастаянай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **БАЙКОЎ В.М.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **АЦЯСАЎ А.Я.**, старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў; **СЦЕПАНЕНКА А.М.**, адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **ПРЭДКА С.У.**, старшыня Ваўкавыскага раённага Савета дэпутатаў Гродзенскай вобласці; **МАКСІМЕНКА С.А.**, старшыня Азярыцка-Слабадскога сельскага Савета дэпутатаў.
**АДРАС РЭДАКЦЫІ:** 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН:** 292 21 03;
**e-mail:** info@zvyazda.minsk.by
**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**
**Тыраж 33.380. Нумар падпісаны ў 19.30 30 лістапада 2011 года.**

# «СТРАТЭГІЧНАЯ МЭТА ВЫБРАНА ПРАВІЛЬНА — ІНАВАЦЫІ»

**ПРАБЛЕМЫ інавацыйнага прадпрымальніцтва, а таксама іх прычыны і шляхі вырашэння абмеркавалі падчас «круглага стала» прадстаўнікі бізнэсу, інфраструктуры падтрымкі прадпрымальніцтва, дзяржаўных органаў, а таксама замежныя спецыялісты. А такіх праблем, як высветлілася падчас дыскусіі, сапраўды назапасілася. Праўда, аптымізм выклікае той факт, што прадстаўнікі і дзяржорганаў, і інкубатараў, і бізнэс-асяроддзя гэтыя праблемы прызнаюць і гатовы іх разам вырашаць.**

— Практыка паказвае, што ўсё на гэтай зямлі вырашаюць людзі, прычым не проста людзі, а носьбіты актуальных ведаў. І калі паглядзець на стан інавацыйнай сферы ў Беларусі, то мы бачым, як мала людзей, якія рэальна па сваёй унутранай энергетыцы, па сваёй кампетэнтнасці здольныя ініцыяваць дастаткова сур'ёзныя, прарыўныя інавацыйныя праекты, — мяркуе **Дзмітрый КРУПСКІ, начальнік упраўлення навукі і інавацыйнай палітыкі Міністэрства эканомікі**.

Ён прывёў цікавыя лічбы: у 2008 годзе ў Беларусі налічвалася каля трохсот малых інавацыйных прадпрыемстваў, дзе было занята 1500 чалавек персаналу. Але калі паглядзець на звесткі, напрыклад, 1992 года, то ў той час такіх прадпрыемстваў налічвалася 2400, і ў іх было занята каля 21 тысячы чалавек. Што тычыцца статыстыкі вынаходніцкай актыўнасці, то тут паказчыкі яшчэ больш цікавыя: у 1989 годзе заявак на патэнтаванне (праўда, як адзначыў Дмітрый Крупскі, яны ў той час па-іншаму называліся) было пададзена каля 5 700, а ў 2010 годзе — каля 1200. І гэты пры тым, кажа прадстаўнік Мінэканомікі, што за апошнія 20 гадоў краіны сусветнага тэхналагічнага авангарду зрабілі сур'ёзныя крокі па распаўсюджванні тэхналогій 5-га тэхнаўкладу.

— У той час, калі пайшла перабудова, быў бум прадпрымальніцтва. Ва ўніверсітэтах дзясяткамі ствараліся інавацыйныя прадпрыемствы, — узгадвае **Васіль МАЛАЧКОЎ, генеральны дырэктар ЗАТ «Тэхналагічны парк «Магілёў»**. — Была атмасфера прадпрымальніцтва, было ўсё дазволена. А потым, калі пачалі рабіць законы, пачалі хадзіць кантралёры і правяраць — вось гэты дух прадпрымальніцтва выбілі з універсітэтаў. Я калісьці быў прарэктарам па навуковай працы, я ўзяў на сябе рызыку — і ў нас было каля 30-40 прадпрыемстваў. Сутарэнні ажылі, лабараторыі ажылі. А паглядзіце сёння! Я вось на выставе інавацыйных праектаў задаў пытанне ўніверсітэцкім супрацоўнікам: а можа, вы б стварылі прадпрыемства ў ВНУ? А яны мне адказваюць — не. І я іх разумею: гэта ніводнаму рэктару не патрэбна, бо там адказнасць, абмежаванні і іншае.

Таксама Васіль Малачкоў мяркуе, што трэба даць больш свабоды і бізнэс-інкубатарам, тэхнапаркам — не трэба рэгламентаваць іх дзейнасць ад «А» да «Я». Бо толькі яны самі, непасрэдна працуючы з новымі прадпрыемствамі, могуць адчуць, як трэба дапамагаць у тым ці іншым выпадку:

— Права фарміравання палітыкі інкубавання павінна належаць самім суб'ектам інфраструктуры падтрымкі. Толькі мы ведам попыт і прапанову на рынку, узровень інавацыйнасці нашых кампаній. Толькі інкубатар ведае, што трэба і калі. Не трэба прапісваць у законе, што павінен рабіць інкубатар або тэхнапарк. Бо зробіш менш — пакараюць, зробіш больш — таксама пакараюць. Трэба даць больш свабоды.

Пры гэтым Васіль Аляксандравіч асабліва звярнуў увагу на тое, што нельга абмяжоўваць тэрміны, якія патрэбны бізнэсу для росту:

— Колькі гадоў трэба інкубаваць кампанію, каб яна выраслa? Безумоўна, тут трэба глядзець індывідуальна. Але калі казаць пра наш вопыт, то адной кампаніі спатрэбілася пяць гадоў для росту. Другой — 10 гадоў, але яна зараз выселілася і купіла будынак, у тры разы большы за наш тэхнапаркаўскі. А вось, напрыклад, у палажэнні аб інкубатарах малога прадпрымальніцтва запісана, што нельга заключаць дамову арэнды з кампаніямі, узрост якіх больш за 3 гады. І што? Гэта як з цяпліцы ўзяць кампанію і высадзіць на мароз...

## МЫ ЯШЧЭ НЕ НАВУЧЫЛІСЯ ПРАДАВАЦЬ ТОЕ, ШТО ВЫНАХОДЗІМ?

Відавочна, што сітуацыю трэба неяк мяняць і даць магчымасць інавацыйным праектам і прадпрыемствам развівацца. І гэта ў дзяржорганах разумеюць:

— Сёння нікому не трэба даказваць, што толькі пры аб'яднанні намаганняў дзяржсектара і прыватнага бізнэсу ёсць надзея на нейкі сінергетычны эфект. Сёння тыя рашэнні, якія будуць прыняты па пераводу сітуацыі ў прынцыпова новую стадыю, будуць мець лёсавырашальны характар для далейшага развіцця Беларусі як незалежнай дзяржавы, — сказаў Дзмітрый Крупскі.

Пры гэтым ён расказаў пра тыя крокі, якія Міністэрства эканомікі робіць у апошні час для вырашэння праблем і ліквідацыі недахопаў. У прыватнасці, Мінэканомікі сумесна з Дзяржаўным камітэтам па навуцы і тэхналогіях актыўна дапрацоўвала праект закона аб дзяржаўнай інавацыйнай палітыцы і дзейнасці. Па словах Дзмітрыя Мар'янавіча, у гэтым законапраекце ўпершыню павінен з'явіцца артыкул «Дзяржаўна-прыватнае партнёрства ў сферы інавацыйнай дзейнасці»:

— Калі ўсё будзе добра, то ёсць надзея, што ў нас закон, фундаментальны нарматыўны акт, будзе ўжо загадзя арыентаваць дзяржаву і бізнэс на супрацоўніцтва ў гэтай сферы.

Таксама прадстаўнік Мінэканомікі паведаміў, што ўжо падрыхтаваны праект канцэпцыі дзяржпадтрымкі малога і сярэдняга інавацыйнага прадпрымальніцтва на перыяды да 2015 і да 2020 гадоў. Адна з ключавых мер, якая тут закладзена, — гэта разгортванне сеткі суб'ектаў інфраструктуры падтрымкі прадпрымальніцтва, у тым ліку і інавацыйнага бізнэсу. Таксама Дзмітрый Крупскі расказаў, што гатовы праект указа, які ўводзіць два новыя інструменты фінансавай падтрымкі — інавацыйны ваўчар і гранты на камерцыялізацыю перспектыўных навукова-тэхнічных распрацовак. Магчыма, гэты дакумент будзе прыняты ў першай палове 2012 года:

— Тады для нашай краіны гэта будзе рэвалюцыя, бо тэзіс наконт права на рызыку і незваротны спосаб фінансавання будзе рэалізаваны практычна, — лічыць Дзмітры Крупскі.

Ён таксама адзначыў, што робяцца захады на заканадаўчым узроўні і для таго, каб забяспечыць кадравы патэнцыял для паспяховай інавацыйнай дзейнасці:

— У нас, напрыклад, ёсць шмат эканамістаў, юрыстаў і іншых спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй, але канкрэтнага спецыяліста падабраць амаль немагчыма. І перш за ўсё існуе вялікі дэфіцыт спецыялістаў у галіне інавацыйнай дзейнасці — тых жа спецыялістаў па кіраванні інавацыйнымі праектамі. Я зараз прайшоўся па выставе і спытаў: «А колькі каштуе ваш узор?». І з 7-8 чалавек толькі адзін чалавек, не капаючыся ў сваіх паперах, змог больш-менш выразна сказаць, колькі ж каштуе яго распрацоўка і за якую суму ён гатовы яе прадаць.

У нас захаваўся яшчэ савецкі падыход: калі мы маглі нешта вырабіць, а прададзім тое або не — гэта ўжо было другасным.

## РАЗАМ ДЗВЮХ САРОК ЗА ХВОСТ НЕ ЎТРЫМАЕМ?

Цікавую думку выказаў **Георгій ГРЫЦ, кандыдат эканамічных навук, прафесар Інстытута бесперапыннай адукацыі БДУ** — ён мяркуе, што Беларусі не трэба распыляцца, а выбраць нейкую адну-дзве галіны і ўсе намаганні прыкласці на іх развіццё. У якасці прыкладу ён супаставіў прыярытэтныя кірункі навуковых даследаванняў у Беларусі і ў краінах Еўрасаюза: іх спектр практычна ідэнтычны, але фінансавых сродкаў у ЕС на гэта выдзяляецца нашмат больш:

— Якую з гэтага можна зрабіць выснову? Тыя мэты, якія мы ставім, не адпавядаюць рэаліям — яны не забяспечаны рэсурсамі. Як мы можам канкураваць? Мне падаецца, што на паверхні ляжыць дастаткова простае рашэнне: Беларусь — маленькая краіна, таму наша функцыя — не канкураваць з Амерыкай, Германіяй, а знайсці свой узровень, адваяваць сваю нішу. І ў гэтым выпадку тыя нешматлікія рэсурсы, якія ёсць, трэба сканцэнтраваць на вызначаных прыярытэтах. І тады гэтых 3-5 мільярдаў долараў, якія выдзяляюцца штогод, хопіць для стварэння некалькіх высокатэхналагічных сучасных вытворчасцяў — і яны будуць нам рабіць экспарт на мільярды долараў.

Пры гэтым Георгій Грыц адназначна перакананы ў важнасці інавацый, бо сёння трэба адыходзіць ад сыравіннай эканомікі, ад традыцыйнай эканомікі з высокай дадатковай вартасцю імпарту. Па яго меркаванні, менавіта інавацыйныя кампаніі маюць максімальную дадатковую вартасць і, адпаведна, высокую рэнтабельнасць.

— Так што, у прынцыпе, стратэгічная мэта выбрана правільна — інавацыі. Я мяркую, што менавіта інавацыі шмат у чым выратуюць нашу эканоміку, наш суверэнітэт.

**Павел БЕРАСНЕЎ.**

**Сёння — Сусветны дзень барацьбы са СНІДам**

## КАЛІ «0» БОЛЬШ ЗА «1»

**«Імкнуцца да нуля новых інфекцый, нуля дыскрымінацыі і нуля смерцяў ад СНІДу» — тэма сёлетняга Сусветнага дня. У новай стратэгіі ЮНЭЙДС на 2011-2015 гады, якая называецца «Імкненне да нуля», вобразна ўказваецца на тое, што «нуль» азначае часам больш, чым «адзінка».**

Пачаўшыся летам у Мінску, інфармацыйна-асветніцкая кампанія «Каханне — гэта простыя рэчы! Такія, як тэст на ВІЧ» працягнулася ў Гомелі, Светлагорску, Салігорску і Лідзе, а 1 снежня адбудзецца ў Мазыры. Галоўная задача акцыі — данесці да маладых людзей інфармацыю аб тым, што ў ВІЧ-пазітыўных бацькоў могуць нарадзіцца здаровыя дзеці. Пры ўмове, што партнёры будуць ведаць свой статус і своечасова пачнуць спецыяльную тэрапію. Такім чынам, да 2015 года ў Беларусі плануецца знізіць рызыку перадачы ВІЧ ад маці дзіцяці да менш як 2 працэнтаў. Дарэчы, з 1987 года ад ВІЧ-інфіцыраваных маці нарадзіліся 1 922 дзіцяці. Дыягназ ВІЧ-інфекцыі пацверджаны 198 дзецям, 9 з якіх памерлі. Усяго ў краіне сярод дзяцей да 14 гадоў зарэгістраваны 213 выпадкаў ВІЧ-інфекцыі.

1 снежня пройдзе акцыя і для вадзіцеляў далёкага накіравання. Падчас акцыі запланавана распаўсюджванне буклетаў і чырвоных стужак, тэматычныя лекцыі. У Мінску сёння пройдзе звыш 130 тэматычных мерапрыемстваў.

На 1 лістапада ў Беларусі зарэгістраваны 12 751 выпадак ВІЧ-інфекцыі. Сёлета выяўлены 992 новыя выпадкі, што на 13,8 працэнта больш, чым летась. У Гомельскай вобласці зарэгістраваны 6 363 выпадкі, Мінску — 1 814, Мінскай вобласці — 1 732, Брэсцкай — 942, Магілёўскай — 721, Віцебскай — 660, Гродзенскай — 519. Абсалютная большасць ВІЧ-інфіцыраваных — ва ўзросце 15-29 гадоў. 47,7 працэнта інфіцыраваных заразіліся пры ўнутрывенным увядзенні наркатычных сродкаў, 49,7 працэнта — палавым шляхам (па звестках, пачынаючы з 1987 года). За 10 месяцаў гэтага года доля ін'екцыйнага ўвядзення наркотыкаў у выпадках заражэння склала 22 працэнты, палавым шляхам — амаль 75. Дыягназ СНІДу ўстаноўлены ўжо 2 951 пацыенту.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

### ЗАГІНУЛА АД САРДЭЧНАГА ПРЫСТУПУ?

**У Быхаве адбыўся пажар ў драўляным жылым доме, дзе пражывала 91-гадовая гаспадыня домаўладання з 62-гадовай кватаранткай. На жаль, абедзве яны загінулі...**

Калі на месцы з'явіліся першыя падраздзяленні МНС, унутры дома ўжо было моцнае задымленне. Яшчэ да ліквідацыі ўзгарання гаспадыню, жанчыну 1920 года нараджэння, вынеслі на свежае паветра. Яна была ў прытомнасці, удакладнілі ў Цэнтры даследаванняў у галіне бяспекі жыццядзейнасці МНС. Пацярпелую перадалі брыгадзе хуткай медыцынскай дапамогі і медыкі змагаліся за жыццё пенсіянеркі, аднак... Праз некалькі хвілін жанчына сканала. Прычына смерці ўстанаўліваецца, мяркуецца, што гэта быў сардэчны прыступ... Праз нейкі час (пошукам перашкаджала шчыльнае задымленне і высокая тэмпература) на падлозе ў адным з жылых пакояў быў знойдзены труп кватаранткі. Версія прычыны здарэння — парушэнне правілаў эксплуатацыі электрасетак і электраабсталявання. Папросту кажучы: дотык згаральнага матэрыялу з лямпачкай напальвання настольнай лямпы.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**


**ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ ЗАСТРОЙЩИКА ОТ 01.12.2011**

**Сведения о застройщике:** Совместное общество с ограниченной ответственностью «Лада ОМС-Инжиниринг» (СООО «Лада ОМС-Инжиниринг»). СООО «Лада ОМС-Инжиниринг» является универсальным правопреемником СП «Лада ОМС-Холдинг» ЗАО.

**Местонахождение:** г. Минск, ул. Грушевская, 91, пом. 2Н, комн. 3а.

**Режим работы:** рабочие дни с понедельника по пятницу с 8.30 до 17.30; выходной день – суббота, воскресенье.

**Данные о государственной регистрации:** зарегистрировано Минским горисполкомом в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 191118730.

**Сведения о проектах жилых домов,** введенных в эксплуатацию за последние 5 лет:

1. 9-этажный 5-секционный 175-квартирный жилой дом № 91 на ул. Грушевской в г. Минске.
2. 15-17-этажный односекционный 82-квартирный жилой дом № 15 на ул. Маяковского в г. Минске со встроенно-пристроенными помещениями подземного гаража-стоянки, магазина и аптеки.
3. 7-этажный 5-секционный 135-квартирный жилой дом № 3 на ул. Щорса.
4. 15-этажный односекционный 89-квартирный жилой дом № 8 на 3-й ул. Щорса.

**Цель проекта** – строительство объекта «Комплекс многоэтажных жилых домов с объектами общественного назначения на территории в границах ул. Маяковского, ул. Оранжерейной, ул. Луговой, пер. Полевой со сносом существующей усадебной жилой застройки в границах ул. Маяковского, ул. Аранской, ул. Денисовской, р. Свислочь и выделением 1-ой очереди – многоэтажный жилой дом со встроенно-пристроенными объектами административно-общественного назначения. Жилой дом № 5 по генплану» (1-й пусковой этап) с привлечением денежных средств граждан и юридических лиц путем заключения договоров создания объектов долевого строительства.

**Сведения о сроках реализации:**
Начало строительства – май 2011 г.
Ввод объекта в эксплуатацию – июль 2013 г.

**У Застройщика имеются:**
- решение Мингорисполкома о разрешении строительства от 24.03.2011 № 731;
- проектно-сметная документация, прошедшая в установленном порядке государственную экспертизу в РУП «Главгосстройэкспертиза» (заключение от 04.10.2010 № 1085-15/10).

**Местонахождение строящегося объекта**: г. Минск, территория в границах ул. Маяковского, ул. Оранжерейной, ул. Луговой, пер. Полевой.

**Количество предлагаемых для заключения договоров создания объектов долевого строительства.**
По жилому дому:
-1-комнатные – 12 шт.

**Цена одного квадратного метра** общей площади жилых помещений (без отделки) составляет 9 200 000 белорусских рублей

**Данные о правах застройщика на земельный участок:** земельный участок предоставлен застройщику решением Мингорисполкома от 24.03.2011 № 731 площадью 0,3737 га.

**Элементы благоустройства:** создаются площадки для отдыха, детская площадка, газоны, озеленение; покрытие проездов к дому – двухслойный асфальтобетон, тротуаров – мелкоразмерная плитка, дорожек и площадок – спецсмесь и плитка.

**Предполагаемый срок ввода дома в эксплуатацию** – июль 2013 г.

**Сведения о договорах строительного подряда:**
договор подряда с СООО «Гранитстройинвест» от 28.03.2011 № 28-03/1.

**Условия ознакомления с информацией по проекту:**
тел.: 8 017 220 40 43, VELCOM 8 029 699 40 32; на сайте http://www.lada-park.by/ либо по адресу: г. Минск, ул. Грушевская, 91, пом. 2Н, комн. 3а.



**ООО «Элитмаст» в лице ЗАО «Правовая компания «Антикризисный консалтинг» – организатор публичных торгов – ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ 15 декабря 2011 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Скрыганова, д. 6, корп. 3, пом. 3, оф. 16 – ПУБЛИЧНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ЕДИНЫМ ЛОТОМ следующего недвижимого имущества ООО «Элитмаст»:**

**ЛОТ № 1 (Единым лотом)**

● Административное помещение, расположенное по адресу г. Гродно, ул. Тимирязева, д. 10, корп. 1, пом. 10, инв. № 400/D-111425, общей площадью 17,0 кв.м. Начальная цена торгов – 255 000 000 руб. без НДС.

● Административное помещение, расположенное по адресу г. Гродно, ул. Тимирязева, д. 10, корп. 1, пом. 20, инв. № 400/D-111429, общей площадью 21,6 кв.м. Начальная цена торгов – 324 000 000 руб. без НДС.

● Административное помещение, расположенное по адресу г. Гродно, ул. Тимирязева, д. 10, корп. 1, пом. 23, инв. № 400/D-111430, общей площадью 12,8 кв.м. Начальная цена торгов – 192 000 000 руб. без НДС.

● Административное помещение, расположенное по адресу г. Гродно, ул. Тимирязева, д. 10, корп. 1, пом. 25, инв. № 400/D-111432, общей площадью 27,0 кв.м. Начальная цена торгов – 405 000 000 руб. без НДС.

● Административное помещение, расположенное по адресу г. Гродно, ул. Тимирязева, д. 10, корп. 1, пом. 26, инв. № 400/D-111433, общей площадью 22,8 кв.м. Начальная цена торгов – 342 000 000 руб. без НДС.

● Административное помещение, расположенное по адресу г. Гродно, ул. Тимирязева, д. 10, корп. 1, пом. 28, инв. № 400/D-111435, общей площадью 13,1 кв.м. Начальная цена торгов – 196 500 000 руб. без НДС.

● Торговое помещение, расположенное по адресу г. Гродно, ул. Тимирязева, д. 10, корп. 1, пом. 1, инв. № 400/D-111405, общей площадью 129,5 кв.м. Начальная цена торгов – 3 043 250 000 руб. без НДС.

● Торговое помещение, расположенное по адресу г. Гродно, ул. Тимирязева, д. 10, корп. 1, пом. 1, инв. № 400/D-111417, общей площадью 53,1 кв.м. Начальная цена торгов – 1 247 850 000 руб. без НДС.

**ОБЩАЯ НАЧАЛЬНАЯ ЦЕНА ТОРГОВ ПО ЛОТУ № 2 СОСТАВЛЯЕТ 6 005 600 000 (шесть миллиардов пять миллионов шестьсот тысяч) белорусских рублей без НДС.**

Шаг торгов – 5% от начальной цены лота.

Заявки на участие в торгах принимаются **до 18.00 13 декабря 2011 года (включительно)** по адресу: г. Минск, ул. Скрыганова, д. 6, оф. 2304.

По вопросам участия в торгах обращаться по тел. +37529 166 85 12.

Задаток для участия в торгах – 10 % от стоимости лота.

**Оплата задатка производится с даты настоящей публикации до 13 декабря 2011 года (включительно) на р/с ООО «Элитмаст» № 3012002530019 в ОАО «Технобанк» ф-л г. Гродно, код 857.**

В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05 мая 2009 года № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги.

Заключение договора производится в течение 5 (пяти) дней после подписания протокола о результатах торгов. Оплата – в течение 7 (семи) календарных дней после регистрации договора.


# КАЛІ ПЫТАННЕ СУМЛЕННЯ ПЕРАСТАЕ БЫЦЬ РЫТАРЫЧНЫМ?

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

**ПАД гэтай рубрыкай, як ведаюць нашы пастаянныя падпісчыкі, на працягу ўжо доўгіх гадоў мы імкнёмся даваць канкрэтныя адказы на запыты нашых чытачоў. Спектр пытанняў ад апошніх — самы разнастайны. На жаль, часам даць падрабязны каментар той ці іншай сітуацыі, рэальна паўплываць на яе па прычынах, якія не залежаць ад рэдакцыі, не атрымліваецца. Хоць мы шчыра і добрасумленна спрабуем дапамагчы чалавеку. А бываюць звароты, калі ўжо адразу зразумела, што яны, так бы мовіць, з разраду рытарычных: нават звярнуўшыся ў афіцыйныя інстанцыі, як правіла, мы чуем тое ж самае, што адразу падчас гутаркі самі можам паведаміць таму ці іншаму заяўніку. Сёння — менавіта пра такі зварот.**

З гарадскога пасёлка Краснаполле патэлефанавала жанчына, маці траіх дзяцей. З уласнай бядой: шмат гадоў не атрымлівае аліменты ад колішняга сужэнца. Што рабіць, куды звяртацца? Падчас размовы высвятляецца, што апошні ўвогуле з 2005 года быў у Расіі, напэўна, «шабашыў». Днямі на радзіме адбыўся суд: мужчыну прыгаварылі да 168 гадзін грамадскіх работ. «Маё пытанне пра аліменты засталося без адказу. Ад суддзі пачула толькі словы, што колішні муж пасля павінен уладкавацца на працу». Жанчына ў такое развіццё падзей верыць слаба. Пыталася: можа, лепш яго ўвогуле было б пасадзіць?

Як бы чытачы адказалі на такое пытанне? Пасадзіўшы за краты гэтага чалавека, грамадства стварыла б для яго неблагія ўмовы: дах над галавой, не трэба думаць пра вопратку і ежу. Карацей, мы б з вамі яго ўтрымлівалі. Тое, што ўсё гэта з умовай абмежавання волі, — ненармальна для звычайнага грамадзяніна, які мае сям'ю, дом, дбае пра іх. А для чалавека, які шмат гадоў афіцыйна не працаваў, не плаціў грошы на ўтрыманне ўласных жа дзяцей? Калі, можа, для яго быць лепш у няволі, чым запэцкаць свае рукі якой-небудзь працай? Тое, што такі чалавек пачне працаваць ва ўмовах абмежавання волі, — сумніўна. Нават калі дапусціць такую магчымасць, ці шмат ён зможа зарабіць? Якой тады будзе сума аліментаў?..

Мы ведаем шмат выпадкаў, калі бацькоў, пазбаўленых правоў, абавязваюць кампенсаваць утрыманне дзяржавай іх нашчадкаў. Дапамагаюць знайсці працу. І што? Сходзіць такі «абавязаны» на працу раз-другі і — знікне. А міліцыянер кожны дзень вадзіць яго за руку не можа. Якія гарантыі, што колішні сужэнец нашай заяўніцы раптоўна ўсвядоміць усю сітуацыю, у яго прачнецца сумленне, ён знойдзе працу, калі перад тым шмат гадоў нават думаць пра гэта не хацеў?.. Рытарычнае пытанне. Пакуль грамадзянін сам не захоча — прымус не дапаможа.

...Жанчына пыталася пра нейкі тэлефон Міністэрства юстыцыі: маўляў, можа, там чым дапамогуць? Рэдакцыя патэлефанавала туды. І пачула тое, што ўжо было сказана намі самой заяўніцы: адзінае выйсце — звярнуцца да ўчастковага міліцыянера па месцы жыхарства. Гэта, на жаль, усё, што можна было канкрэтна параіць маці траіх дзяцей. «Такіх выпадкаў дастаткова шмат», — зазначылі нам у міністэрстве пра сітуацыю ўвогуле. Дык як пазбегнуць іх? На якой стадыі: калі выбіраеш сабе сужэнца ці яшчэ раней — калі яго малечай выхоўвае сям'я або школа? Першае — лакальнае вырашэнне сітуацыі для двух канкрэтных людзей (бракцца шлюбам або не, жыць з чалавекам або стварыць сям'ю з іншым абраннікам), другое — ужо праблема агульная.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# НЯЛЁГКА БЫЦЬ ДОБРЫМ

*Працытаў у інтэрнэце, што ў Беларусі каля 10 млн сабак і катоў. З такой лічбай мы, быццам бы, першыя ў Еўропе — на кожнага жыхара адна жывёліна. Колькасць, відаць, завышана, але тым не менш сабак і катоў у нас хапае.*

Двойчы на тыдзень даводзіцца ездзіць на дачу, каб хоць крыху падтрымаць бяздомнага сабаку і пяць катоў, якія прыбіліся летам. А неўзабаве ўдараць маразы, то што з імі будзе? Зімой асабліва не наездзішся.

Хочацца быць добрым, але дабрыня — гэта не толькі парыў душы, але і абавязак, які нібы хамут на шыі.

Ведаю дачніка, у якога на лецішчы сабралася за лета 11 катоў — чалавек за 30 км ездзіць, каб іх пакарміць. Але даймаюць не толькі паездкі, а ёсць пэўная праблема з кормам. Нельга сказаць, што яго няма ў продажы. Наадварот, спецыяльны сухі корм ёсць у вялікім выбары, але ён усё ж дарагі, ды і бяздомную жывёліну да яго трэба прывучыць. Раней узяў крывянкі ці ліверкі на дзве тысячы — і няма пытання, а сёння такая каўбаса стала рэдкасцю, ды і кошт яе падняўся да 10-14 тыс./кг.

Вельмі добрыя кансервы для сабак выпускаў агракамбінат «Сноў» — бляшанка набіта мясам, і такая раскоша была ўсяго за 1600 рублёў.

Бярозаўскі мясакансервавы камбінат таксама вырабляе кансервы, але яны напалову з крупамі, ды і цана вырасла амаль у тры разы. Напрыклад, «Джэк» — 6770 рублёў, «Чапа» — 5400 рублёў, а там і 400 г няма.

Зніклі з прылаўкаў каўбас «Тузік» і «Лайка», прынамсі ў крамах, дзе яны заўсёды прадаваліся, сёння іх не знойдзеш.

Такая прадукцыя выручала, асабліва тых, хто падкормліваў бяздомных хвастатых валацуг.

Патэлефанаваў на мясакамбінат аграфірмы «Сноў».

— *Наша прадпрыемства як вырабляла кансервы для сабак, так і вырабляе. Выпуск не зменшыўся ні на адну бляшанку. А тое, што іх няма ў Баранавічах, то мы найперш пастаўляем іх у Мінскую вобласць, а на Брэстчыне ёсць свае мясакамбінаты,* — растлумачыў сітуацыю **дырэктар прадпрыемства Андрэй САСІМ**.

Сноўская прадукцыя ў Баранавічах прадаецца, але прадпрымальнікі бяруць на продаж найперш тое, што хутка збываецца. Кошт кансерваў значна вырас і попыт на іх упаў. Праблема яшчэ ў тым, што сэрца баліць па кінутых сабаках і кошках, найперш у людзей небагатых, якім даводзіцца лічыць кожную тысячу.

За вёскай Сеўрукі пад Баранавічамі Алена Александровіч стварыла прытулак для бяздомных сабак, наша газета пра гэта пісала («Звязда», 17.11 2009 г.), але сёння паехаць туды ў мяне не хапіла смеласці, бо пракарміць 50 сабак і 20 катоў — гэта сур'ёзнае выпрабаванне ў наш час.

Размова адбылася па тэлефоне з дачкой Александровіч — Ірынай, якая пасля заканчэння ўніверсітэта працуе ў сярэдняй школе вёскі Палонка, а па выхадных дапамагае маці.

— Ірына, як ваша «Міласэрнасць» выжывае? Чым корміце сваіх выхаванцаў?

— *У нас свае кантакты з некаторымі крамамі — ведаем, дзе можна купіць недарагі корм.*

— Але ж каб купіць нават танны, патрэбны грошы. Дарэчы,у скрынкі для ахвяраванняў для вашай арганізацыі грошы людзі кідаюць?

— *Фінансавыя цяжкасці вялікія, а што датычыцца ахвяраванняў, то яны мізэрныя. Дапамагаюць асобныя грамадзяне. Напрыклад, рэальную дапамогу аказвае дырэктар фірмы «Дело», адна жанчына са Стоўбцаў падтрымала, дзве полькі дапамаглі кормам...*

— Не шкадуеце, што на сябе такі хамут надзелі?

— *Што шкадаваць, калі на цябе пяцьдзясят пар вачэй аддана глядзяць і радуюцца твайму прыходу — ты для іх, кінутых, цяпер апошняя надзея...*

Адны выкідваюць, другія ратуюць, а спецбаза робіць штомесячную зачыстку — адстрэльвае тысячамі.

Але гэтыя радкі пішуцца не дзеля слязы, а каб прыцягнуць увагу да праблемы.

* * *

...Пакарміў сваіх прыблудных і пайшоў з дачы, а за мной на трох лапах (адна ампутаваная) — чорны каток. Праводзіць аж за вёску. А на чыгуначным прыпынку сустракае худая сука з жыватом да зямлі. Кідаецца насустрач. І закіпае злосць на тых, хто выгнаў жывёліну, на сябе, што ў сумцы няма нават кавалачка хлеба, і на суку, якая ўздумала на зіму гледзячы шчаніцца.

Іншым разам хочацца ад усяго гэтага адгарадзіцца і не бачыць. Але праз два дні едзеш па крамах і шукаеш крывянку, ліверку...

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**
**Фота аўтара.**

***Информационное сообщение об отказе от проведения аукционов и конкурсов***

**Государственный комитет по имуществу Республики Беларусь сообщает об отказе от проведения аукционов,** объявленных на 7, 16 декабря 2011 г., и конкурсов, объявленных на 8, 21 декабря 2011 г., по продаже принадлежащих Республике Беларусь акций открытых акционерных обществ: Гомельжелезобетон; Гомельский комбинат строительных конструкций; Жлобинский ремонтно-механический завод; Завод железобетонных изделий, г. Барановичи; Завод железобетонных конструкций, г. Молодечно; Лельчицкая ПМК-103; Могилевжелезобетон; Реммех, г. Минск; Рогачевстрой; Рогачевжелезобетон; Строительный трест № 21, г. Борисов; Строймаш, г. Минск; Управляющая компания холдинга «Забудова».

*В газете «Звязда» извещения о проведении указанных аукционов и конкурсов были опубликованы от 2, 3, 15 и 16 ноября 2011 г.*

**Ёсць нагода? Ёсць пытанне!**

# ЛАМАЕЦЕ ГАЛАВУ НАКОНТ НЕЗВЫЧАЙНАГА ПАДАРУНКА ЦІ СУВЕНІРА? ПАДАРУЙЦЕ ПАВЕТРА!

**У Расіі ў якасці сувеніра сталі прадаваць «Паветра Горнага Алтая» ў кансерваваных слоіках, паведамляе РІА «Навіны». І гэта не сенсацыя, а тэндэнцыя. У Расійскай Федэрацыі паветра прадаюць ужо 8 гадоў, пачынаючы з часу святкавання 300-годдзя Пецярбурга. А ўвогуле ідэя кансервацыі таго, чым мы дыхаем, з'явілася ў Еўропе ажно 30 гадоў таму.**

Закансерваванае паветра паспела стаць незвычайным і цікавым сувенірам. Дзвесце грамаў паветра з Горнага Алтая каштуе 250 расійскіх рублёў (прыкладна 70 тысяч беларускіх рублёў). У гэтага падарунка нават тэрмін прыдатнасці ёсць — да 2109 года (дзіўна толькі, як вылічылі).

**ЦІКАВА, ЯКІЯ НЕЗВЫЧАЙНЫЯ СУВЕНІРЫ ЦІ ПАДАРУНКІ ВАМ ДАВОДЗІЛАСЯ ДАРЫЦЬ ЦІ АТРЫМЛІВАЦЬ?**

**Наталля ЯРАФЕЕВА, інжынер:**

— Аднойчы мне падаравалі на дзень народзін працівагаз. Сябар неяк спытаў: «Табе не патрэбны працівагаз?» Я кажу: «А можна?» Вось ён і прыцягнуў мне такі «сувенір» з працы. Дагэтуль стаіць на палічцы.

**Галіна БАГДАНАВА, пісьменніца:**

— Я ўвогуле збіраю сувеніры. Ёсць розныя. За жыццё шмат сабралася. Тут і Мікі-Маус з Нью-Ёрка, і лялькі ў нацыянальным адзенні. Аднак самы незвычайны сувенір мне прывёз аднойчы муж. Гэта была эратычная кераміка выдатнага майстра з Лагойска Сямёна Саўрыцкага. Ён быў і жывапісцам, і ганчаром. Займаючыся керамікай, зрабіў адкрыццё — Лагойшчына сугучная формам жаночага цела. Ведаеце, самыя ўнікальныя сувеніры, як правіла, з самых блізкіх мясцін, бо лепш вандраваць не далёка, а глыбока.

**Кацярына КРАСОЎСКАЯ, студэнтка БДУ:**

— Самы незвычайны сувенір мне прывезлі з Нідэрландаў. Гэта скарбонка. Пластмасавая скарбонка ў выглядзе... унітаза. Кладзеш туды манетку, націскаеш на кнопку — а адтуль высоўваецца рука і забірае гэтую манетку.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

## Информация о проведении аукциона с условием по продаже права на заключения договора аренды земельных участков

| Лот № 1 | |
|---|---|
| Адрес объекта и его наименование | Земельный участок для строительства и обслуживания продовольственного магазина, расположенный по адресу: Минская область, г. Мядель, ул. Крупской, площадью 0,1432 га (кадастровый номер № 624050100001001566). Начальная цена – 30 831 461 белорусский рубль. Срок арены – 99 лет. Шаг аукциона в размере 10% от предыдущей цены |
| Порядок оплаты | Победитель аукциона возмещает расходы, связанные с формированием земельного участка и его государственной регистрацией; расходы, связанные с организацией и проведением аукциона и объявления в средствах массовой информации. Оплата в размере цены продажи объекта (за вычетом задатка) в течение 20-ти рабочих дней со дня получения протокола аукциона, с возможностью предоставления в установленном порядке рассрочки внесения оплаты за право заключения договора аренды |
| Сумма задатка | 10% от начальной цены на р/с 3012190930030 в отделении 932 ОАО «Белинвестбанк» г. Молодечно, код 739, УНН 600182305, ОКПО 04064333, получатель: СИКУП «УКС-Сервис» |
| Продавец | Мядельский районный исполнительный комитет |
| Организатор аукциона | СИКУП «УКС-Сервис» |
| Документы, предоставляемые для участия в аукционе | Заверенную банком копию платежного документа, подтверждающего внесение задатка, паспорт или иной документ, удостоверяющий личность. Копия свидетельства о гос. регистрации, копия устава |
| Конечный срок и адрес приема заявок | **30.12.2011 г. до 16.00**, г. Молодечно, ул. Мира, 15, каб. 1, СИКУП «УКС-Сервис», тел.: (8 0176) 73 00

# ВЯРТАННЕ БОЖАЙ МАЦІ

*Старадаўні і дагэтуль невядомы спіс знакамітага цудатворнага абраза Бялыніцкай Божай Маці захоўваецца ў Веры Васільеўны Кужальковай. Жыхарка аграгарадка Галоўчын Бялыніцкага раёна калісьці знайшла гэты абраз у старой хаце.*

Вера Кужалькова: «Мне падабаецца гэты абраз. Вочы святых глядзяць на цябе ўважліва, нібыта ў душу зазіраюць і кажуць: «Я цябе разумею».

## Святарскі скарб

Гэтая гісторыя датуецца яшчэ савецкім часам. У пачатку 1980-х для сям'і Кужальковых калгас «Наша Перамога» набыў хату ў вёсцы Галоўчын. Гэта быў абсалютна звычайны драўляны дом, які прадавалі дзеці памерлай састарэлай жанчыны. Адзіная адметнасць, што ён месціўся побач з пагоркам, на якім калісьці стаяла мясцовая Свята-Троіцкая царква.

А ў суседняй з хатай пабудове, якая выкарыстоўвалася ўжо як хлеў, раней жылі галоўчынскія святары, і апошні з іх — Панцеляймон Шынкевіч. Гавораць, ён быў незвычайным чалавекам, які ў расе ліха раз'язджаў на матацыкле па навакольных вёсках і патаемна хрысціў дзяцей.

— Абраз Божай Маці вісеў на сцяне ля акна ў пярэднім пакоі хаты, — расказвае **Вера Васільеўна КУЖАЛЬКОВА.** — Мы пражылі там некалькі гадоў, і гаспадарка прадставіла нашай сям'і палову новага катэджа. Вядома, я забрала абраз з сабой. Хоць час тады быў яшчэ атэістычны, і сваіх дзяцей я хрысціла ўпотайку, каб ніхто, барані Божа, не ведаў.

Мінулі гады, у Кужальковых нарадзілася 7 дзяцей, пайшлі і ўнукі. Цяпер абраз Бялыніцкай Божай Маці ўпрыгожвае гасцёўню ў двухпавярховай кватэры сям'і. У адным баку агульнага пакоя — вялікі тэлевізар, у другім — вялікі абраз. Перад выявай Божай Маці — кветка, свечка і зноў, як прыкмета сучаснасці, збоку прытуліўся і мільгаціць лямпачкамі мадэм.

Абраз напісаны алеем на палатне. Спакойныя, вельмі жывыя і нават румяныя твары Божай Маці і Немаўляці адразу выклікаюць сімпатыю. Цёплыя фарбы лашчаць вока: усе адценні ад малочнага колеру, праз бэжавы і прыемны жоўты, да цёмна-карычневага, з рэдкімі ўсплёскамі зялёнага і чырвонага ў аздабленні. Высакародныя колеры адцяняе беласнежны ручнік.

— Мне падабаецца гэты абраз, — прызнаецца Вера Васільеўна. — Вочы святых глядзяць на цябе ўважліва, нібыта ў душу зазіраюць і кажуць: «Я цябе разумею».

## Абраз, Якаў, Мікіта

На першы погляд, абраз і драўляны аклад (абраз у гэтай рамцы і знайшлі) — старадаўнія. Хоць, безумоўна, на гэты конт павінны выказацца спецыялісты, дыпламаваныя мастацтвазнаўцы, а не аматары.

Палоскі на палатне сведчаць пра тое, што абраз захоўваўся ў скручаным выглядзе. Дзе ляжаў гэты скрутак? І чаму? Бо ёсць гісторыя, што іншы старажытны спіс абраза Бялыніцкай Божай Маці, які цяпер з'яўляецца славутасцю праваслаўнай царквы ў Бялынічах, захоўваўся жанчынай на працягу доўгага часу за печкай.

— Калі я знайшла абраз, то нават і не ведала, што гэта Бялыніцкая Божая Маці, — расказвае Вера Васільеўна. — Пра гісторыю гэтага цудатворнага абраза даведалася не так даўно, калі стала ездзіць у вёску Лазіцы на Шклоўшчыну. Там старажытная царква, якой больш за 200 гадоў, і я там малілася за пазбаўленне ад хвароб. Тады і заўважыла падабенства царкоўнага абраза Бялыніцкай Божай Маці і свайго, хатняга.

Таксама гавораць, што палатно, на якім напісаны абраз, саматкане. А вось цьмяны надпіс унізе выявы ніхто, нават з дапамогай вялікай лупы, пакуль прачытаць не здолеў. Там пабляклыя словы зроблены мудрагелістым почыркам старога ўзору. Спрабавалі прачытаць і мы, стоячы на каленях разам з гаспадыняй перад абразом. Разабралі толькі некалькі слоў. Першае — «абраз» — чытаецца лёгка. Добра бачна імя «Якаў». Можа, яшчэ «Мікіта». А далей немагчыма зразумець...

Хто ж такія былі гэтыя Якаў і Мікіта? Можа, мастакі, якія рабілі спіс з абраза Бялыніцкай Божай Маці? А яшчэ больш верагодна, што гэта людзі, якія замовілі яго выкананне

Міхась Карпечанка, бялыніцкі журналіст і краязнаўца, сталы чытач «Звязды»: «У час глабалізацыі трэба захаваць нацыянальную адметнасць. Мне падабаецца, што ваша газета адстойвае беларускую мову і культуру. Цяпер я звузіў кола газет, на якія падпісваюся, але «Звязду» пакінуў, абавязкова».

і потым падаравалі нейкай царкве. Надпісы вартыя спецыяльнага даследавання, бо ёсць здагадкі, што ў Галоўчыне знойдзены адзін з трох галоўных старадаўніх спісаў (гэта значыць, копій з арыгінала) цудатворнага абраза.

У любым выпадку, выдатна, што абраз захаваўся для нашчадкаў. Напрыклад, вядома, што ў снежні 1942 года фашысты (з самалётаў) поўнасцю спалілі вёску Карманаўку, якая месціцца на тэрыторыі Эсманскага сельсавета, на другім краі Бялыніччыны. Тады было знішчана 35 двароў, загінулі людзі, і расярод гэтага вогненнага штораму ўцалела толькі адна хата. Пасля вайны гаспадары знайшлі ў той шчаслівай пабудове пад страхой абраз Бялыніцкай Божай Маці. Але куды ён потым падзеўся — ніхто не памятае.

## Бялыніцкія легенды

— Вядома, гэты абраз, знойдзены ў Галоўчыне, мае вялікую духоўную і матэрыяльную каштоўнасць, але гэта не арыгінал, а спіс, які, верагодна, зроблены ў пачатку мінулага стагоддзя, — каментуе знаходку Кужальковай **галоўны рэдактар раённай газеты «Зара над Друццю» і краязнаўца Міхась КАРПЕЧАНКА.** — Арыгінал не захаваўся. Ніхто не ведае, дзе той легендарны абраз.

Спачатку нагадаем: ніхто не ведае, адкуль ён і з'явіўся. Паводле каталікаў, абраз напісаў анёл, які з'явіўся пад выглядам вандроўніка-мастака ў кармеліцкім касцёле на пачатку XVII стагоддзя. Праваслаўныя сцвярджаюць, што значна раней, калі Батый напаў на Кіеў, некалькі манахаў прыплылі ў гэтыя мясціны па Дняпры і Друці і прывезлі з сабой старажытны абраз. Расповедаў пра цудоўную дапамогу Бялыніцкай Божай Маці людзям існуе з абодвух бакоў вялікая колькасць.

— Ёсць таксама некалькі версій знікнення абраза, і самая даступная датуецца пачаткам Другой сусветнай вайны, — нагадвае Міхась Карпечанка. — Калі закрылі царкву ў Бялынічах, абраз перадалі ў Магілёў. Там ён захоўваўся (дарэчы, разам з іншай славутасцю Беларусі — крыжам Еўфрасінні Полацкай) і знік у 1941 годзе. Гэта вядомая гісторыя, але і таямнічая. Пошукі ідуць у Расіі і на Захадзе. Знойдуць каштоўны крыж — адшукаецца і цудатворны абраз, так мне падаецца. Гэта была б вялікая падзея для ўсёй Беларусі!

Ёсць і іншая версія. Спачатку абраз належаў бялыніцкім каталікам. Апошні настаяцель касцёла адчуваў, што хутка давядзецца развітацца з каштоўнасцю. Перад сваёй смерцю ён схаваў арыгінал недзе ў падземных хадах, якія былі пад Бялынічамі, а на агляд выставіў копію. Так гэта ці не — хто ведае? Тым больш, што да нашых дзён не захавалася нават апісання арыгіналу.

— Рэч унікальная, — гаворыць журналіст і краязнаўца пра знаходку Веры Кужальковай. — Тут патрабуюцца даследаванні і, абавязкова, рэстаўрацыя. Бо час сапраўды нічога не шкадуе.

## Гутарка з Богам

Хто знаёмы з гісторыяй знаходжання абраза Верай Кужальковай, не можа ўтрымацца таксама ад здагадак наконт добрага ўплыву цудатворнай выявы Маці Божай на жыццё гэтай простай сялянскай сям'і. Шматдзетных Кужальковых паважаюць аднавяскоўцы. Шмат радасці прыносяць дзеці і малыя ўнукі. Вера Васільеўна ўсё жыццё адпрацавала ў сельскай гаспадарцы, а цяпер носіць пошту. Штодзень даводзіцца праходзіць альбо праязджаць на веласіпедзе 12 кіламетраў, і ў гэтым яна таксама бачыць добрае: без модных дыет і фітнэсу жанчына страціла вагу, падцягнулася і выглядае маладзейшай за свае «крышку болей за 50».

У самой Веры Васільеўны дачыненні з Богам складаюцца цалкам шчырыя. Нават нягледзячы на савецкія атэізм. Калі яна ўступала ў камсамол, то сказала старэйшым таварышам пра рэлігію наступнае: «У народзе кажуць, навукай не даказана». Гэтак жа шчыра яна адказала і святару, які ўжо ў наш час прыехаў асвячаць яе кватэру.

— Нешта ў гэтым ёсць, — разважае Кужалькова. — Мяне не вучылі малітвам, але так здарылася, што я з Богам размаўляю з дзяцінства. Памятаю, што калі каралі бацькі за дзіцячыя правіннасці, то я заўсёды ішла да абраза Ісуса Хрыста, які ў нас вісеў у задняй хаце. Паплачу, пагутару з Богам — нібыта лягчэй станавілася.

Вера Васільеўна запальвае свечку каля абраза Бялыніцкай Божай Маці.

— Я для сябе і людзей прашу здароўя і міру, — гаворыць шматдзетная маці. — Гэта галоўнае, а грошы — гэта нешта часовае.

Вера Васільеўна, як і яе аднавяскоўцы, спадзяюцца, што ў Галоўчыне калі-небудзь будзе свая праваслаўная царква. Вядома, што Свята-Троіцкую царкву пабудавалі ў вёсцы ў другой палове XIX стагоддзя, у памяць пра ахвяр Галоўчынскай бітвы паміж рускімі і шведамі ў 1708 годзе. Але пасля апошняй вайны яна перастала дзейнічаць: званы пайшлі на металалом, а бярвенне савецкія людзі скарысталі на дровы.

Новую царкву пачалі ўзводзіць напрыканцы XX стагоддзя на старым, гістарычным месцы, але сёння там можна паглядзець толькі на руіны цагляных пабудоў, якія ўжо раставаць позна. Там былі ліпы, якія спілавалі, і падчас работ знаходзілі пахаванні часоў Паўночнай вайны. Але сёння ідуць размовы пра будаўніцтва царквы ўжо на новым месцы.

— Мне прапаноўвалі прадаць абраз, але я так мяркую, што гэта будзе вялікі грэх, — гаворыць уладальніца каштоўнасці Вера Кужалькова. — Калі ў Галоўчыне ўсё ж пабудуюць царкву, то я гатова аддаць туды абраз Бялыніцкай Божай Маці. Я вярну яго людзям, каб ва ўсіх вернікаў была магчымасць дакрануцца да святыні, папрасіць аб цудзе.

## З абразом па жыцці

Увогуле **абраз Бялыніцкай Божай Маці** — славутасць Усходняй Беларусі, хрысціянская святыня. Яго шануюць і каталікі, і праваслаўныя. Ён нібыта яднае ўсіх людзей, і з ім звязаны многія гістарычныя падзеі Прыдруцкага краю. Пра ўсё гэта мы ўжо пісалі ў «Звяздзе».

Выява Бялыніцкай Божай Маці — аснова сучаснага герба Бялынічаў. Таму нездарма добрая рэпрадукцыя гэтага абраза ўпрыгожыла вокладку **краязнаўчага энцыклапедычнага даведніка «Бялынічына»**, які нядаўна выйшаў у свет. Гэта праект раённай газеты, які адлюстроўвае найноўшы этап краязнаўчых даследаванняў у раёне.

Кніжка выдадзена дзякуючы падтрымцы ўлад, матэрыяльнай дапамозе прадпрыемстваў і сельскіх гаспадарак Бялыніцкага раёна і, найперш, працы мясцовых энтузіястаў — такіх, як Міхась Карпечанка. Менавіта яму выпала роля адкрывальніка для шырокай публікі самых цікавых бялыніцкіх таямніц.

Ён родам з Краснапольшчыны, вучыўся у сталічным універсітэце, бавіў вольны час за чытаннем у бібліятэцы беларускіх кніг. Міхась гаворыць, што яму пашанцавала на добрых настаўнікаў і сяброў, якія цікавіліся краязнаўствам.

— Я ўжо ведаў пра абраз Бялыніцкай Божай Маці, і што народ яго вельмі шануе, — узгадвае Карпечанка. — Але даведаўся яшчэ больш, калі прыехаў у Бялынічы працаваць у газеце.

Журналістыка — любімая прафесія, але краязнаўства стала яго хобі на ўсё жыццё.

— Гэта новыя сябры і новая інфармацыя, — тлумачыць ён. — Я жыву на гэтай зямлі і хачу разумець тых людзей, якія жылі да мяне. Ну як быць часткай сям'і і нічога не ведаць пра бабулю і прадзеда? А да таго ж захоплівае працэс пошуку. Трэба разгадаць загадку, і гэта пэўны дэтэктыўны момант. Але ўсё ж галоўнае тут — людзі.

## У чаканні цудаў

— Сёння філосафы і метафізікі звяртаюць увагу на тое, што цяперашняга часу няма, а ёсць мінулае і будучае, — разважае Міхась. — Кніжка выдадзена — мінулае, наша гутарка ўжо таксама сыходзіць у мінулае. Цяперашняе звужаецца...

На пагорку, дзе стаяла калісьці старая царква, з'явіліся новыя руіны. Але жыхары Галоўчына спадзяюцца, што ў іх будзе царква, а ў ёй — знойдзены абраз.

Усё цікавае ў мінулым вывучаюць бялыніцкія краязнаўцы. У раёне зарэгістравана краязнаўчае таварыства: яго ўдзельнікі праводзяць краязнаўчыя чытанні, выдаюць адмысловы бюлетэнь. Вельмі паспяхова працуюць краязнаўцы з дзецьмі: напрыклад, настаўніца гісторыі з Эсьмонаў Таццяна Шастак разам з краязнаўчым гуртком аднойчы адправілася на экскурсію і выпадкова знайшла ў лесе каля вёскі Заазер'е каменны крыж і цэлы «сад» старажытных валуноў, вядомых цяпер як «Бялыніцкі стоўнхэндж».

— Цяпер ідзе працэс глабалізацыі, і мы, падаецца, знаходзімся толькі ў пачатку гэтага шляху, — гаворыць Карпечанка. — Гэта прымусіць людзей цікавіцца сваім мінулым, якое мы можам страціць. Калі ўсё ў свеце будзе існаваць па адным стандарце, можна згубіць свае гісторыю, культуру, мову. Што тады пакінем наступным пакаленням? Таму людзі цікавяцца гісторыяй хоць бы сваёй сям'і, і з гэтага ўсё пачынаецца.

Безумоўна, цяпер крызісны час, эканамічныя цяжкасці б'юць і па культуры. Нешта скасоўваецца назаўсёды, нешта адкладаецца да лепшых часін. Але падаецца, што гэта зусім не датычыцца краязнаўства. «Я не ведаю аматараў гісторыі роднага краю, якія б займаліся гэтай справай, а потым кінулі. Гэта нібы наркотык!» — смяецца Міхась і расказвае не пра праблемы, а пра здабыткі мясцовых краязнаўцаў.

Напрыклад, нарэшце ў Бялынічах з'явіўся першы прафесійны археолаг, які вучыцца ў аспірантуры і ўжо знайшоў новыя археалагічныя помнікі на тэрыторыі раёна.

Становіцца папулярным у народа той самы «Бялыніцкі стоўнхэндж». У камянёў, якія ў глыбокай старажытнасці былі, паводле розных версій, альбо могілкамі, альбо капішчам, з'яўляюцца сталыя прыхільнікі. Людзі распавядаюць, што нават прос-

тае стаянне ў абдымках вялізнага каменнага крыжа насычае чалавека станоўчай энергіяй.

— Людзі так проста б не ездзілі, — лічыць журналіст і краязнавец Міхась Карпечанка. — Я асабіста ведаю некалькіх чалавек, якія сцвярджаюць, што крыж ім неяк дапамагае. Экскурсіі бываюць, але трэба для масавага наведвання зрабіць інфраструктуру, і развіццё пойдзе далей.

Што ж датычыцца абраза Бялыніцкай Божай Маці, то шырокая публіка ім актыўна цікавіцца. Ва ўсякім разе, кожныя выхадныя дні ў Бялыніцкую царкву, названую ў гонар абраза, прыязджаюць з розных месцаў вернікі. Каб пакланіцца прыгожай выяве, папрасіць аб здароўі і міры, паспадзявацца на новы цуд.

**Ілона ІВАНОВА. Фота аўтара.**
*Бялыніцкі раён.*

**РАСПАЎСЮДЖВАННЕ ў ЗША новага штама віруса грыпу H3N2, які перадаецца ад свіней людзям і распаўсюджваецца паміж людзьмі, выклікае трывогу ў экспертаў Сусветнай арганізацыі аховы здароўя. Цяпер спецыялісты спрабуюць вызначыць, якія крокі трэба рабіць, калі вірус будзе распаўсюджвацца і далей, і як рэагаваць на новую пагрозу.**

## Вірус грыпу зноў азадачыў вірусолагаў

Асноўная праблема заключаецца ў тым, што вірусолагі пакуль не ведаюць, з чым канкрэтна маюць справу. Яны апасаюцца паўтарэння сцэнара пандэміі свінога грыпу 2009 года, аднак стараюцца пакуль пазбегнуць слова «пандэмія», каб не выклікаць панікі. Упершыню новы вірус быў выяўлены сёлета ў ліпені: дзесяць выпадкаў захворвання былі пацверджаны ў розных штатах. Амаль ва ўсіх выпадках ахварамі сталі дзеці ва ўзросце да 10 гадоў, якія або мелі асабісты кантакт са свіннямі, або іх сваякі кантактавалі з гэтымі свойскімі жывёламі. Некаторыя з дзяцей, што захварэлі, былі прышчэпленыя ад грыпу H1N1, аднак вакцына не змагла абараніць іх ад новага штама ўзбуджальніка.

Рэкамбінанты вірус грыпу A/H3N2 (S-OtrH3N2) утрымлівае кампаненты вірусаў грыпу птушак, грыпу H1N1 і грыпу парсюкоў. Сімптомы новага грыпу падобныя на сімптомы звычайнага сезоннага грыпу — гэта высокая тэмпература, кашаль, стомленасць, боль у целе і страта апетыту. Сёння спецыялісты праводзяць даследаванні і спрабуюць знайсці адчувальныя месцы ў новага віруса. Пакуль за межамі Злучаных Штатаў не фіксаваліся выпадкі інфіцыявання.

Тым часам у Германіі пачалі пазбаўляцца ад пратэрмінаваных вакцын супраць свінога грыпу. Першая партыя медыкаментаў была спаленая ў Магдэбургу. У 2009 годзе федэральныя землі набылі 34 мільёны ўпаковак з вакцынай. У выніку 28,7 мільёна ўпаковак праляжалі на складзе два гады, пакуль у іх не завяршыўся тэрмін прыдатнасці. Страх перад новым вірусам аказаўся не такім моцным, як чакалі ўлады, і насельніцтва не спяшалася бегчы рабіць прышчэпкі. У выніку кіраўніцтва федэральных земляў упусцілі выдаткавала на вакцыны 239 мільёнаў еўра. Медыцынскія страхавыя кампаніі выплацілі ўладам грошы толькі за выкарыстаныя прэпараты. Раней федэральныя землі спрабавалі перапрадаць медыкаменты за мяжу, але так і не знайшлі пакупнікоў.

Нагадаем, што пандэмія свінога грыпу, выкліканая штамам вірусу H1N1, працягвалася 15 месяцаў і ахапіла 214 краін. Ахвярамі свінога грыпу стала, па афіцыйных звестках, больш як 18 тысяч чалавек.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# АБ'ЯДНАННЕ ЯК СРОДАК СТВАРЭННЯ

З прафесійным святам!

**Напярэдадні Дня юрыста, які сёлета адзначаецца 4-га снежня, наш карэспандэнт сустрэўся са старшынёй Віцебскага абласнога аддзялення ГА «Беларускі рэспубліканскі саюз юрыстаў» Аленай Аляксандраўнай НІКАЛАЕВАЙ. Яна таксама з'яўляецца старшынёй гаспадарчага суда Віцебскай вобласці. Размова зайшла пра тое, што робіцца Саюзам юрыстаў, пра новаўвядзенні ў заканадаўстве і не толькі пра гэта.**

***— Якая, на ваш погляд, галоўная мэта грамадскага аб'яднання «Беларускі рэспубліканскі саюз юрыстаў»?***

— Каардынацыя намаганняў, накіраваная на садзейнічанне прагрэсу фарміравання прававой дзяржавы ў Рэспубліцы Беларусь і развіццё грамадзянскай супольнасці, заснаванай на прынцыпах вяршэнства закона, патрыятызму і маральных каштоўнасцяў.

Рэспубліканскі Саюз юрыстаў, аб'ядноўваючы прадстаўнікоў гэтай старажытнай і вельмі адказнай прафесіі, ужо шмат гадоў праводзіць плённую працу, накіраваную на садзейнічанне развіццю ў Рэспубліцы Беларусь стабільнай і эфектыўнай прававой сістэмы, працуе над удасканаленнем заканадаўства і практыкай яго прымянення.

Не менш важны напрамак працы — прававая асвета грамадзян. Навелы заканадаўства, асобныя пытанні прымянення нормаў закона — усё гэта патрабуе тлумачэння высокакваліфікаванымі спецыялістамі. Магчымасць атрымаць такое тлумачэнне ад юрыста, які валодае актуальнай інфармацыяй і карыстаецца ёю ў працэсе сваёй працы, заўсёды будзе высока запатрабаванай. Менавіта гэтым і тлумачыцца папулярнасць семінараў і канферэнцый, якія праводзяцца Саюзам юрыстаў.

***— Ці можна ўзгадаць некаторыя вынікі дзейнасці саюза юрыстаў?***

— Вынікі праведзенай работы бачныя «не ўзброеным вокам». Своечасовыя тлумачэнні членамі Саюза юрыстаў новаўвядзенняў у заканадаўстве ўспрымаюцца грамадскасцю станоўча. У Віцебскім рэгіёне ўжо стала традыцыяй правядзенне двойчы на год інфармацыйна-прававых канферэнцый для юрысконсультаў і кіраўнікоў прадпрыемстваў вобласці. Разам з тым, улічваючы пажаданні прадстаўнікоў суб'ектаў гаспадарання, мясцовых органаў улады, а таксама імклівае развіццё заканадаўства, у бягучым годзе Віцебскае абласное аддзяленне павялічыла колькасць праведзеных семінараў па растлумачэнні змяненняў у гаспадарча-працэсуальным, падатковым і грамадзянскім заканадаўстве, якія ўступілі ў сілу з 31 студзеня 2011 года, а таксама іншых навел заканадаўства.

***— Сродкі масавай інфармацыі паведамлялі пра вопыт пазасудовага прававога ўрэгулявання эканамічных спрэчак. Ці можаце крыху расказаць аб гэтым?***

— Так, з 1 сакавіка бягучага года ў Беларусі пачаў працаваць пілотны праект — прававы эксперымент развіцця пазасудовай медыяцыі як сродку прававога ўрэгулявання эканамічных спрэчак, арганізаваны сумесна Вышэйшым Гаспадарчым Судом Рэспублікі Беларусь, Саюзам юрыстаў і Цэнтрам вырашэння канфліктаў Саюза юрыстаў.

У выніку адбору кандыдатаў для ўдзелу ў пілотным праекце ў якасці іншых асоб, рэкамендаваных да прыцягнення і прызначэння прымірэнцамі, у агульную колькасць асоб, якія паспяхова завяршылі стажыроўку і здалі экзамен, уваходзяць і чатыры прымірэнцы Віцебскага рэгіёна. Гэта адвакаты Алена Міхайлаўна Барашкава, Дзмітрый Іванавіч Крапіўка, Андрэй Дзмітрыевіч Прыстаўка, а таксама індывідуальны прадпрымальнік Віталь Валер'евіч Дзерваед. Акрамя прымірэнцаў з ліку работнікаў гаспадарчага суда, менавіта да іх у рамках судовага прымірэння могуць звяртацца тыя, хто спрачаецца для таго, каб паспрабаваць урэгуляваць свой канфлікт і захаваць партнёрскія адносіны.

Варта таксама сказаць і пра такі інстытут вырашэння гаспадарчых спрэчак, як трацейскае правасуддзе. Значную работу ў гэтым напрамку праводзіць Віцебскае аддзяленне, у тым ліку і пярвічная арганізацыя ўстановы адукацыі «Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт». 23 чэрвеня гэтага года Цэнтральным саветам Саюза юрыстаў рэкамендавана Міжнароднаму арбітражнаму (трацейскаму) суду «Палата арбітраў пры Саюзе юрыстаў» стварыць свой філіял у Наваполацку або іх прадстаўнікоў уключыць у склад арбітраў.

Што тычыцца прававой базы дзеяння трацейскіх судоў, то ў цяперашні час прыняты Закон Рэспублікі Беларусь «Аб трацейскіх судах». Гэтым законам вызначаюцца прававыя і арганізацыйныя асновы дзейнасці трацейскіх судоў, патрабаванні, якія прад'яўляюцца да суддзяў, формы і зместу трацейскага пагаднення, парадку трацейскага разбору і выканання рашэнняў.

Для вырашэння пытанняў стварэння трацейскіх судоў пры Віцебскім абласным аддзяленні Саюза юрыстаў ужо ў верасні гэтага года ў гаспадарчым судзе Віцебскай вобласці адбылася сустрэча суддзяў гаспадарчага суда і Віцебскага абласнога суда, прадстаўнікоў галоўнага ўпраўлення юстыцыі Віцебскага аблвыканкама, Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Машэрава, УА «Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт», Міжнароднага ўніверсітэта «Міжнародных працоўных і сацыяльных адносін», банкаў, ліцэнзіятаў, адвакатаў. Шырокае кола ўдзельнікаў адпавядала маштабу ўзнятай тэмы.

На базе гаспадарчага суда Віцебскай вобласці ў сувязі з падрыхтоўкай законапраекта «Аб адвакатуры і адвакацкай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь» па хадайніцтве Прэзідыума Віцебскай абласной калегіі адвакатаў стартавала лістападаўская серыя семінараў для адвакатаў. Асноўнай мэтай мерапрыемства стала давядзенне да ведама ўдзельнікаў семінараў усталяванай судовай практыкі і тлумачэнне асобных пытанняў прымянення заканадаўства.

Сёлета новай формай правядзення інфармацыйна-прававых мерапрыемстваў сталі «куставыя семінары», якія праводзяцца на базе райвыканкама і збіраюць прадстаўнікоў арганізацый адпаведнага і суседніх з ім раёнаў. Такія семінары ўжо праведзены ў Полацкім, Аршанскім, Глыбоцкім, Лепельскім, Браслаўскім, Віцебскім раёнах.

Яшчэ адно новаўвядзенне ў працы Віцебскага абласнога аддзялення — «грамадскія прыёмныя». У мэтах аказання бясплатнай юрыдычнай дапамогі малазабяспечаным катэгорыям грамадзян, абласным аддзяленнем Саюза юрыстаў прынята рашэнне аб арганізацыі цэнтра па працы са зваротамі грамадзян сумесна з грамадскімі прыёмнымі Віцебскага аблвыканкама, гарадскімі раённымі выканкамамі Віцебскай вобласці. У працы прыёмнай удзельнічаюць суддзі і спецыялісты гаспадарчага суда, работнікі пракуратуры, судоў агульнай юрысдыкцыі, дзяржаўных натарыяльных кантор.

Акрамя таго, сумесна з УА «Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт ім. П.М. Машэрава» прынята рашэнне, згодна з якім студэнты старшых курсаў спецыяльнасці «правазнаўства» бяруць удзел у працы грамадскай прыёмнай. Будучыя юрысты пад кіраўніцтвам суддзяў маюць магчымасць азнаёміцца з асаблівасцямі асабістага прыёму грамадзян, праверыць свае тэарэтычныя навыкі на практыцы — даць тлумачэнні па прававых пытаннях.

***— Наколькі развітая структура абласнога аддзялення Саюза юрыстаў?***

— Што тычыцца структуры аб'яднання — у кожным рэгіёне краіны існуе абласное структурнае аддзяленне Саюза юрыстаў, у якім ствараюцца пярвічныя арганізацыі на базе натарыяльных кантор, судоў, мытняў, пракуратур і іншых дзяржаўных органаў.

Віцебскае абласное аддзяленне Саюза юрыстаў аб'ядноўвае 42 пярвічныя арганізацыі. Акрамя дзяржаўных органаў, у склад нашага аддзялення ўваходзяць УА «Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт», ТАА «Юрыдычная кампанія «Тэміс», «Прававая група «Закон і парадак», якія ўступілі ў Саюз юрыстаў летам гэтага года. Ідзе праца па стварэнні пярвічных арганізацый у Віцебскім дзяржаўным універсітэце імя Машэрава, Віцебскай абласной калегіі адвакатаў.

Не так даўно адбылася пазачарговая канферэнцыя нашага аддзялення, на якой былі разгледжаны кадравыя пытанні — абраны Савет, выканаўчы камітэт і рэвізійная камісія аддзялення. Акрамя планавання і каардынацыі работы аддзялення, была зроблена і справаздача аб яго дзейнасці за 2010-2011 гады.

***— Ведаю, што Саюз юрыстаў актыўна займаецца дабрачыннасцю. У прыватнасці, юрысты дапамагаюць дзецям...***

— Безумоўна, мы не маглі пакінуць без увагі дзяцей. У Рэспубліцы Беларусь дакладна вызначыліся асноўныя напрамкі дзяржаўнай палітыкі ў дачыненні да дзяцей, асабліва тых, якія засталіся без апекі бацькоў, а таксама дзяцей-інвалідаў. Саюзам юрыстаў Беларусі праводзяцца дабрачынныя акцыі для дзяцей-сірот і інвалідаў. У прыватнасці, напярэдадні Міжнароднага дня абароны дзяцей, які адзначаецца штогод 1 чэрвеня, мы наведалі Сенненскую школу-інтэрнат для дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў. У рамках дабрачыннай акцыі прадстаўнікі Саюза юрыстаў падарылі неабходныя матэрыялы для рамонту будынка і памяшканняў школы, дзе дзеці атрымліваюць прафесійныя навыкі, пад кіраўніцтвам настаўнікаў і выхавальнікаў сваімі рукамі ствараюць большасць неабходных ім рэчаў: мэблю, прадметы для сталярнай майстэрні, швейнага цэха і камп'ютарнага класа. Навучэнцы школы-інтэрната з захапленнем займаюцца і пчалярствам.

***— Вядома, юрысты за здаровы лад жыцця!***

— Так, члены Віцебскага абласнога аддзялення рэгулярна наведваюць спартыўныя мерапрыемствы, удзельнічаюць у турнірах па розных відах спорту, выступаюць ініцыятарамі іх правядзення.

***— А ці ёсць у юрыстаў яшчэ нейкія прафесійныя ўзнагароды?***

— Як і ў любой іншай дзейнасці, накіраванай на стварэнне, поспехі ў працы павінны заахвочвацца. З гэтай мэтай Саюзам юрыстаў зацверджана прэмія «Феміда», якая з'яўляецца вышэйшай узнагародай за ўклад у стварэнне дэмакратычнага грамадства і развіццё інстытутаў прававой дзяржавы.

Штогод, напярэдадні Дня юрыста — нашага прафесійнага свята, — праводзяцца ўрачыстыя мерапрыемствы. Арганізуюцца цырымоніі ўзнагароджання, на якіх членам аб'яднання, якія ўнеслі значны ўклад у яго дзейнасць, уручаюцца спецыяльныя памятныя знакі «Ex lege», граматы, ганаровыя граматы Саюза юрыстаў.

Сёння, калі свет імкліва мяняецца, патокі інфармацыі дасягнулі каласальных памераў, аб'яднанне юрыстаў-прафесіяналаў дазваляе паспяхова дасягаць пастаўленых мэт, а вынік сумеснай працы становіцца больш дасканалым.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

Памяць

# ТРАГЕДЫЯ НА БЯРЭЗІНЕ ВАЧАМІ НАШЧАДКАЎ

**ЛІСТАПАД 1812 года стаў вырашальным у вайне з Напалеонам. Менавіта 199 гадоў таму адбылася пераправа войскаў вядомага французскага палкаводца цераз раку Бярэзіну. Трагічная для ўсёй Еўропы бітва адабрала жыцці ў больш чым 50 тысяч салдат французскай і рускай армій, грамадзянскіх асоб, якія суправаджалі напалеонаўскія войскі, а таксама мірных жыхароў. У гадавіну трагічных падзей 28 лістапада на Барысаўшчыне адбыліся мерапрыемствы па ўшанаванні памяці загінулых.**

У цырымоніі ўскладання вянкоў і кветак бралі ўдзел Часовы Павераны ў справах Пасольства Францыі ў Рэспубліцы Беларусь Дамінік Жанці, намеснік старшыні Барысаўскага раённага выканаўчага камітэта Валянціна Шутко, начальнік аддзела ідэалагічнай работы райвыканкама Людміла Гарнак, начальнік аддзела культуры райвыканкама Ала Ленкіна, госці і ўдзельнікі 3-й Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Каладзееўскія чытанні», якая ў гэты дзень адчыніла свае дзверы ў Цэнтральнай раённай бібліятэцы імя Івана Хрысанфавіча Каладзеева.

Удзельнікі цырымоніі наведалі могілкі вёскі Студзёнка і Брылёўскае поле, каб ускласці кветкі да манумента, дзе пахаваны астанкі салдат арміі Напалеона, а таксама да іншых помнікаў — ахвярам вайны 1812 года, мемарыяла ў гонар рускіх воінаў, магілы невядомага рускага салдата, манументаў героям вайны 1812 года і салдатам напалеонаўскай арміі.

— Вёска Студзёнка стала эпіцэнтрам чалавечай драмы, — нагадала Валянціна Шутко. — На гэтым месцы страцілі жыцці некалькі дзясяткаў тысяч салдат напалеоўнаўскай арміі і тысячы воінаў рускай. Вялізныя пакуты выпалі на долю жыхароў вёсак Бытча, Студзёнка, Брылі. Больш за палову мясцовага насельніцтва загінула падчас ваенных дзеянняў.

Удзельнікі мерапрыемства маглі адчуць непаўторную атмасферу пачатку 19 стагоддзя: каля мемарыялаў неслі вахту прадстаўнікі ўніформісцкага руху, — члены ваенна-гістарычных клубаў — Азоўскага пяхотнага палка, Беларускага гусарскага палка, Мінскага пяхотнага палка і 18-га палка Вялікага Княства Літоўскага, а таксама Ахтырскага гусарскага палка.

— Пераправа цераз Бярэзіну стала трагедыяй еўрапейскага маштабу, бо ў абедзвюх арміях змагаліся прадстаўнікі розных нацыянальнасцяў, — адзначыў Дамінік Жанці. — Сёння мы сабраліся не толькі дзеля таго, каб аддаць даніну павагі памяці загінулых, але і каб зазірнуць у будучыню. Мы не можам спадзявацца на прадухіленне такіх маштабных трагедый, калі не будзем улічваць урокі гісторыі.

Часовы Павераны ад імя Пасольства Францыі падзякаваў Барысаўскаму райвыканкаму і ўсім неабыякавым беларусам, якія прымаюць актыўны ўдзел у захаванні памяці аб падзеях 1812 года на Бярэзіне.

Праз некалькі гадзін у Цэнтральнай раённай бібліятэцы імя Івана Каладзеева адкрылася III Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Каладзееўскія чытанні». Канферэнцыя невыпадкова носіць імя вядомага барысаўчаніна.

— Барысаўскі мецэнат і бібліяфіл Іван Хрысанфавіч Каладзееў за сваё жыццё зрабіў шмат, каб увекавечыць памяць воінаў, што загінулі ў вайне 1812 года, — адзначыла дырэктар бібліятэкі Галіна Слесарэнка. — Ім была сабрана буйнейшая ў Еўропе калекцыя кніг, картаў і рукапісаў пра гэтую вайну.

Удзельнікамі трэціх «Каладзееўскіх чытанняў» сталі навукоўцы, бібліятэкары, музейныя супрацоўнікі Беларусі, Расіі і Францыі. Прадстаўленыя працы закра

**Пра гэта, здаецца, мы ўжо чулі. Гісторыя, якую апавядае былы камсамольскі работнік, а пазней журналіст, рэдактар раённых газет Віктар Пятрушын, далёка не новая. Але ж, але ж... Як кожная праўдзівая гісторыя, яна ўзрушвае і вымушае задумацца, паспачуваць і падзівіцца нечаканасцю чалавечага лёсу, той пастцы, у якую мы самі сябе заганяем.**

**Віктар КАЗЬКО.**

НА КОНКУРС АПАВЯДАННЯЎ

Віктар ПЯТРУШЫН

# ПАСТКА

Упакоі ўсё было знаёма. Ён ляжаў на вузкім жалезным ложку. Побач стаяла цяжкая жалезная табурэтка на трох ножках. Над ім у сцяне — жалезная вешалка з трыма кручкамі. Воддаль — за паўтара метра — бялела акенца. Табурэтку падпіралі скрыпучыя дзверы. Яны, хоць і скрыпучыя, выпусцяць яго на волю...

На вешалцы заўжды вісела яго клятчатая кашуля. Ён браў яе навобмацак, збіраючыся на працэдуры або прагулку. Зараз ён таксама пойдзе. Куды? Хутчэй за ўсё, насустрач лёсу.

Рука звыкла пацягнулася да вешалкі, але кашулю не намацала. Яе няма. Дрэнна. Зрэшты, ён тут жа знайшоў яе на падлозе. Паспеў падумаць: амаль нічога, ядроны корань, не бачу.

А ў дэсантнай групе, закінутай у Сербію, быў, хутчэй за ўсё, самым вастравокім. Узгадваецца, разам з камандзірам ішлі па вузкай горнай сцяжынцы з кашлатымі елкамі па баках. На адной бліснуў аптычны прыцэл. Архіп штурхнуў камандзіра адначасова са стрэлам. На імгненне раней. Байцы дзвюма чэргамі знялі «наседку». Было, было. А цяпер вось... Кашулю знайшоў, а яшчэ штаны, пінжак з ордэнамі...

У каторы раз Архіп задумаўся. Як жа атрымалася, што ён, ветэран вайны, ні разу, дарэчы, не паранены, а значыць, вельмі ўдачлівы, апынуўся ў гэтай жалезнай клетцы? І як у яго доўгім жыцці — дзякуй Богу, за дзевяноста! — узнікла Прося?

Ён лічыў, што і пасля вайны ўсё для яго складвалася ўдала. У роднай вёсачцы з распаўсюджанай назвай Слабада дэмабілізаваны салдат не затрымаўся. Родных не было. Бацька і маці знайшлі спакой на вясковых могілках, сястру закатавалі немцы. Была, праўда, прыгажуня Марфутка — да вайны падлетак, цяпер спрытная дзеўка.

Згаварыліся хутка. А куды падацца? Выбралі горад за Уралам з вялікім заводам і агністай домнай, з тэрыконамі шахт. Але не стаў Архіп ні шахцёрам, ні сталяварам. Хоць мог. А пайшоў па бацькоўскай сцежцы. Асвоіў сталярную справу. Марфутка працавала ў атэльне швачкай. І была далёка не апошняй.

Высокае начальства прыкмячала не толькі шахцёраў і металургаў. У чырвоны дзень календара на ўрачыстым сходзе адзначалі і Архіпа — то прэміяй, то граматай. Аднойчы ішоў ён з залы ў прэзідыум атрымліваць чарговую ўзнагароду. Ішоў крыху сагнуўшыся: адбівалася праца з гэблікам і дошкай. Начальнік нечакана гукнуў: ты што, забыў, як у арміі страявым хадзіў, ты ж былы салдат?..

Уздрыгнуў Архіп. Імгненна ўспомніў свята Перамогі ў Берліне. І быў урачысты марш. І кожны ў страі строга чаканіў крок. А з трыбуны іх вітаў Маршал...

Выпрастаўся Архіп. Пайшоў, як тады... Даўно гэта было. Цяпер ён без кійка ў адной руцэ і не трымаючыся другой за сцягно перасоўвацца не можа...

Словам, усё ў іх з Марфуткай было хораша — гонар, павага, грошы. Свой дамок пабудавалі. Толькі адна бяда — не было дзяцей. Пачалі думаць пра дзіця з дзіцячага дома.

Зрэшты, да дзетдома не дайшло. Праз пару дамоў ад іх жыла сям'я. Сям'ёй, праўда, хоць мелі яны сына, назваць яе было цяжка. Кожны дзень у хаце п'янка. Пачыналася яна раніцай з апахмелкі. І толькі калі зусім не было дзе ўзяць на чарку, мужчына ішоў у заробкі. Быў ён, як практычна ўсе п'яніцы, нядрэнным спецыялістам, майстрам на ўсе рукі, і хутка здабываў грошы. Хутка прапіваў.

Як рос хлапчына, чым харчаваўся, у што апранаўся — яго бацькоў не цікавіла. Было яму гадоў дванаццаць.

Кастусёк любіў бываць у Архіпа з Марфуткай. Яго тут прывячалі як роднага. Кармілі, спраўлялі сякую-такую вопратку. А што, калі?.. Аднойчы раніцай Архіп прыхапіў бутэльку «чарніл» і пастукаўся да суседзяў.

Праблем не ўзнікла. Асабліва ходка пайшла размова пасля выпітага. Бацька, пакуль яшчэ з упэўненай гаворкай, разумна прапанаваў: няхай пакуль жыве ў вас без афармлення. Абатрэцца-ўляжацца, тады і аформім. Цяпер жа... Няхай жонка збегае ў краму.

І Кастусёк перасяліўся да Архіпа. Да афармлення справа, аднак, не дайшла. Недзе праз месяц, гуляючы з сябрукамі на мосце цераз раку, хлопчык сарваўся з апоры і трапіў у катар, які праходзіў пад мостам. Разбіўся насмерць.

Засумавала-занемагла Марфутка. Да ўрачоў не звярталася. Спадзявалася: моцная сялянская костачка адолее хваробу. Не адолела. Калі ўсё ж наведалася ў паліклініку, было позна.

Страта любай жонкі моцна ўдарыла сталяра. Архіп захістаўся. Не курыў нават у смяротныя ваенныя часы. У мірны час мог прапусціць чарку на свята. Не больш. А тут, прыходзячы з працы, ставіў на стол бутэльку, ладзіў няхітрую закусь і ціха гараваў сваё гора, целі з бацькоўскага гнязда дзеці. Памёр муж. І засталася Ганначка адна. Але сачыла яна, аказваецца, за Архіпам, ведала пра яго беды. І вось прыйшла... А неўзабаве пераехала да яго.

І вярнуўся да жыцця Архіп. Тым часам прыйшла пенсійная пара. Вырашылі Архіп з Ганначкай вярнуцца на радзіму, дажываць век на роднай зямлі. Пераехалі ў Ганначкін райцэнтр. Набылі свой дамок з агародзікам, козачку, курачак з гарлатым пеўнікам. Што яшчэ трэба? Здароўе.

Ішлі гады. І ў семдзесят, і ў восемдзесят Архіп не скардзіўся. Пачалі, праўда, пабольваць ногі, прытупіліся вочы. І не прызнаваўся стары, што дрэнна чуе, пра што гаворыць яму з-за плота ўсмешлівая дзяўчына Аксана. Але, пры наяўнасці рухавай і гаспадарлівай Ганначкі, хваробы надта не давалі аб сабе знаць.

Яны заявілі пра сябе, калі новае гора скаланула Архіпа: памерла Ганначка. Пахаванне прайшло як у тумане. Паехалі дзеці нябожчыцы, на развітанне паляпаўшы старога па плячы, паабяцаўшы прыязджаць. Але ён ведаў, што больш іх не ўбачыць. Адзін у пустым дамку. Амаль перасталі бачыць вочы і хадзіць ногі, дрэнна чулі вушы. Адзін!

Аднойчы ўспомніў пра яго райсабес. Падбадзёрыў. Прызначыў апекуном тую самую ўсмешлівую суседку. Аксана прыносіла прадукты, гатавала, прыбірала, мыла бялізну. І пры гэтым расказвала смешныя гісторыі. Худа-бедна, але жыў Архіп і не скардзіўся.

Наведваўся і ўчастковы доктар. Менавіта ён прапанаваў Архіпу падлячыцца ў недалёкім шпіталі для ветэранаў вайны. Пазней былы франтавік успамінаў гэтую прапанову як помсту за нейкія ягоныя грахі, як праклён.

Зрэшты, спачатку ўсё было добра. Новая абстаноўка, абход урачоў, увага сястрычак, гутаркі-ўспаміны з суседзямі па палаце, такімі ж ветэранамі, пра далёкія, але незабыўныя ваенныя дні. Зрэдку званіў Аксане, непакоіўся пра козачку і куранят. Іх захаваў як памяць пра Ганначку. Усмешлівая дзяўчына супакойвала, але ён і сам ведаў, што там усё добра.

Так было на першы, а затым і на другі год. Збіраючыся ў шпіталь трэці раз, ён не думаў, што больш не вернецца да сваіх куранят і козачкі. Ён не ведаў, што на яго ўжо пакладзена вока.

Бойкая медсястра Прося з фізіятэрапіі даведалася, што стары адзін на белым свеце, а як заслужаны ветэран вайны і працы атрымлівае вялікую пенсію, задумалася.

Прося, так яе звалі, была сімпатычная саракагадовая жанчына. Мела амаль дарослага сына і не мела мужа. Была не супраць гульнуць, прыгалубіць гарачага мужчыну. Само сабой, нядрэнна паесці і добра апрануцца. Зноў-такі, выпіць дарагога віна.

Але на ўсё гэта медсястрынскай зарплаты і мацярынскай пенсіі не хапала. А тут Архіп! Прося на кожным кроку падкрэслівала гарачае жаданне клапаціцца пра старэйшае пакаленне ў цэлым і пра Архіпа ў прыватнасці. Трэба толькі выпісацца з таго гарадка, афарміць пенсію на яе, Просіна, імя, і — жыві не хачу.

Стары клюнуў на будучыя даброты. Ён з разуменнем паставіўся да зацяжкі з купляй будучай хаткі, пакорна глытаў нясоленую аўсянку. Але праз паўгода адчуў няладнае, натужна ўслухоўваючыся ў амаль штодзённыя гучныя гулянкі за сценкай. Аднойчы рашуча сказаў Просі: досыць тваіх даброт, вяртай мяне да Аксаны. І атрымаў адчувальны ўдар. Домік яго спрытнюга прадала. А Аксана? Аксана выйшла замуж, і ўсе яе інтарэсы замкнуліся на сваёй сям'і. Новая апякунка купіла Архіпу касцюм, навесіла на пінжак ордэны і медалі, запрасіла на сустрэчу з ветэранам карэспандэнта мясцовай газеты, рэгулярна адпраўляла старога ў шпіталь. Але ў асноўным жыццё яго праходзіла ў «жалезным» пакойчыку.

Ён хацеў на свежае паветра. Прося казала, што ёй няма калі. Ён прасіў што-небудзь істотнае на абед. Прося адказвала, што ў яго ўзросце трэба засцерагацца ад спакус. Ён пытаўся пра хатку, Прося ўздыхала: няма пакуль грошай, хоць атрымлівала яго пенсію і авалодала яго грашыма на кніжцы. Тлумачыла: вучыць сына ў платнай ВНУ і купляе дарагія лекі для маці.

Днямі ляжаў Архіп на жалезным ложку і думаў горкую думу пра неспадзяванкі свайго лёсу. Цемра ахутвала яго: падманула яго Прося.

Неяк адбываў стары чарговы тэрмін у шпіталі. Сусед па палаце трапіўся маўклівы, гаварыў толькі па справе. Нечакана адчуў да яго Архіп давер, расказаў усё. Не змоўчыў і пра тое, у якую пастку трапіў, дзякуючы мілай сястрычцы.

Доўга маўчаў сусед. Затым пракрычаў у Архіпава вуха: «Ідзі ў інтэрнат для састарэлых. Там будзеш спакойна дажываць».

Так убачыў стары перад сабой мэту. Па-ранейшаму лежачы на жалезным ложку, ён думаў пра будучыню. Пра асобны пакой з прыемным суседам. Пра ежу на заказ. Пра ўважлівых сястрычак і прагулку з імі па садзе. Архіп чамусьці не ўяўляў сваё будучае жытло без вялікага і прыгожага саду. Дарма што бачыў яго ў думках і ў думках жа чуў шоргат і шапаценне лісця пад нагамі. Але як трапіць у такі дом?

Прося добраахвотна туды яго не адправіць. Наадварот, зробіць усё, каб... Аж да... Халодны пот выступіў на лбе Архіпа, калі думка давяла яго да «аж». Аднак ён тут жа прагнаў яе. Просі патрэбны яго грошы...

Тады як жа? Лёс, здавалася, усміхнуўся яму. Неяк Прося зайшла ў пакойчык, прысела на ложак, пяшчотна патрапала сівую чупрыну. «Еду, дзядунь, на вучобу. Не палохайся. Усяго на тры дні. Суседка цябе і маці пакорміць. Не сумуй».

Напярэдадні ад'езду Просі Архіп не заснуў ні хвіліны. Да раніцы ён ужо ведаў, што рабіць. А дзясятай гадзіне суседка прынясе ненавісную аўсянку, і некалькі гадзін ён будзе ў адзіноце. Ён апранецца і асцярожна адчыніць дзверы. Старая ў гэты час спіць. А калі і не спіць, усё роўна не перашкодзіць.

На вуліцы ён папросіць першага сустрэчнага праводзіць яго да таксі. Таксі адвязе яго ў інтэрнат для састарэлых. А ў доме-інтэрнаце... Архіп не сумняваўся: зразумеюць і дапамогуць.

...Падняўшы з падлогі клятчастую кашулю, стары апрануў яе і пінжак, акуратна зашпіліў гузікі. Хоць рукі, па зразумелай прычыне, крыху дрыжэлі. Яшчэ б. У яго напярэдзе ледзь не ваенная аперацыя. На сёння — галоўная ў жыцці.

...Дом сваім рагом быццам упіраўся ў праезную частку вуліцы. І нават прымушаў яе крыху выгнуцца. Машыны, пад'язджаючы да гэтага рага, замаруджвалі ход. Вадзіцелі ведалі: за ім дзіцячы сад. Ды ці мала хто акажацца на праездзе...

Гэты ж нёсся бы на пажар. Згорбленага старога з кіёчкам на праезнай частцы ён заўважыў надта позна...

Архіп ляжаў на баку, так і не выпусціўшы з рук кіёк, нібы знарок акуратна падцягнуўшы ногі. Тонкі струменьчык крыві сцякаў з кутка рота. У нейкім метры ззяў медаль «За адвагу», які саскочыў з планкі.

## Салодкая трава — стэвія

**У Еўропе ўпершыню пра стэвію згадваюць у канцы XIX стагоддзя, хоць яе ўжывалі яшчэ ў старажытнасці.**

**Стэвія — шматгадовая расліна з вельмі салодкімі ядомымі лістамі, у якіх змяшчаецца стэвіязід — самае салодкае рэчыва прыроднага паходжання, яно ў сто разоў саладзейшае за цукар. Калі вам цукар супрацьпаказаны, то два лісцікі стэвіі будзе дастаткова на шклянку гарбаты ці кавы. Расліна з'яўляецца нізкакаларыйным заменнікам цукру для дыябетыкаў. Яшчэ стэвія валодае кардыятанізуючым эфектам, спрыяе нармалізацыі работы страўніка, стрымлівае рост і размнажэнне хваробатворных мікробаў у арганізме.**

**Стэвію вырошчваюць у вазоне на акне. Расліна дае насенне, але малы працэнт з яго прарастае, таму пры культываванні значна больш эфектыўным з'яўляецца вегетатыўны метад. Бяруць чаранок і ўкараняюць пад шклом аба пластыкавай бутэлькай, час ад часу прыадчыняючы. Калі стэвія пачне расці, «укрыццё» здымаюць. Вясной і летам яе можна вырошчваць на агародзе, перасадзіўшы з вазона.**

**Кветкі стэвіі маленькія, а сама расліна — цудоўны кансервант для кампотаў і сокаў, прычым можна выкарыстоўваць як сырыя, так і сухія лісцікі. Засушаныя лісцікі зручна захоўваць. Калі ўвосень вам няма часу ці не захочацца выкопваць стэвію, вазьміце ад кусціка чаранок і зноў пасадзіце ў вазон на акне — стэвія хутка расце, і ў вас будзе новая салодкая траўка.**

# Крынічка

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Рубрыку вядзе Валянціна ШПІЛЕЎСКАЯ, тэл. 285 88 81 № 42 (421)

## Расліны для спальні

Як сцвярджаюць спецыялісты, расліны здольныя не толькі ўпрыгожваць жыллё, але і абараніць нас ад шкоднага ўздзеяння навакольнага асяроддзя.

Калі вы хочаце максімальна выкарыстаць добрыя ўласцівасці сваіх зялёных гадаванцаў, трэба даведацца пра іх уласцівасці, у чым іх карысць, а затым правільна расставіць іх у кватэры. Сёння мы падбярэм кветкі для спальні.

**Герань.** Расліна выдзяляе біялагічна актыўныя рэчывы, якія забіваюць стафілакокаў і стрэптакокаў. Рэкамендуецца трымаць герань у спальні: удыхаючы карысныя злучэнні, якія яна выпрацоўвае, чалавек супакойваецца, што вельмі спрыяльна пры стрэсах і бяссонніцы.

**Альвас** таксама дарэчы трымаць у спальні. Гэтая расліна ўначы выдзяляе кісларод і паглынае вуглякіслы газ. Да таго ж алоэ не любіць чужых вачэй, таму яго лепш паставіць не навідавоку. Лічыцца таксама, што расліна здымае наэлектрызаванасць у памяшканні і абараняе яго жыхароў ад няшчасных выпадкаў. Акрамя ўсяго, алоэ — сапраўдная аптэка ў хаце. Яго прамытыя лісты можна прыкласці да інфіцыяванай раны, якая крывавіць, а сок алоэ дапамагае пры прастудзе і галаўным болі.

**Фіялкі.** Іх уздзеянне на эмацыянальны стан чалавека залежыць ад колеру. Так, у спальні карысна паставіць белыя і фіялетавыя фіялкі. Белыя кветкі, прыглушаючы моцныя пачуцці (як негатыўныя, так і пазітыўныя), прадухіляюць нервовыя зрывы і змяншаюць псіхалагічную нагрузку. Фіялетавая фіялка ачышчае атмасферу ад энергіі неразумення і непрыняцця, садзейнічае духоўнаму адзінству жыхароў дома. Чырвоныя і ружовыя кветкі ўнушаюць чалавеку пачуццё задаволенасці і, дарэчы, змяншаюць патрэбу ў ежы.

**Камелія** цвіце ў самыя халодныя месяцы года (з лістапада па май) і, безумоўна, упрыгожыць вашу спальню. Акрамя таго, яе кветкі пазбаўленыя паху і не патрывожаць сон. Чырвоная камелія акажа «псіхалагічную» дапамогу тым, у каго ёсць сэксуальныя праблемы.

Такая расліна, як **драцэна**, на думку спецыялістаў, дае жыццёвыя сілы, выпраменьвае станоўчую энергію і клапоціцца аб прыемным мікраклімаце ў доме. Падыходзіць як для спальні, так і для любога іншага пакоя.

**Хларафітум.** Гэта чэмпіён сярод хатніх кветак па ачышчэнні паветра ад шкодных мікраарганізмаў. У прыватнасці, ён актыўна паглынае фармальдэгід, які выдзяляецца цеплаізаляцыйнай з'інтэтычных матэрыялаў.

## Лайдачыць хенамелес

**«Вельмі хочацца пакаштаваць варэння з хенамелесу, ды і іншай смакаты, якую можа прыгатаваць з гэтых ягад, але не завязваюцца плады. Што рабіць?»**

**Наталля ШЧЭРБА,** *г. Валожын.*

— Хенамелес — гэта расліна, якая перакрыжавана апыляецца, таму, каб атрымаць плады, неабходна мець у садзе як мінімум два кусты розных гатункаў гэтай культуры, — гаворыць загадчык аддзела перапрацоўкі садовых культур НДІ пладаводства Марыя Максіменка. — Гэтую расліну трэба высаджваць на сонечных месцах, ахаваных ад ветру. Да глебы яна непатрабавальная, але ўсё ж больш любіць урадлівую, багатую на гумус. У перыяд засухі патрэбны ўмераны паліў. У суровыя зімы галінкі, якія размешчаны вышэй за ўзровень снегу, могуць падмерзнуць.

Трэба ведаць, што асноўнае плоданашэнне ў хенамелесу сканцэнтравана на трохгадовых галінах. Трэба правільна фарміраваць куст — гэта павысіць і ураджайнасць, і якасць пладоў. У многіх формаў хенамелесу галінкі самі растуць прыгожа і правільна, а, значыць, няма неабходнасці ўкарочваць парасткі. Але калі ў кроне куста ёсць «пустоты», то ў пачатку лета прыросты трэба ўкараціць, пакідаючы на кожным па 4—6 лістоў. Парасткі, якія выраслі на такіх галінах, на наступны год вясной таксама ўкарочваюць на 2—3 пупышкі. Добра сфарміраваны куст павінен мець 10—15 шкілетных галін рознага ўзросту: 3—5 — аднагадовых; 3—4 — двухгадовых; 3—4 — трохгадовых; па 2—3 чатырохгадовых і пяцігадовых. Апошнія (пасля плоданашэння) выразаюць увосень або вясной да распускання пупышак.

Пры абрэзцы выдаляюць галінкі, якія ляжаць на зямлі, і тыя, што растуць вертыкальна, пакідаючы тыя, якія на адлегласці 15—40 см ад зямлі прымаюць гарызантальнае становішча. Зімой яны апынуцца пад снегам і не падмерзнуць. Паколькі для хенамелесу не вельмі страшныя ні хваробы, ні шкоднікі, можна атрымліваць ураджай, не прымяняючы хімічныя сродкі аховы.

## У снежні хоць холадна, ды не голадна

**ВОСЬ яшчэ мінуў год. Быў ён, як усе звычайныя. У пачатку лета мы чакалі, калі мы пакаштуем першага зяленіва, па якім засумавалі пасля зімы. А потым ужо было як з рога — ўсяго многа. На стале былі і радыска, і цыбуля, потым гурочкі, часнок, нядоўга чакалі і памідораў, перцаў. І ўсё гэта дзякуючы вашай стараннай працы. Спадабалася? Ну вядома ж. Пару месяцаў перадыхну. Снежань — самы лепшы час, каб завесці дачны дзённік, дзе можна весці назіранні па ўсіх агародных работах: гатункі, культуры, ураджай, вапнаванні, угнаенні, севазварот, надвор'е (даты першых і апошніх замаразкаў, калі выпаў снег, таўшчыня снежнага покрыва). Пакуль яшчэ ўсё свежае ў вашай памяці — прывядзіце ў парадак свае запісы.**

Прааналізуйце вынікі мінулага дачнага сезона, каб вырашыць, якія культуры пакінуць на наступны сезон, а ад якіх варта адмовіцца. Насенне якіх культур у вас засталося, а што трэба прыкупіць. Абавязкова пазначце тыя градкі, на якія з восені ўнеслі ўгнаенне. Прадумайце і складзіце севазварот на наступны год. У снежні набывайце ахоўныя сродкі ад шкоднікаў і хвароб, патрэбныя ўгнаенні. Спецыялісты падлічылі, што на ўчастак з шасці сотак патрэбна: нітрафоскі — 2 кг, сульфату калію — 1 кг, суперфасфату ці нітраамафоскі — 2 кг, кальцыевай салетры — 0,5 кг, сернакіслага магнію — 0,5 кг, меднага, жалезнага купарвасу — па 0,5 кг, драўніннага попелу — 10 кг.

У снежні, у гэты зімовы месяц, можа выпасці снег, які трэба зграбаць з дарожак, пляцовак на прыстольных кругі дрэў. Толькі не пасыпайце дарожкі соллю, бо калі снег растане, яна трапіць у глебу і можа прывесці да пашкоджання газона і нават гібелі дрэў і кустоў.

Каб разбурыць хады грызуноў і прадухіліць іх доступ да раслін, абтоптвайце снег вакол ствалоў. Пакуль не ўдарылі маразы, нарыхтуйце аднагадовыя галінкі, каб мець чаранкі для веснавой прышчэпкі.

У падвалах і сховішчах праверце, у якім стане бульба і агародніна, што з саленнямі. Пры дрэнным абмене паветра магчыма ўтварэнне кандэнсата, г. зн. сцены сховішча «пацеюць». У гэтым выпадку агародніну трэба прыкрыць саломай або піла-віннем, каб на іх не трапіла вільгаць. Для таго, каб было менш вільгаці ў падвале або сховішчы, адкрывайце дзверы і адтуліны адначасова. Можна паставіць у склеп скрынку з нягашанай вапнай, соллю, драўнінным попелам, якія ўбіраюць вільгаць.

Пасейце ў ёмістасці з лёгкім грунтам кроп, крэс-салату, пасадзіце цыбулю. Ёмістасці змясціце ў цёплае светлае памяшканне, палівайце вадой пакаёвай тэмпературы, якая адстаялася. І праз месяц вы зможаце пакаштаваць свежага зяленіва.

Правядзіце старанную рэвізію закладзеных на зімовае захоўванне клубнецыбулін гладыёлусаў, мантбрэцый, клубняў вярбіны і бягоніі. Выкіньце тыя, што загнілі ці засохлі. Каб пасадачны матэрыял не плесневеў, рэгулярна праветрывайце сховішча, падтрымліваючы неабходную тэмпературу. Праверце, як адчуваюць сябе ў падвале гаршковыя культуры: садовыя гартэнзіі, фуксіі, хрызантэмы. Не забывайцеся зрэдку ўвільгатняць зямлю ў гаршчочках і кадках.

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА С ПРИМЕНЕНИЕМ МЕТОДА ПОНИЖЕНИЯ НАЧАЛЬНОЙ ЦЕНЫ

**Повторный аукцион по продаже объектов коммунальной собственности г. Минска с применением метода понижения начальной цены (далее – аукцион) состоится 15 декабря 2011 г. в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.**

**Организатор аукциона: Минский городской территориальный фонд государственного имущества, г. Минск, пр. Независимости, 8, каб. 227, конт. тел. (8017) 200 20 89.**

**На аукцион выставляются:**

| № лота | лот № 1 | лот № 2 |
|---|---|---|
| **Полные и сокращенные наименования объектов коммунальной собственности, место нахождения** | Не завершенное строительством здание и сооружение блока доочистки «Минская станция аэрации, 3-я очередь» объекта «Канализационные очистные сооружения (расширение)» 1-я очередь, г. Минск, ул. Инженерная, 3, промузел «Шабаны» | Не завершенный строительством объект «Автоцентр скорой и неотложной медпомощи на 500 автомашин по ул. П. Бровки в г. Минске», г. Минск, ул. П. Бровки, 38А |
| **Наименования единых предметов аукциона** | Не завершенное строительством здание и сооружение блока доочистки «Минская станция аэрации, 3-я очередь» объекта «Канализационные очистные сооружения (расширение)» 1-я очередь и право заключения договора аренды земельного участка для его обслуживания | Не завершенный строительством объект «Автоцентр скорой и неотложной медпомощи на 500 автомашин по ул. П. Бровки в г. Минске» и право заключения договора аренды земельного участка для его обслуживания |
| **Начальные цены единых предметов аукциона, руб.** | 16 597 934 969 белорусских рублей (в том числе: недвижимое имущество – 16 079 614 375 белорусских рублей, право заключения договора аренды земельного участка – 518 320 594 белорусских рубля) | 10 859 283 257 белорусских рублей (в том числе: недвижимое имущество – 9 637 448 921 белорусский рубль, право заключения договора аренды земельного участка – 1 221 834 336 белорусских рублей) |
| **Минимальные цены единых предметов аукциона, руб.** | 3 734 243 594 белорусских рубля (в том числе: недвижимое имущество – 3 215 923 000 белорусских рублей, право заключения договора аренды земельного участка – 518 320 594 белорусских рубля) | 3 149 334 336 белорусских рублей (в том числе: недвижимое имущество – 1 927 500 000 белорусских рублей, право заключения договора аренды земельного участка – 1 221 834 336 белорусских рублей) |
| **Размер задатка (рублей), срок и порядок его внесения, реквизиты расчетного счета** | 2 700 000 000 белорусских рублей до подачи заявления на участие в аукционе вносятся на р/с 3642000000015 в ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, код 153001795, УНП 100048181 Минского городского территориального фонда государственного имущества, **назначение платежа – задаток для участия в аукционе** | |
| **Наименования продавцов** | Государственное производственное объединение «Коммунальное хозяйство Мингорисполкома», 220037, г. Минск, ул. Червякова, 25, тел.: (8017) 2332664, 2331059 (осмотр) | КУП «УКС Мингорисполкома», г. Минск, ул. Советская, д. 17, тел. (8017) 3285848 (осмотр) |
| **Характеристики объектов коммунальной собственности** | Начало строительства – 1988 г.; размеры в осях – 162,5м х 54м; отдельностоящее, одноэтажное здание, включающее в себя отделение барабанных сеток, отделение фильтров и галерею трубопроводов, служащих для подачи, распределения и отвода сточных вод на дополнительную доочистку; насосную станцию; административно-бытовой корпус; помещения трансформаторной подстанции; степень готовности объекта – 75% | В состав объекта входят: гараж-стоянка на 500 автомашин (здание представляет собой круглый восьмиэтажный объем диаметром 56 м и высотой этажа 3,3м), административно-бытовая и производственная пристройка (двухэтажное здание с размерами в плане 24х30 м, высота первого этажа – 4,2 м, второго – 3,3 м; работы по внутренней отделке, внутренним инженерным сетям, благоустройству и монтажу технологического оборудования не производились; степень готовности объекта – 50 % |
| **Информация о земельных участках** | Общая площадь – 2,5432 га; кадастровый номер земельного участка – 500000000002006709.<br>Арендодатель земельного участка – Минский городской исполнительный комитет; срок аренды – 5 лет.<br>Условия использования: для его дальнейшего использования в соответствии с утвержденной градостроительной документацией.<br>Победителю аукциона в установленном порядке получить разрешение на разработку (корректировку) проектно-сметной документации по завершению строительства объекта.<br>Беспрепятственный доступ к земельному участку победителю аукциона обеспечивает КУП «Минскводоканал» | Общая площадь – 1,3760 га с ограничениями в использовании земель – водоохранная зона водных объектов г. Минска, охранные зоны линий электропередач, трубопроводов и иных инженерных сооружений.<br>Арендодатель земельного участка – Минский городской исполнительный комитет; срок аренды – 5 лет.<br>Условия использования: в соответствии с регламентами генерального плана г. Минска – для дальнейшего использования под многофункциональный комплекс с многоярусной парковкой с объектами автосервиса легкового автотранспорта, под административные, торговые и иные функции, не противоречащие генеральному плану |
| **Условия использования объектов коммунальной собственности** | Освоение данной территории в соответствии с утвержденной градостроительной документацией | 1. Освоение данной территории в соответствии с утвержденной градостроительной документацией.<br>2. Возмещение налога на добавленную стоимость проектно-изыскательских, строительно-монтажных и прочих работ в бюджет г. Минска в течение 30 дней с момента подписания договора купли-продажи с уточнением в УП «УКС Мингорисполкома» суммы налога на добавленную стоимость на момент перечисления.<br>3. Возмещение в течение 30 дней с момента подписания акта приема-передачи в бюджет г. Минска стоимости затрат на дополнительные проектно-изыскательские, строительно-монтажные и прочие работы, понесенных УП «УКС Мингорисполкома» на дату подписания акта приема-передачи.<br>4. Возмещение 8 655 995 рублей – стоимости работ по изготовлению ведомости технических характеристик объекта на р/с 3012016353515, отделение № 535 г. Минск, ОАО «Белинвестбанк», УНП 807000028, ОКПО 37558116, код банка 153001739, адрес банка: 220033, г. Минск, пр. Партизанский, 6а, РУП «Минское городское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» |

**Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 8, каб. 227, по рабочим дням с 9.00 до 17.00. Заявления принимаются с 5 по 14 декабря 2011 года включительно.**

Извещение о проведении открытого аукциона с применением метода понижения начальной цены опубликовано в газетах «Звязда» 19.08.2011 № 157 (27021), 28.09.2011 № 185 (27049), 20.10.2011 № 200 (27064); «Вечерний Минск» 20.08.2011 № 95 (12398), 29.09.2011 № 112 (12415), 20.10.2011 № 121(12424).

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 дня до наступления даты его проведения.

Информация о затратах на организацию и проведение аукциона, в том числе расходах, связанных с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, а также расходах, связанных с формированием земельных участков и изменением земельных участков в результате такого формирования, государственной регистрацией в отношении этих участков (далее – затраты на организацию и проведение аукциона) доводится до сведения участников перед началом аукциона при заключительной регистрации.

В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником (далее – претендент на покупку), предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Минский горисполком в течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона по продаже предмета аукциона принимает решение о предоставлении земельного участка победителю аукциона (претенденту на покупку). Победитель аукциона (претендент на покупку) в течение 10 рабочих дней со дня принятия указанного решения обязан внести плату за право заключения договора аренды земельного участка и возместить затраты на организацию и проведение аукциона.

Победитель аукциона (претендент на покупку) в течение одного рабочего дня со дня оплаты должен представить копии платежных документов, названных выше, Организатору аукциона, после чего, не позднее 2 рабочих дней, с ним в установленном порядке в соответствии с условиями аукциона Продавцом заключается договор купли-продажи недвижимого имущества, а Минским горисполкомом – договор аренды земельного участка.

Оплата за недвижимое имущество производится в течение 30 календарных дней с момента подписания договора купли-продажи.

Рассрочка внесения платы за право заключения договора аренды земельного участка не предусмотрена.

Порядок и срок осмотра объектов установлен и производится Продавцами.

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Повторный открытый аукцион (далее – аукцион) по продаже объекта коммунальной собственности г. Минска состоится 14 декабря 2011 г. в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.**

**На аукцион выставляется:**

| | | |
|---|---|---|
| **1** | **Наименование и место нахождения предмета аукциона** | **Изолированное помещение, не относящееся к жилищному фонду, с инвентарным номером 500/D – 703573, г. Минск, пр. Машерова, д. 78, пом. 10Н** |
| **2** | **Сведения о предмете аукциона** | Изолированное помещение располагается в подвале 9-этажного жилого дома, год постройки – 1992; общая площадь – 59,3 кв.м; стены – железобетонные блоки, кирпичные; перегородки – гипсокартон; перекрытия – железобетонные плиты; проемы дверные, оконные – деревянные; полы – бетонные; имеются центральные: водопровод, канализация, теплоснабжение |
| **3** | **Начальная цена предмета аукциона (руб.)** | 21 542 000 |
| **4** | **Размер задатка (рублей), порядок и сроки его перечисления, реквизиты расчетного счета** | 2 154 000 белорусских рубля, до подачи заявления на участие в аукционе, путем внесения на р/с 3642000000015 в ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, код 153001795, УНП 100048181 Минского городского территориального фонда государственного имущества; назначение платежа – задаток для участия в аукционе |

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 дня до наступления даты его проведения.

Предмет аукциона продается с обременением помещения правом аренды сроком до 31.01.2013.

**Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 8, каб. 227, по рабочим дням с 9.00 до 17.00. Последний день приема заявлений – 12 декабря 2011 года.**

Извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 28.09.2011 № 185 (27049) и в газете «Вечерний Минск» от 29.09.2011 № 112 (12415).

Победителем аукциона по лоту признается участник, предложивший наиболее высокую цену. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет аукциона по решению комиссии продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Победитель аукциона в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона обязан возместить организатору аукциона затраты, связанные с организацией и проведением аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о затратах, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом аукциона при заключительной регистрации под роспись.

После предъявления организатору аукциона копии платежных документов о возмещении затрат, но не позднее 10 рабочих дней с даты проведения аукциона между продавцом и покупателем заключается договор купли-продажи.

# СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.




**Адказы на сканворд**

**Па гарызанталі:** Цьмярэч. Прыскі. Стрэл. Пара. Удол. Ясак. Тул. Тона. Рагу. Дан. Нона. Кружала. Рай. Неба. Адап. Рана. Барсук. Радар. Агарак. Тата. Адбіт. Тога. Мак. Знатак. Стак. Абаронак. Гонар. Арэнар. Ясенда. **Па вертыкалі:** Смутак. Кедзі. Ндуц. Кат. Адам. Фара. Армада. Сматак. Брак. Рыса. Лайка. Сната. Трук. Роват. Рот. Парад. Азон. Она. Нан. Пуд. Кара. Баро. Фут. Нагата. Танкер. Рот. Бакара. Сарказм. Кап. Кажамака.

## Усміхнемся

**На дачы елі шашлыкі, ну, зразумела, выпівалі, вырашылі пажартаваць — зарадзілі пастку для мышэй купюрай у дзесяць долараў. Цяпер у цешчы палец зламаны.**

☺

— Ну як там, унучачка, пажывае твой грэйпфрут?

— Бабуля! Колькі можна! Не грэйпфрут, а бойфрэнд! Бойфрэнд!

☺

**Расія — адзіная краіна ў свеце, якая пасля канца свету 21 снежня 2012 года плануе адзначаць яшчэ канец свету па старым стылі, 3 студзеня 2013 года.**

☺

— Адэлаіда Маркаўна, вы не супраць сёння павячэраць разам?

— З задавальненнем, Якаў Ільіч.

— Тады ў вас роўна ў сем.

☺

**Недапітая бутэлька падобная на вышэйшую адукацыю — калі-небудзь потым абавязкова спатрэбіцца.**

☺

— Дзяўчына, а вашай маме зяць не патрэбен?

— Не, яна яшчэ гэтага не дагрызла!

## Калейдаскоп

### У Вялікабрытаніі адзначаны бэбі-бум сярод саракагадовых

**За апошняе дзесяцігоддзе колькасць брытанскіх парадзіх ва ўзросце старэй за сорак гадоў выросла на 70 адсоткаў. Толькі летась нарадзіла каля 28 тысяч жанчын гэтай узроставай групы, у той час як у 2001 годзе такіх парадзіх было крыху больш за 16 тысяч. Пра гэта паведамляе газета Daily Mail, спасылаючыся на звесткі Каралеўскага каледжа акушэрства.**

Бэбі-бум сярод узроставых маці, узмацніў крызіс ва ўсіх падраздзяленнях родадапаможнай службы краіны, выкліканы і без таго значным ростам нараджальнасці ў Вялікабрытаніі. Жанчыны ва ўзросце пасля сарака гадоў часцей пакутуюць ад розных ускладненняў падчас цяжарнасці і родаў і, адпаведна, патрабуюць значна большай увагі да сябе. Па звестках Каралеўскага шпіталя, у брытанскіх радзільнях адчуваецца значны недахоп персанала, а нагрузка на той, што ёсць, надта высокая і працягвае расці. Узровень нараджальнасці ў Вялікабрытаніі цяпер самы высокі за апошнія сорак гадоў, а з 2001 года вырас на 22 адсоткі.

## Саліст гурта «Серабро»:

# «МЫ РОБІМ ТОЕ, ЧАГО НЕ ХАПАЕ ГЛЕДАЧАМ...»

### Сярабкіна і Цемнікава расказалі пра дзявочую канкурэнцыю ў шоу-бізнесе і працытывалі Багдановіча



**Кліп «Мама Люба», зняты дзяўчатамі на дарожны відэарэгістратар усяго за 60 расійскіх рублёў, у інтэрнэце паглядзела ўжо больш за дзевяць мільёнаў чалавек.**

Самі дзяўчаты прызнаюцца, што проста павесяліліся. Маўляў, ехалі аднойчы ў басейн і ўключылі камеру...

— Гэта наша хоўм-відэа, — гаворыць салістка гурта Алена Цемнікава. — Спачатку мы нават і не думалі дзяліцца ім з усімі. Але кліп атрымаўся ўдалы і адначасова рэалістычны. Да таго ж людзі заўжды любілі падглядваць адно за адным, таму, відаць, і праглядаў у інтэрнэце так шмат.

— Проста ў нас ёсць пачуццё гумару, — даводзіць салістка Воля Сярабкіна. — На тым відэа мы такія, як у жыцці. Напэўна ж, вы таксама весяліцеся ў машыне...

### «Нараджаць дзяцей Фадзееў не забараняе»

На прэс-канферэнцыю «Серабро» прыйшлі ўдзвюх: трэцяя салістка Насця інтэрв'ю, як высветлілася, не любіць. Адказваючы на пытанні журналістаў, дзяўчаты распавялі, чаму адмовіліся ад выступлення на канцэрце Брытні Спірс у Маскве, як яны ставяцца да канкурэнцыі і ці забараняе ім Макс Фадзееў зацяжарваць.

Цемнікава і Сярабкіна пазнаёміліся яшчэ да стварэння дзявочага трыа. На прэс-канферэнцыі яны ўзгадалі, як заказавалі самую танную страву ў кругласутачнай кавярні і спалі па чарзе — тады ў іх не было грошай на таксі. І, каб не ісці дадому пешшу, яны вымушаны былі чакаць усю ноч у кавярні.

Сёння, мяркуючы па ўсім, усё змянілася.

— Мы вельмі любім гастролі ў цёплых краінах, дзе ёсць сонца, мора і пясок, — прызнаюцца дзяўчаты. — У нас вельмі дружны калектыў, цудоўныя музыканты і дырэктар. Мы нават адпачываць хочам ляцець разам. Уяўляеце, мы не надакучылі адна адной за пяць гадоў! (*усміхаецца*. — **Аўт.**).

Дзяўчаты сцвярджаюць, што ніякай канкурэнцыі паміж імі няма і што ўвогуле іх калектыў — адзін з найбольш дружных у расійскім шоу-бізнэсе.

— Я зразумела гэта, калі трапіла аднойчы ў адну грымёрку з гуртом «Бліскучыя», — гаворыць Цемнікава. — Бедныя дзяўчаты. Гледзячы на іх, я зразумела, наколькі мы шчаслівыя: у нас кожная з салістак любімая.

Узгадваючы кантракт з прадзюсарам, дзяўчаты радуюцца, што ўмовы там даволі ліберальныя:

— У нас няма абмежавання ў харчаванні. Дзякуй вялікі Максіму Фадзееву, які не прымушае нас важыць 45 кг, — смяецца Алена Цемнікава. — Ды і наконт дзяцей — прадзюсар Фадзееў ніякім чынам не забараняе нам сысці ў дэкрэт. І з эфіру мы на гэты час не знікнем, цяпер з гэтым усё прадумана. Але дзеці павінны быць запланаванымі. Абортаў рабіць не хацелася б. А маладосць яна таксама адна, таму як Бог дасць.

### «...заміж персідскага ўзору»

Пра Беларусь Воля і Алена ведаюць шмат. Таму стандартных сказаў пра «чыстыя вуліцы» дзяўчаты не гаварылі. Здзівілі іншым. Працытавалі Багдановіча.

— «...і тчэ, забыўшыся, рука заміж персідскага ўзору цвяток радзімы васілька». У нашай кампаніі працуе дзяўчына родам з Беларусі. Яна вельмі шмат расказвае пра Беларусь і пра Мінск. Мы ўжо ведаем усе стравы з бульбы (*смяюцца*. — **Аўт.**). З аднаго боку, у нас з вамі ўсё вельмі падобна, аднолькавае, улічваючы гісторыю і г.д. Але з іншага боку, у вас ёсць нейкія асаблівасці.

— Беларускія дзяўчаты вельмі прыгожыя, ёсць нейкая разыначка, — заключае Вольга Сярабкіна. — А яшчэ я хацела сказаць: «Я — Вольга з гурта «Срэбра», — па-беларуску прамаўляе Сярабкіна.

У сацыяльных сетках дзяўчаты не жывуць, лічачы гэта пустой тратай часу. Затое чытаюць кнігі.

— Я зразумела, што ў маёй галаве няма, напэўна, стольких геніяльных думак, каб «посціць» (рабіць запісы ў твітары. — **Аўт.**) гэта ўсё. І пісаць нешта кшталту: «Я сёння ўстала і паснедала. Я такая класная». Гэта камічна.

**Здымі пародыю на кліп «Мама Люба» і выйграй 5 тысяч долараў.**
**— Кіраўніцтва нашай групы аб'явіла конкурс на лепшую пародыю на «Маму Любу», — гаворыць Алена Цемнікава. — Прыз у 5 тысяч долараў атрымае самы класны, шчыры і вясёлы кліп. Праўда, яшчэ не ведаю, як будзем выбіраць: іх усю прыйшло вельмі шмат. Дэдлайн — 15 снежня.**

— Мне на сацыяльныя сеткі шкада часу, — пазяхае Цемнікава. — Таму мяне і не было там ніколі. І ўвогуле — у вольны час лепш паспаць. Мы спім усюды: у самалётах, машынах, і зараз вось: Воля адказвае на пытанні, я хуценька паспала (*смяецца*. — **Аўт.**).

Сярод апошніх прачытаных кніг Цемнікава называе «Паляўнічых на мікробы», а Сярабкіна — «Дапамажы сабе сам». Дзяўчаты прызналіся, што цікавяцца псіхалогіяй і здароўем. На пытанне пра выступленне на канцэрце Брытні Спірс, якое не адбылося, артысткі адказалі:

— Мы не бачылі Брытні, але яе менеджары запрашалі нас выступіць «на разагрэве» на яе маскоўскім канцэрце. Якраз у гэты час у нас быў запланаваны канцэрт у Каралёве на Дні горада. Мы не маглі падвесці людзей, таму паехалі ў Каралёў.

— Мы ніколі не будзем рабіць тое, чаго не хочуць бачыць людзі. Мы працуем для людзей і робім тое, што яны патрабуюць. А попыт, як вядома, прапанову і нараджае, — заключае Цемнікава.

**Ілья ЛАПАТО.**
**Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.**

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 9.04 | 16.52 | 7.48 |
| Віцебск — | 9.00 | 16.35 | 7.35 |
| Магілёў — | 8.54 | 16.42 | 7.48 |
| Гомель — | 8.43 | 16.47 | 8.04 |
| Гродна — | 9.18 | 17.09 | 7.51 |
| Брэст — | 9.11 | 17.17 | 8.06 |

### Месяц

***Першая квадра 2 снежня. Месяц у сузор'і Рыбаў.***

### Імяніны

***Пр.*** *Мікалая, Платона, Рамана.*
***К.*** *Наталлі, Эдмунда, Элігіума.*

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

## НАДВОР'Е на заўтра




## Дзве даты

## 1 снежня

***Сусветны дзень барацьбы са СНІДам. Абвешчаны Сусветнай арганізацыяй аховы здароўя ў 1988 г. Адзначаецца пры падтрымцы Генеральнай Асамблеі ААН.***

**1939 год** — нарадзіўся (пасёлак Стайкі Аршанскага раёна) Уладзімір Платонаў, беларускі вучоны-матэматык. Член-карэспандэнт, акадэмік НАН Беларусі (1972), АН СССР (1987), Расійскай АН (1991), прафесар, доктар фізіка-матэматычных навук. Заслужаны дзеяч навукі Беларусі. У 1963-71 гадах працаваў у Белдзяржуніверсітэце. З 1971-га — загадчык лабараторыі Інстытута матэматыкі АН Беларусі, у 1977-92 гадах — дырэктар гэтага інстытута. У 1987-92-м — прэзідэнт АН Беларусі, затым — галоўны навуковы супрацоўнік Інстытута матэматыкі АН Беларусі. Аўтар больш чым 150 навуковых прац. Даследаванні па алгебры, алгебраічнай геаметрыі, лінейных групах і тапалагічнай алгебры. Лаўрэат Ленінскай прэміі.

**1922 год** — нарадзіўся легендарны савецкі футбаліст і хакеіст Усевалад Баброў. Нарадзіўся, напэўна, у кашулі: у 1950 годзе Баброў «загуляў» і не быў у ліку пасажыраў самалёта, у якім разбілася ўся хакейная каманда ВПС. Ён сябраваў з сынам «бацькі народаў» Васілём Сталіным, быў у добрых адносінах з ваенным міністрам Булганіным, з кіраўніком урада Касыгіным. Ведаў сабе цану, не трываў фамільярнасці і неяк заехаў па фізіяноміі дэпутату Вярхоўнага Савета СССР, які асмеліўся назваць яго мянушкай «Бабёр». Шэсць гадоў (з 1947-га па 53-ці) Баброў сумяшчаў свае выступленні ў футболе з хакеем. Ён быў адзіным у гісторыі спорту ўдзельнікам Алімпійскіх гульняў у якасці капітана і футбольнай (у 1952-м), і хакейнай (у 1956-м) камандаў. Але шматлікія траўмы прымусілі яго зрабіць канчатковы выбар на карысць хакея з шайбай. Параўноўваючы гэтыя два віды спорту, ён казаў: «У хакеі трэба больш бегаць, і забіваюць там часта, у футболе ж трэба шмат думаць». Ініцыятар правядзення сустрэч паміж савецкімі хакеістамі і амерыканскімі прафесіяналамі. Кіраваў зборнай СССР падчас першай серыі такіх сустрэч у 1972 годзе.

## Цытата дня:

***«Выжываць — гэта любой цаною, а жыць — гэта ўсё-такі меньш ці больш сумленна».***

**Янка Брыль (1917—2006), народны пісьменнік Беларусі.**

# «Наары АГ» — новы «твар» на фармацэўтычным рынку Беларусі

**У канцы лістапада ў канферэнц-зале гатэля «Краўн Плаза» адбылася прэс-канферэнцыя з нагоды выхаду на беларускі рынак новай фармацэўтычнай кампаніі «Наары АГ» (Швейцарыя).**

Прэзентуючы беларускім журналістам сваю кампанію, яе дырэктар па працы з краінамі СНД сп. Манфрэд Паўль даў лаканічны, але глыбокі аналіз сучаснага стану сусветнага фармацэўтычнага рынку. Сёння ён вельмі дынамічны, аператыўна рэагуе на запыты практычнай медыцыны ў кожнай канкрэтнай дзяржаве, пры гэтым імкнецца падтрымліваць аптымальную прапорцыю паміж брэндамі і джэнерыкамі, г. зн. найноўшымі, дарагімі і навукаёмістымі арыгінальнымі прэпаратамі і іх якаснымі, але больш эканамічнымі «копіямі».

Гэтыя тэндэнцыі развіцця фармацэўтычнага бізнэсу робяць цалкам заканамерным з'яўленне фірмы «Наары АГ» на нашым лекавым рынку менавіта ў той перыяд, калі з яго сыходзяць многія вядомыя вытворцы, часткова перажываючы ўласныя эканамічныя цяжкасці, часткова выціснутыя айчыннай фарміндустрыяй, якая ўжо больш за 10 гадоў рэалізуе нацыянальную праграму імпартазамяшчэння.

«Наша кампанія маладая, ёй усяго 4 гады. Аднак у нас — далёкасяжныя планы і вялікі патэнцыял, што пацвярджае склад кіруючай каманды «Наары АГ», — кажа сп. М. Паўль. — У яе ўваходзяць сусветна вядомыя вучоныя і спецыялісты фармацэўтычнай вытворчасці, у якіх у мінулым багаты вопыт працы ў вядучых фармацэўтычных кампаніях, такіх як Bayer Schering Pharma, Wulfing Pharma, Teva Pharmaceuticals, Polpharma і іншыя. «Наары» распрацоўвае і выпрабляе рэцэптурныя, у тым ліку гарманальныя, прэпараты, а таксама безрэцэптурныя, уключаючы прэпараты расліннага паходжання. У нас ужо маецца шырокі асартымент лекавых сродкаў — арыгінальных і джэнерыкаў — для лячэння жаночых хвароб. Менавіта ў гэтым сектары сучаснай фармацэўтыкі мы гатовыя прапанаваць вашай краіне поўны пакет сродкаў для жаночага здароўя, прычым па даступных цэнах».

Прэпарат лікарэд вытворчасці «Наары АГ» ужо з поспехам прымяняецца ў Беларусі для лячэння жаночага і мужчынскага ідыяпатычнага бясплоддзя. Можна ўпэўнена сказаць, што ўрачы і пацыенты з нецярплівасцю чакаюць з'яўлення ў аптэках іншых, не менш важных лекавых сродкаў, — для лячэння эндаметрыёзу, планавання цяжарнасці, а таксама сучасных тэст-сістэм для вызначэння авуляцыі і зачацця.

**Вольга СВЕРКУНОВА.**

# МІНСКАЙ ГАРАДСКОЙ БІБЛІЯТЭЦЫ №1 ІМЯ Л.М.ТАЛСТОГА 100 ГАДОЎ

## На кніжных паліцах гісторыі

Загадчыца бібліятэкі Таццяна Маткоўская ў сваёй стыхіі.

**«Як прайсці да гэтай бібліятэкі?» На такое хрэстаматыйнае пытанне сёння пачуеце мноства парадаў. Метро, тралейбус, аўтобус — усе маюць свае прыпынкі побач з бібліятэкай №1 імя Л.М.Талстога. А вось сто гадоў таму праз тагачасны Мінск сюды па брукаваных вуліцах вёз возніца. Чытачы прастага паходжання дабіраліся пешшу — арыенцірам для іх з'яўляўся вакзал. Паблізу ад яго ў раёне сённяшняй вуліцы Мяснікова ў 1911 годзе ўпершыню адчыніла свае дзверы гэтая самая бібліятэка.**

Арганізавалі яе дзякуючы намаганням мінскіх грамадскіх дзеячаў. Тады у трох невялікіх пакойчыках пасяліліся кнігі, якія прывезла ўдава Льва Талстога Софья Андрэеўна, разам з імі былі выданні, перададзеныя бібліятэкай імя А.С. Пушкіна, каля сотні тамоў падарылі самі чытачы. Пра выгляд той чытальнай залы ўспамінаў не засталося, але наведнікаў можна лёгка ўявіць: галоўнымі чытачамі былі менчукі маладога ўзросту: студэнты, рабочыя. Адзін з архіўных дакументаў 1912 года паведамляе, што вельмі актыўнымі наведнікамі былі хатнія гаспадыні. Праз два гады пасля адкрыцця бібліятэкі ў інвентарным пераліку налічвалася 650 назваў кніг. У фондзе перыёдыкі былі выданні на беларускай, рускай, літоўскай, польскай, украінскай мовах, на ідзішы і ўрыце.

Пра ўсё гэта мы размаўлялі з **вядучым бібліятэкарам мінскай гарадской бібліятэкі №1 імя Л.М. Талстога Галінай ЛАГУНОВІЧ.** Вельмі цікава было слухаць гэтую кампетэнтную суразмоўцу: бібліятэка ўжо не адно дзесяцігоддзе вядомая як культурна-асветніцкі цэнтр, дзе чытачы сустракаюцца з вядомымі літаратарамі, навукоўцамі, крытыкамі, артыстамі, спартсменамі. На свае выставы сюды нярэдка запрашаюць вядомыя мастакі. Пералік нават самых важных мерапрыемстваў, праведзеных тут, заняў бы ў газеце вельмі шмат месца. Пра ўдзячнасць шырокага кола чытачоў сведчыць, напрыклад, тое, што ў камплектацыі фонду прымаюць удзел вядомыя беларускія пісьменнікі, выдавецтвы «Мастацкая літаратура», «Беларуская энцыклапедыя», «Беларусь», «Кавалер», мінскае таварыства рускай культуры «Русь», расійскае пасольства.

— Час прыспешвае нас, — кажа спадарыня Галіна. — Адпаведна новаму адукацыйнаму ўзроўню нашых чытачоў мы аўтаматызавалі ўсе тэхналагічныя працэсы, зрабілі выхад у інтэрнэт, вядзём агульны электронны каталог установы. Каб забяспечыць для наведнікаў магчымасць карыстацца афіцыяльнай прававой інфармацыяй, стварылі цэнтр гэтых дакументаў.

Ідзе размова пра творчасць Максіма Багдановіча.

Разам з гаспадыняй кніжных багаццяў аглядаем залы невялікага па сённяшніх мерках памяшкання, утульныя, адзначаныя непаўторнай цішынёй чытальні і пахам кніг. Такое месца, нібы храм, можна назваць «асвечаным» духоўным святлом ведаў, мудрай узвышанасцю літаратуры. Пераплёты старых кніг суседнічаюць з вокладкамі новых, экранамі камп'ютараў...

— У нашай чытацкай «сям'і», як і раней, шмат моладзі: побач з бібліятэкай — вучэбныя карпусы некалькіх буйных ВНУ, школы, — працягвае мая суразмоўца. — З асаблівай цеплынёй сустракаем тых, хто дзесяцігоддзямі з'яўляюцца нашымі чытачамі. Вось, напрыклад, пазнаёмцеся, Алег Іванавіч Галкін, — прадстаўляе мне сівога мужчыну каля кніжнай паліцы.

— Білет чытача я атрымаў тут у 1965 годзе, — заўважыў той. — Тады мне, маладому інжынеру, спецыяльныя выданні былі вельмі неабходныя. Не пакідаў па-за ўвагай і мастацкую літаратуру. З тых часоў я і жонка завём гэтыя залы не інакш, як «наша бібліятэка»!

У суседнюю залу зазірнулі праз напаўадчыненыя дзверы — не ўваходзілі, каб не перашкаджаць. Як сведчыла аб'ява на ўваходзе, перад вучнямі мінскага прафэхкаледжа выступаў дацэнт кафедры беларускай літаратуры і культуры Белдзяржуніверсітэта Анатоль Верабей. Тэма адпавядала літаратурнаму календару: 120 гадоў з дня нараджэння зоркі беларускай паэзіі Максіма Багдановіча. Добры падарунак падрыхтавала бібліятэка для маладых аматараў роднай мовы. Магчыма, хтосьці з гэтых маладзёнаў таксама надоўга застанецца ў спісах чытачоў.

Слова «бібліятэка» ў старажытнасці азначала «месца захоўвання кніг». Час унёс свае карэктывы ў гэты сэнс, дадаў у кніжную грамаду газеты і часопісы, прадстаўнікоў свету электронікі. Галоўнае ж, чым далучана бібліятэка да сучаснасці — яе місія не толькі захоўваць, але і даносіць, пашыраць веды. Відаць, таму многім з двух мільёнаў жыхароў Мінска добра вядомая бібліятэка, якой сто гадоў таму было дадзена імя Льва Талстога.




Пенсіянер Алег Галкін упершыню прыйшоў у гэтую бібліятэку больш за паўстагоддзя таму.

**Яўген ПЯСЕЦКІ.**
**Фота аўтара.**

## Ну і ну!

## АБРАБАВАЎ... КАМБАЙН

Нарадам Полацкага аддзела аховы сумесна з супрацоўнікамі крымінальнага вышуку Полацкага гарадскога аддзела ўнутраных спраў быў затрыманы мясцовы жыхар, які на полі ў Полацкім раёне ля вёскі Лесава з пакінутага без нагляду камбайна «Дон-1500» украў электраправодку агульным коштам 4,2 мільёна рублёў.

Камбайн належыць мясцоваму жыхару. Заведзена крымінальная справа.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І.БАРАНОЎСКІ, У.ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н.КАРПЕНКА, Л.ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С.РАСОЛЬКА, Л.РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л.СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, В. ПАЗНЯКОЎ.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год. Тыраж 33.380. Індэкс 63850. Зак. № 5733. Нумар падпісаны ў 19.30 30 лістапада 2011 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12